МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БРЭСЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭХНІЧНЫ УНІВЕРСІТЭТ»

**Кафедра сацыяльна-палітычных і гістарычных навук**

# ВЫВУЧЭННЕ ПРАБЛЕМ ЭКАНАМІЧНАЙ ГІСТОРЫІ Ў КУРСЕ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ":

**Рэкамендавана Саветам універсітэта ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў усіх спецыяльнасцей**

Брэст 2010

УДК 65.03 (4 бел) я73
ББК К56
К 56

**Рэцэнзенты:**
**Стралец М.В.** – прафесар кафедры “Сацыяльна-палітычных і гістарычных навук” БрДТУ, доктар гістарычных навук, прафесар
**Амельянюк А.М.** – загадчык кафедры “Эканамічная тэорыя” БрДТУ, кандыдат эканамічных навук, дацэнт
**Здановіч У.В.** – загадчык кафедры “Гісторыя Беларусі” УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна”, кандыдат гістарычных навук дацэнт

Складальнікі:
**Кавалёва Н.М.** – прафесар кафедры СПіГН БрДТУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (уступ, раздзелы 1, 2, 3)
**Малыхіна Л.Ю.** – дацэнт кафедры СПіГН БрДТУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (разделы 4, 5)

**Агульная рэдакцыя:**
**Кавалёва Н. М.** – прафесар кафедры СПіГН БрДТУ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Кавалёва Н.М., Малыхіна Л.Ю.
К 56 **Вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі ў курсе “Гісторыя Беларусі”**: вучэбна-метадычны дапаможнік / Агуль. рэд. Н.М. Кавалёва. – Брэст: УО “БрДТУ”, 2010. – 88 с.

ISBN 978-985-493-169-2

Выданне прапануецца для студэнтаў дзённай і завочнай формы навучання ўсіх спецыяльнасцей пры вывучэнні праблем эканомічнай гісторыі ў курсе “Гісторыя Беларусі”.

УДК 65.03 (4 бел) я73
ББК К56

ISBN 978-985-493-169-2

© Калектыў аўтараў, 2010
© УА“БрДТУ”, 2010

# УСТУП

Вывучэнне курса "Гісторыя Беларусі" мае на мэце фармаванне нацыянальнай самасвядомасці і патрыятызму ў грамадзян рэспублікі, што пачынаецца у тым ліку з усведамлення адметнасці шляхоў эканамічнага развіцця свайго народа сярод іншых этнічных супольнасцей.

Дадзены вучэбна-метадычны дапаможнік разлічаны на студэнтаў усіх спецыяльнасцей дзённай і завочнай форм навучання – ён дапаможа арганізаваць самастойнае вывучэнне асобных тэм курса і належным чынам падрыхтавацца да тэставага кантролю, залікаў альбо экзаменаў.

Дапаможнік складзены такім чынам, што ў ім выдзелены ўсе асноўныя палажэнні, якія трэба дакладна ведаць, дадзены тлумачэнні пэўных тэрмінаў і паняццяў, зроблены спасылкі на выкарыстаную літаратуру, каб студэнты атрымалі інфармацыю аб тым, да якіх падручнікаў, даведнікаў, ці манаграфій трэба звярнуцца з мэтаю атрымання больш поўнага ўяўлення аб падзеях і з'явах.

У якасці эфектыўнага інструментарыя аўтарамі прапануюцца: багаты тэрміналагічны і паняційны глассарый, спасылкі на дадатковую літаратуру па вызначаным праблемам, вынікі і заключэнні, якія ўключаюць аўтарскае бачанне ролі сацыяльна-палітычнага фактару ў трансфармацыі эканамічнага жыцця на тэрыторыі Беларусі, пачынаючы з першабытнай эпохі да сёняшняга пераходу да постіндустрыяльнага грамадства.

## Раздзел І. ГАСПАДАРЧАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ПЕРЫЯД ПЕРШАБЫТНААБШЧЫННАГА ЛАДУ

Перыяд першабытнаабшчыннага ладу адлюстраваны ў падручніках досыць сціпла. Пераважная большасць падручнікаў зусім абыходзіць увагай гэты этап, альбо абмяжоўваецца канстатацыяй агульнавядомых фактаў[1]. Найбольш дасканала праблемы развіцця прадукцыйных сіл і вытворчых адносін у час існавання першабытнаабшчыннага ладу раскрываюцца у "Нарысах гісторыі Беларусі", "Эканамічнай гісторыі Беларусі" і першым томе шматтомнай "Гісторыі Беларусі". Гэтая літаратура і будзе прапанавана намі студэнтам для вывучэння вызначаных ніжэй пытанняў[2].

### Што такое "першабытнаабшчынны лад"?

"Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" дае наступнае тлумачэнне сутнасці паняцця ***"першабытнаабшчынны лад":*** гэта – грамадска-эканамічная фармацыя, якая ахоплівае перыяд ад з'яўлення першых людзей да ўзнікнення кла-

---

[1] Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапамож. / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік. – Мн.: Вышэйшая школа, 2009. – 512 с.; Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006. – 456с.; Чигринов, П.Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие / П.Г. Чигринов. – 3-е изд. испр. – Мн.: Выш.шк., 2007. – 463 с. і інш.

[2] Нарысы гісторыі Беларусі / М.П. Касцюк [і інш.]; пад рэд. М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]: у 2-х ч. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч.1 – 527 с.;Эканамічная гісторыя Беларусі: вуч. дапам. / В.І. Галубовіч. Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнаай рэд. В.І. Галубовіча.– Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ Экаперспектыва, 1996. – 432 с.; Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т.1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэд. XIII ст. / В. Вяргей [і інш.]. – 2000. – 351 с.

савага грамадства. Паводле археалагічнай перыядызацыі супадае з каменным векам. Для першабытнаабшчыннага ладу характэрны паступовая біялагічная эвалюцыя чалавека, узаемаабумоўленасць абшчынных, роднасных і эканамічных сувязей паміж людзьмі, калектыўная ўласнасць на сродкі вытворчасці, ураўняльнае размеркаванне сродкаў існавання [1].

Адштурхоўваючыся ад дадзенага вызначэння, трэба паставіць пытанні, адказы на якія могуць даць дакладнае ўяўленне пра першабытнаабшчынны лад:

1) Калі з'яўляюцца першыя людзі на тэрыторыі Беларусі?

2) Якія храналагічныя рамкі існавання першабытнаабшчыннага ладу на на Беларусі?

3) Якія змены адбываліся ў абшчынных, роднасных, эканамічных сувязях паміж людзьмі ў час існавання першабытнабшчыннага ладу на Беларусі?

## Калі з'явіліся першыя людзі на тэрыторыі Беларусі?

Большасць навукоўцаў лічаць, што чалавек вылучыўся з жывёльнага статку ў Афрыцы прыкладна 3-2,5 млн гадоў назад. Для засялення тэрыторыі Беларусі людзьмі важнае значэнне мелі геаграфічныя і прыродна-кліматычныя фактары. Падрабязная характарыстыка гэтых фактараў дадзена у навучальным дапаможніку "Эканамічная гісторыя Беларусі"[3]. Доўгі час прыроднае асяроддзе было неспрыяльным для жыцця людзей.

У сучаснай археалагічнай навуцы маецца некалькі пунктаў гледжання адносна часу з'яўлення на Беларусі першых людзей. У сувязі з гэтым у вучэбнай літаратуры даюцца розныя даты пачатку засялення беларускай этнічнай тэрыторыі: 100 і 40 тыс. г. н. Сапраўды, на тэрыторыі Беларусі каля вёсак Абідавічы, Падлужжа Быхаўскага раёну, Свяцілавічы Веткаўскага, Клеевічы Касцюковіцкага раёнаў былі знойдзены прылады працы, уласцівыя для азначанага перыяду, выраблёныя з крамянёвых адшчэпаў пры дапамозе паслядоўнага аббівання (грубааббітыя прылады) [2, 28]. Іх можна разглядаць у якасці ўскоснага доказу часовага знаходжання неандэртальцаў на тэрыторыі Беларусі.

*Самыя старажытныя прылады працы, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі – грубааббітыя каменныя наканечнікі, скрэблы, ручныя рубілы.*

Але адзін з самых аўтарытэтных беларускіх археолагаў Э.М. Загарульскі лічыць, што "казаць аб магчымасці з'яўлення на тэрыторыі Беларусі першых людзей у сярэднім палеаліце (г. зн. 100-40 тыс. г. н.) можна толькі ў гіпатэтычным сэнсе". На яго думку, ёсць дакладныя факты, якія сведчаць аб наяўнасці людзей на тэрыторыі Беларусі ў эпоху позняга палеаліту – гэта адкрытая ў 1928 г. археолагам Ю. Попелем стаянка першабытных людзей на Прыпяці каля вёскі Юравічы ў Калінкавіцкім раёне і адкрытая ў 1926 г. беларускім археолагам К.М. Палікарповічам стаянка першабытных людзей каля вёскі Бердыж, у Чачэрскім раёне Гомельскай вобласці. Бердыжская стаянка датуецца тэрмінам 23 тыс. г. н., а Юравіцкая стаянка – 26 тыс. г. н. [3, 7-9]. Такім чынам, найбольш верагодным з'яўляецца меркаванне, што засяленне тэрыторыі Беларусі пачало-

---

[3] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч. Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча. – Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 22- 27.

ся прыкладна 40-35 тыс. г. н., у *эпоху позняга палеаліту*, калі ўжо сфармаваўся ***чалавек сучаснага фізічнага тыпу – неантрап, ці краманьёнец***. Гэты чалавек ўжо ўяўляў сабою сацыяльную істоту, члена родавага і вытворчага калектыву.

**Храналагічныя рамкі існавання першабытнаабшчыннага ладу на Беларусі**

Прыведзенае вышэй вызначэнне першабытнаабшчыннага ладу даводзіць да нашага ведама, што, паводле археаалагічнай перыядызацыі, першабытнаабшчынны лад супадае з каменным векам. Адзначым, што такое тлумачэнне можа выкарыстоўвацца толькі для характарыстыкі адпаведнага перыяду сусветнай гісторыі. Сапраўды, у некаторых рэгіёнах (на Блізкім Усходзе, у даліне ракі Ніл і інш.) у наступны перыяд, які вызначаецца паводле археалагічнай перыядызаціі як бронзавы век, узнікае класавае грамадства, фармуюцца першыя дзяржавы. Больш уважлівае вывучэнне крыніц па гісторыі Беларусі не дае магчымасці пагадзіцца з такой трактоўкай перыяду існавання першабытнаабшчыннага ладу ў дачыненні да Беларусі і прыводзіць да разумення, што вытворчыя адносіны, характэрныя для першабытнаабшчыннага ладу захоўваліся тут і ў бронзавым, і нават у жалезным веку.

***Каменны век*** – самая старажытная эпоха ў развіцці чалавецтва, на працягу якой асноўныя прылады працы выраблялі з каменя. Каменны век вызначаецца паводле археалагічнай (тэхналагічнай) перыядызацыі, якая падзяляе мінулае па характары сыравіны, што ішла на выраб прылад працы. Пачаўся каменны век 3-2,5 млн. г. н. у Афрыцы, калі чалавек вылучыўся з жывёльнага статку. На Беларусі каменны век пачаўся каля 100 тыс. г. н. Па крытэрыям эвалюцыі інтэлекта чалавека, удасканаленню прылад працы і зброі, ускладнення заняткаў чалавека і яго побыту каменны век падзяляецца на тры перыяды: старажытны к.в – палеаліт (100 – 11/10 тыс. гг. н.), сярэдні к.в. – мезаліт (9-5 тыс. гг. да н.э.), новы к.в – неаліт (5-3 тыс. гг. да н.э.) [4, 23].

На працягу вялікага перыяду існавання каменнага веку змяняліся прыродна-кліматычныя ўмовы і, адпаведным чынам, змяняўся род заняткаў людзей. Большасць навукоўцаў лічаць, што першабытная эканоміка праходзіла ў сваім развіцці дзве асноўныя фазы: ***прысвойваючай і вытвараючай гаспадаркі.***

Перыяд прысвойваючай гаспадаркі прыпадае на эпохі палеаліту і мезаліту. Прысвойваючая гаспадарка пераважае таксама ў перыяд ранняга неаліту. Аснову гаспадаркі ў гэты час складалі ***збіральніцтва, паляўнічы промысел і рыбалоўства.*** Роля кожнага з гэтых заняткаў у жыцці чалавека не заставалася нязменнай на працягу ўсяго перыяду існавання першабытнабшчыннага ладу. Прычыну змен, якія адбываліся ў жыцці першабытнага чалавека на працягу ўсяго перыяду існавання прысвойваючай гаспадаркі, аўтары шматтомнай “Гісторыі Беларусі” трактуюць наступным чынам: ”Існаванне тагачаснага насельніцтва адбывалася ў непарыўнай сувязі з навакольным асяроддзем. Асабліва вялікі ўплыў на чалавека аказваў клімат, пры гэтым, як праз непасрэдае ўздзеянне цяплом, холадам, ападкамі, так і праз раслліннасць і жывёльны свет, якія былі асноўнымі крыніцамі здабывання ежы” [4, 28].

Прынята лічыць, што прасцейшым відам гаспадарчай дзейнасці і самым старажытным тыпам эканомікі было ***збіральніцтва.*** “Яно не патрабавала

практычна ніякіх складаных прылад працы, прыстасаванняў. Людзі збіралі ўсё, што можна было з'есці: насенне розных злакаў, арэхі, жалуды, карэньчыкі і сцябло раслін. Акрамя гэтага людзі здабывалі і ўжывалі ў ежу многія прадукты жывёльнага паходжання: жаб, яшчарыц, дробных грызуноў, рачных і азёрных малюскаў, мёд, яйкі, птушак і г.д." [2, 32].

*Тэхналогія збіральніцтва засноўвалася на прымітыўных прыладах працы, галоўнай з якіх была палка-капалка, а пазней косць, або рог жывёлін, адпаведнай формы і памераў камень і г.д.*

Але на тэрыторыі Беларусі ўмовы для заняткаў збіральніцтвам з самага пачатку з'яўлення чалавека былі неспрыяльнымі. Прыкладна 100 тыс. гг. назад з'явіліся першыя прыкметы наступлення апошняга паазерскага аледзянення. А 18 тыс. гг. назад ляднік, які рухаўся са Скандынавіі, дасягнуў максімальнай мяжы, якая пралягала ад раёна Гродна, на поўнач ад Вілейкі, на ўсход у раён Оршы. Перад ляднікам існаваў шырокі пас перадледніковай пустэльні. На поўдзень прасціралася тундра і халодны стэп з адпаведнай чэзлай расліннасцю. Адпаведным клімату і расліннасці быў жывёльны свет, які складаўся з тыповых прадстаўнікоў тундры і лесатундры (паўночны алень, пясцы, лемігі, белыя курапаткі), лесу (высакародныя алені, бурыя мядзведзі, казулі, расамахі), стэпу (зубры, коні, зайцы-русакі, лісы, суслікі). Асабліва характэрнымі для прыледніковай фауны былі маманты і валасатыя насарогі – асноўны аб'ект палявання палеалітычных жыхароў. Такім чынам, галоўным заняткам палеалітычнага чалавека на тэрыторыі Беларусі было паляванне і, магчыма, збіральніцтва. Пасля таго, як 15 тыс. г. н. пачалося пацяпленне клімату, чалавек стаў больш актыўна займацца збіральніцтвам: нават у лесатундры можна было знайсці мясціны, дзе раслі ядомыя расліны, ягады і грыбы, збіраліся таксама птушыныя яйкі, розныя малюскі. Развіццё рыбалоўства стрымлівалася адсутнасцю адпаведных прылад працы. Рыбу маглі калоць коп'ямі, глушыць доўбнямі, лавіць рукамі.

Але асновай гаспадаркі фінальнапалеалітычнага чалавека заставалася паляванне. Характэрнай асаблівасцю палявання на буйных жывёл быў яго калектыўны характар, таму што загоннае паляванне, капанне аб'ёмістых ям-лавушак, куды мог трапіць мамант, патрабавала аб'яднання людзей у лоўчыя абшчыны [2, 34]. У апошнія тысячагоддзі палеаліта, калі зніклі маманты, валасатыя насарогі, і асноўным аб'ектам палявання стаў паўночны алень, чалавек вынайшаў лук са стрэламі. Асаблівасці палявання насельніцтва Беларусі у каменным веку і асноўныя напрамкі яго прагрэсу дакладна вызначаны аўтарамі "Эканамічнай гісторыі Беларусі"[4]. Развіццё палявання давала чалавеку магчымасць выкарыстоўваць для вырабу прылад працы не толькі крэмень, але і іклы, рагі і косці жывёл.

Такім чынам, ***палеаліт*** *характарызуецца:*

*1) пераважна паляўнічым характарам гаспадарання;*

*2) развіццём збіральніцтва, як дапаможнага занятку чалавека.*

Пацяпленне клімату ў мезаліце (9-5 тыс. гг. да н.э.) выклікала з'яўленне лясных масіваў з бярэзнікамі, хвойнікамі, шыракалістымі лясамі і адпаведныя змены жывёльнага свету. Шырока распаўсюдзіліся ласі, мядзведзі, дзікі, выса-

---

[4] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: дучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча. – Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 34-35.

кародныя алені, туры, павялічылася колькасць птушак, асабліва водаплаўных. Змены клімату, расліннага і жывёльнага свету моцна паўплывалі на ўсе бакі жыццядзейнасці мезалітычнага чалавека. Змяніліся спосабы палявання, з'явіліся яго новыя формы і тыпы паляўнічай зброі і прылад працы. Большае месца ў жыцці чалавека займае рыбалоўства. Развіваецца збіральніцтва. У гэты час прысвойваючая гаспадарка дасягае вышэйшай ступені свайго развіцця.

Важна засвоіць высновы, на якіх акцэнтуюць увагу аўтары шэрагу падручнікаў:

1) у мезаліце адбылося поўнае засяленне чалавекам тэрыторыі Беларусі;

2) засяленне тэрыторыі Беларусі адбывалася з розных месцаў і рознымі групамі насельніцтва, якія адносіліся да розных этнасаў (плямёны паляўнічых, рыбакоў і збіральнікаў);

3) у далінах буйных рэк з'явілася першае ***сталае (аўтахтоннае насельніцтва)***.

*Галоўныя вынаходніцтвы часу **мезаліту:***

- *сеткі для лоўлі рыбы;*
- *кручкі з лескай;*
- *грубааббітая сякера, забяспечаная драўлянай ручкай.*

Каля 6 тыс. г. н. (альбо, як вызначаецца у іншых крыніцах, 4-3 тыс. гг. да н.э.) на Беларусі пачалася эпоха неаліту (новага каменнага веку). Лічыцца, што тыповае ***неалітычнае грамадства Еўропы вызначаецца чатырма галоўнымі асаблівасцямі*** – з'яўленнем земляробства, жывёлагадоўлі, глінянага посуду и шліфаваных каменных вырабаў. Але гэтыя складальнікі неалітычнай культуры далёка не заўсёды выступаюць усе адначасова. Свае асаблівасці былі і на Беларусі. Тут вытвараючыя формы гаспадаркі на поўдні краіны сталі шырока вядомыя ў сярэдні перыяд неаліту, а можа, і раней, а на Падзвінні – у позні. Шліфаванне крэменю таксама распаўсюдзілася ў канцы эпохі. А вось гліняным посудам (керамікай) на нашай тэрыторыі пачалі карыстацца з першай паловы 4 тыс. г. да н.э., а на Палессі і раней – з канца папярэдняга тысячагоддзя. Такім чынам, аўтары шматтомнай “Гісторыі Беларусі” пагаджаюцца з тым, што новы каменны век на Беларусі пачынаецца з факту з'яўлення керамікі [4, 34].

*Галоўныя вынаходніцтвы перыяду **неаліту:***

- *новыя прыёмы тэхнікі апрацоўкі каменю – пілаванне, шліфаванне, свідраванне;*
- *гліняны посуд, пераважна вострадонны, зроблены ў тэхніцы ручной лепкі;*
- *прадзенне і ткацтва;*
- *лодка – адзін з першых транспартных сродкаў чалавека;*
- *шахты па здабычы крэменю (адна з першых шахт выяўлена каля пасёлка Чырвонае Сяло Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці);*
- *земляробства і жывёлагадоўля, як дадатковыя заняткі да традыцыйных форм дзейнасці.*

Што датычыцца характару гаспадаркі, то ў эпоху неаліту яна захоўвала свой прысвойваючы характар, таму што:

1) ва ўмовах вельмі спрыяльнага для жывёльнага і расліннага свету клімату ў чалавека з'явілася вялікая колькасць дзікарослай расліннай ежы (лясных і вадзяных арэхаў, жалудоў, прыдатных да яды каранёў, грыбоў, ягад);

2) сфармаваліся рацыянальныя формы вядзення рыбалоўства і палявання (захаванне маладняка, незабіванне цельных самак), што, разам з удасканален-

нем паляўнічай зброі і рыбацкіх прыстасаванняў, развіццём спосабаў здабычы спажывы ў суме давалі такую колькасць ежы, што не было патрэбы ўводзіць земляробства і жывёлагадоўлю;

3) для заняткаў земляробствам і жывёлагадоўлей у лясной зоне патрабавалася значна больш намаганняў, чым для прысвойваючых форм гаспадарання. Праўда, існуюць ускосныя сведчанні таго, што насельніцтва на поўдні Беларусі займалася земляробствам ужо з сярэдзіны 5 тысячагоддзя да н.э. [2, 40].

У гістарычнай навуцы пераход ад прысвойваючай да вытвараючай гаспадаркі трактуецца як адна з праяў ***неалітычнай рэвалюцыі***. На нашу думку, адказы на шэраг пытанняў, звязаных з тлумачэннем сутнасці "неалітычнай рэвалюцыі", дадзены ў навучальным дапаможніку "Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі"[5].

Аўтары дапаможніка:

1) вызначаюць асноўныя рысы "неалітычнай рэвалюцыі" і яе эпіцэнтры;

2) удакладняюць час пачатку неалітычнай рэвалюцыі ў эпіцэнтрах;

3) паказваюць адрозненне паміж паняццямі "неалітычная рэвалюцыя" і "неаліт";

4) вызначаюць час пачатку "неалітычнай рэвалюцыі" на Беларусі.

Храналагічнай мяжой паміж прысвойваючай і вытвараючай формамі гаспадаркі на Беларусі з'яўляецца кан. 3 – пач. 2 тыс. гг. да н.э. (па археалагічнай перыядызацыі – гэта бронзавы век).

***Бронзавы век*** – эпоха ў гісторыі чалавецтва, калі ўзнікае і актыўна пашыраецца металургія, апрацоўка і выкарыстанне бронзы. На Беларусі бронзавы век пачынаецца на мяжы 3 і 2 тыс. гг. да н.э.[6] і доўжыцца да 7 ст. да н.э.[7] Металічныя вырабы з бронзы раней за ўсё пачалі выкарыстоўвацца ў верхнім Падняпроўі. Трэба мець на ўвазе, што на Беларусі адсутнічаюць радовішчы руды, неабходнай для атрымання медзі і бронзы, што прымушала нашых продкаў імпартаваць сыравіну і металічныя вырабы з іншых рэгіёнаў (Балкана-Карпацкага і Каўказскага металургічных цэнтраў). На поўдзень ад Беларусі на тэрыторыі Украіны ўжо ў 4 тыс. г. да н.э. з'яўляюцца ўласная металургія і металаапрацоўка, а ў 3 тыс. г. да н.э. тут пачынаюць атрымліваць першы штучны сплаў – мыш'яковістую бронзу, а з другой паловы 3 тысячагоддзя карыстаюцца ўжо алавяністай бронзай [4, 78]. Тыповымі знаходкамі археолагаў перыяду бронзы на Беларусі з'яўляюцца шылы, нажы, сякеры, наканечнікі коп'яў і разнастайныя ўпрыгожанні (скроневыя кольцы, дыядэмы, бранзалеты і інш). Археолагі высветлілі, што медныя і бронзавыя прылады працы і зброю клалі пры здзяйсненні пахавальнага абраду толькі памерлым, якія пры жыцці займалі высокае сацыяльнае становішча. Характэрна, што прылады працы, якія выкарыстоўваліся для земляробства, як і раней выраблялíся пераважна з крэменю (сякеры, крамянёвыя сярпы, серпападобныя нажы, а таксама каменныя, рагавыя і нават драўляныя матыкі).

---

[5] Гл. падрабязна: Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В.Стралец, Л.Ю.Малыхіна / пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – С. 5-7.

[6] Гл. падрабязна: Бронзавы век // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Б.І. Сачанка (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1994. – Т. 2. – С. 79.

[7] Гл. падрабязна: Жалезны век // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі . – 1996. – Т. 3. – С. 362.

Большасць навукоўцаў пагаджаецца, што пераход да вытвараючай гаспадаркі здзейсніўся на Беларусі ў век медзі і бронзы. "Працэс актыўнага авалодання вытвараючымі формамі гаспадаркі – земляробствам і жывёлагадоўляй, які пачаўся яшчэ ў неаліце, з пачаткам бронзавага веку стаў паўсюдным" [4, 79]. Аднак нельга лічыць, што праблема суадносін форм гаспадарання высветлена да канца. У беларускай навуцы гэтая праблема яшчэ не была прадметам спецыяльных даследванняў.

Пацвярджэннем таго, што насельнікі Беларусі ў век медзі і бронзы займаліся земляробствам, з'яўляюцца адбіткі зерня на кераміцы і вялікая колькасць сякер сярод археалагічных знаходак." У лясной зоне магло быць перспектыўным толькі ***падсечна-агнявое (ляднае) земляробства***[8], якое патрабавала вялізнай колькасці сякер. Разам з падсекай ужывалася і матыжнае земляробства. Практычна ва ўсіх рэгіёнах Беларусі знойдзены рэшткі касцяных і каменных матык. Але развіццё матыжнага земляробства стрымлівалася наяўнасцю вялікіх лясных масіваў, асабліва ў сярэдняй і паўночнай частках сучаснай тэрыторыі Беларусі .

*Найбольш раннімі збожжавымі культурамі земляробства на тэрыторыі Беларусі лічацца пшаніца, лён і проса (бронзавы век). Крыху пазней сталі высявацца ячмень, гарох і бабы.*

Жывёлагадоўляй нашы продкі пачалі займацца ў 3 тыс. гг. да н. э. [2, 39]. Галоўнымі перадумовамі для ўзнікнення жывёлагадоўлі былі, перш за ўсё, прыручэнне жывёлы, пераход да аседлага вобразу жыцця, асваенне тэхналогіі назапашвання і доўгатэрміновага зберажэння кармоў для жывёлы. Раней за ўсё гэты занятак атрымаў распаўсюджанне ў палескім рэгіёне. Гэтаму, у значнай ступені, садзейнічалі жывёлагадоўчыя плямёны, якія перасяляліся з поўдня і з захаду. Ёсць звесткі, што жывёлагадоўлей займаліся плямёны нёманскай культуры, якія жылі на тэрыторыі Пінскага раёна у другой палове 5-2 тыс. гг. да н.э.[9] У бронзавым веку жывёлагадоўля, як форма гаспадаркі, была вядома ўжо на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Пра заняткі жывёлагадоўляй сведчаць знойдзеныя пры раскопках паселішчаў косткі свойскіх жывёлін. Сярод астэалагічнага матэрыялу яны займаюць каля 25 %, гэта значыць, што чвэрць мяснога харчавання жыхары атрымлівалі не з палявання, а з гадоўлі быдла (пераважна, кароў і свіней). На поўдні Беларусі, па некаторым меркаванням, была распаўсюджана гадоўля буйной рагатай жывёлы, што абумоўлена выкарыстаннем валоў у земляробстве [4, 80].

*Першай жывёлай, якую прыручылі жыхары Беларусі, з'яўлялася сабака.*

З іншага боку, астэалагічны[10] матэрыял сведчыць пра захаванне ролі інтэнсіўнага палявання ў жыцці людзей. Гэта пацвярджае і факт наяўнасці вялікай колькасці адпаведнай зброі на месцах тагачасных паселішчаў: наканечнікаў стрэл і коп'яў, нажоў і кінжалаў. Важнай галіной гаспадаркі ў бронзавым веку заставалася і збіральніцтва.

---

[8] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч. Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча.– Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 40-41.

[9] Гл. падрабязна: Жывёлагадоўля // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– 1996. – Т. 3 – С. 377.

[10] **Астэалагічны матэрыял** – матэрыял, які выкарыстоўвае астэалогія (osteologia) вучэнне пра косткі, вывучае шкілет у цэлым, асобныя косткі, касцяную тканіну.

У эпоху бронзы актывізуюцца абменныя працэсы. Прадметам абмену былі, найперш, вырабы з медзі. Па сёнешні дзень, да канца не высветлена, ці валодалі жыхары Беларусі сакрэтамі металургіі, або карысталіся толькі імпартнымі рэчамі. Ёсць меркаванні, што мясцовая вытворчасць некаторых бронзавых рэчаў з прывазной сыравіны, а таксама пераплаўка сапсаваных вырабаў, пачалася ў 1-й палове 1 тыс. гг. да н.э.[11] У сярэдні і позні перыяды бронзавага веку металічныя вырабы трапляюць у межы нашага краю не толькі з Каўказа і Украіны, але і з Цэнтральнай Еўропы, Скандынавіі, Ютландыіі, Прыбалтыкі, цэнтральных раёнаў Расіі [4, 83]. Важным і даволі прэстыжным прадметам імпарту становіцца бурштын, які пастурае ў асноўным з паўднёвага ўзбярэжжа Балтыйскага мора. Прадметам абмену ў эпоху бронзы застаецца і высокаякасны крэмень.

***Жалезны век.*** Гэта заключны перыяд першабытнай гісторыі (з VII-VI стст. да н.э. па IV-V стст. н.э.), які характэрызуецца з'яўленнем і шырокім распаўсюджаннем металургіі жалеза, вырабам з яе прылад працы і зброі. Навыкамі вытворчасці і апрацоўкі жалеза ў Беларусі першымі ў другой чвэрці першага тысячагоддзя да н.э. авалодалі плямёны, якія засялялі поўдзень нашай краіны, а ў другой палове гэтага ж тысячагоддзя з сакрэтамі яго здабычы і кавальства пазнаёмілася насельніцтва цэнтральнай і паўночнай часткі Беларусі. Важна адзначыць, што насельніцтва паўднёвай Беларусі авалодала навыкамі жалезаробчай вытворчасці амаль адначасова з многімі іншымі еўрапейскімі народамі [4, 83].

*Жалеза здабывалася з бурага жалезняку ў невялікіх паўшарападобных **печах-домніцах**.*

Пашырэнню чорнай металургіі спрыялі:

- даступнасць сыравіны;
- адносна нескладаная тэхналогія варкі жалеза, якое атрымлівалі з балотных і азёрных руд (бурых жалезнякоў), адклады якіх маюцца на ўсёй тэрыторыі краіны;
- высокае запатрабаванне грамадства ў прадуктах чорнай металургіі.

Аснову гаспадаркі насельніцтва эпохі жалеза складалі вытвараючыя формы гаспадаркі (земляробства і жывёлагадоўля), якія дапаўняліся рыбалоўствам, паляваннем, збіральніцтвам.

*Разнастайныя заняткі насельніцтва, яго побыт і вайсковую справу характарызуюць знойдзеныя падчас раскопак прадметы з жалеза, якія выраблялiся кавалямі: сякеры, долаты, зубілы, сярпы і нажы для жніва, брытвы, гаспадарчыя нажы, шылы, іголкі, наканечнікі коп'яў, дроцікаў і стрэл.*

Слаба высветленым пытаннем гісторыі Беларусі застаецца праблема суадносін у жыцці тагачаснага грамадства земляробства і жывёлагадоўлі. Вядома, што аддзяленне земляробства ад жывёлагадоўлі трактуецца як першая вядомая ў гісторыі форма грамадскага падзелу працы. Аўтары шматтомнай гісторыі Беларусі сцвярджаюць, што ў гаспадарцы носьбітаў канкрэтных культур, або нават іх частак (лакальных і культурных груп) значэнне земляробства і жывёлагадоўлі было розным [4,106]. Так, у Паўночнай і Цэнтральнай Беларусі ў гаспадарцы насельніцтва культур днепра-дзвінскай і штрыхаванай керамікі значную ролю адыгрывала падсечнае (ляднае) земляробства, асноўнай збожжавай культурай у якім была пшаніца. Для заходнедзвінскага варыянта

[11] Гл. падрабязна: Бронзавы век // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Б.І. Сачанка (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1994. – Т. 2. – С. 79.

днепра-дзвінскай культуры на раннім этапе пераважала жывёлагадоўля. Жывёлагадоўля адыгрывала вялікую ролю і для плямён, якія жылі на Палессі. Але, на нашу думку, няма падстаў сцвярджаць, што назіраецца тое, што называецца аддзяленнем жывёлагадоўлі ад земляробства таму, што:

- ва ўсіх плямёнаў жывёлагадоўля мела прысядзібны характар (аб гэтым сведчыць склад статка, у якім пераважала буйная рагатая жывёла і свінні, менш было дробнай рагатай жывёлы і коней);
- не выяўлена дакладных сведчанняў таго, што прадукты жавёлагадоўлі выкарыстоўваліся ў якасці тавару ў абмене з земляробчымі плямёнамі;
- для асобных плямёнаў перавага жывёлагадоўлі насіла часовы характар і была звязана з пагаршэннем у сярэдзіне першага тысячагоддзя да н.э. кліматычных умоў (пахаладанне, вялікая вільготнасць) на Беларусі, што выклікала заняпад земляробства і інтэнсіфікацыю жывёлагадоўлі;
- мелі месца знешнія ўплывы (з лесастэпу, з Прыбалтыкі).

З канца першага тысячагоддзя да н.э. земляробства пачало адыгрываць вядучую ролю і ў тых рэгіёнах, дзе раней пераважала жывёлагадоўля (на Палессі). Але земляробы займаліся і вырошчваннем жывёлы, прычым валоў актыўна выкарыстоўвалі ў якасці цяглавай сілы.

Апрацоўка зямлі мела экстэнсіўны характар, выкарыстоўваліся ***пералог, ляднае і ворнае (ворыўнае) земляробства***[12]. Гэтыя сістэмы суіснавалі на працягу ўсяго першага тысячагоддзя н. э. [4, 107]. Існуе меркаванне, што ворыўнае земляробства ўзнікла на тэрыторыі Беларусі ў раннім жалезным веку. Сеялі проса, ячмень, пшаніцу, якія добра растуць нават на дрэнна апрацаванай глебе. З гародніны найбольш распаўсюджанай была рэпа, вядомая ў Цэнтральнай Еўропе з першага тысячагоддзя да н.э. Вырошчваліся таксама лён і каноплі. На рубяжы эр пачынаецца шырокае распаўсюджанне культуры жыта, якое найбольш прыстасавана для вырошчвання ў лясной паласе Усходняй Еўропы.

*Аб развіцці ў жалезным веку ворыўнага земляробства сведчыць знойдзенае ў тарфяніку паблізу вёскі Капланавічы Клецкага раёна драўлянае рала, якое лічыцца тыповай ворыўнай прыладай, якая папярэднічала сохам і плугам і выкарыстоўвалася з дапамогай цяглавай сілы (быка, каня).*

Прысвойваючыя галіны гаспадаркі (паляванне і рыбалоўства) на працягу ўсяго жалезнага веку маюць значную ўдзельную вагу ў гаспадарцы старажытнага насельніцтва Беларусі. Аб'ектамі палявання былі многія дзікія жывёлы. Даследчыкі вызначаюць два асноўныя напрамкі палявання па спецыялізацыі: з-за мяса (лось, зубр, тур, алень, кабан, мядзведзь) і з-за футра (перш за ўсё, бабёр і лісіца). Для большасці плямён асноўным было паляванне з мэтай здабычы мяса. Але здабыча каштоўнага футра таксама мела вялікае значэнне, таму што футра магло выкарыстоўвацца падчас абмену. Рыбалоўства захоўвала сваё значэнне толькі для асобных плямёнаў.

У жалезным веку, у I ст. н.э. адбылося станаўленне ***бортніцтва*** як промыслу (бортніцтва – лясное пчалярства, заснаванае на развядзенні і ўтрыманні лясных пчол у штучных дуплах – борцях)[13]. Бортніцтва развівалася паступова з

---

[12] Гл. падрабязна: Сістэмы земляробства // Экцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 2001. – Т. 6, кн. I. – С. 304.
[13] Гл. падрабязна: Бортніцтва // Экцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Б.І. Сачанка (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– 1994. – Т. 2. – С. 60.

дзікага пчалярства. Пераход да класічнай формы бортніцтва адбыўся са з'яўленнем жалезных прылад працы, калі стала магчыма выдзёўбваць борці ў сырых ствалах дрэў.

Важнымі заняткамі насельніцтва эпохі жалезнага веку былі разнастайныя рамёствы: чорная металургія і металаапрацоўка, лепка посуду, апрацоўка дрэва, каменю, косці, прадзенне і ткацтва. Гэтыя віды рамеснай дзейнасці з'яўляліся неад'емнай часткай патрыярхальнага ўкладу жыцця. Узровень гэтых хатніх рамёстваў яшчэ заставаўся нізкім.

### Якія змены адбываліся ў абшчынных, роднасных, эканамічных сувязях паміж людзьмі ў час існавання першабытнаабшчыннага ладу на Беларусі?

Пры адсутнасці пісьмовых крыніц цяжка рэканструяваць сацыяльныя адносіны ў першабытных супольнасцях. У гэтым сэнсе важнае значэнне мае аналіз удасканалення прылад працы, бо гэты працэс адлюстроўвае эвалюцыю вытворчасці, а з апошняй можна звязаць сацыяльную гісторыю.

Для першабытнаабшчыннага ладу характэрна калектыўная ўласнасць на сродкі вытворчасці і ўраўняльнае размеркаванне, што тлумачыцца складанымі ўмовамі існавання тагачаснага чалавека і характарам заняткаў людзей (калектыўнае паляванне і інш).

Першай вядомай супольнасцю першабытных людзей быў першабытны чалавечы статак (праабшчына).

***У канцы сярэдняга палеаліту*** сфармаваўся чалавек сучаснага фізічнага тыпу, які пераўтварыўся ў сацыяльную істоту, члена родавага і вытворчага калектыву. Разам з тым ***узнікла раннеродавае грамадства***, адбыўся пераход ад праабшчыны да роду, ад групавога шлюбу да парнай сям'і.

***У познім палеаліце існуе ўжо родавае грамадства (мацярынская родавая абшчына)***. Родавая абшчына, якая жыла на адной альбо некалькіх стаянках, з'яўлялася асноўным прамысловым калектывам. Існавала абшчынная і родавая ўласнасць на паляўнічыя ўчасткі, месцы для збіральніцтва і рыбалоўства, запасы ежы і сыравіны. Толькі рэчы індывідуальнага карыстання – побыту, узбраення і некаторыя прылады працы – знаходзіліся ў асабістай уласнасці. Ажыццяўлялася ўраўняльнае размеркаванне прадуктаў палявання і рыбалоўства паміж членамі абшчыны. Першы архаічны падзел працы па полу і ўзросту адбываўся ўнутры абшчыны, якая налічвала дзесяткі чалавек, некалькі абшчын аб'ядноўваліся ў род.

Род з'яўляўся аб'яднаннем людзей аднаго паходжання, якое падлічвалася спачатку па мацярынскай лініі. Род быў уласнікам пэўнай тэрыторыі.

Найвышэйшага развіцця родаплемянны лад дасягнуў у ***неаліце***. Колькасць родаў і абшчын значна ўзрасла. У неаліце развіваецца першая форма ўласнасці (племянная). Кожнае племя займала пэўную тэрыторыю, мела свае рыбалоўныя і паляўнічыя, а потым і земляробчыя ўчасткі.

У ***бронзавым веку***, у сувязі з пачаткам вытворчай дзейнасці чалавека, узнікае маёмасная няроўнасць паміж супляменнікамі (сем'ямі, родамі плямёнамі). Вытворчыя, эканамічныя сувязі паміж членамі абшчыны і роду робяцца пануючымі.

У грамадскім ладзе плямён Беларусі ўжо з самага пачатку жалезнага веку вызначаюцца прыкметы раскладання першабытнаабшчынных адносін. Рост прадукцыйных сіл паступова пачаў забяспечваць людзям назапашванне матэрыяльных каштоўнасцяў і вымушаў шукаць новыя землі для свайго гаспадарання. Аб раскладанні першабытнаабшчынных адносін сведчасць наступныя змены ў грамадскім ладзе тагачасных насельнікаў Беларусі:

1) пачынаецца працэс распадзення родаў на вялікія патрыярхальныя сем'і, а з пачатку І-га тысячагоддзя нашай эры – распад патрыярхальна-сямейнай абшчыны на малыя сем'і з наступным іх аб'яднаннем у другой палове І-га тысячагоддзя н.э. у тэрытарыяльныя абшчыны;

2) узнікаюць супярэчнасці паміж родамі, плямёнамі, частыя ваенныя сутыкненні паміж імі;

3) узнікае патрыярхальнае рабства ў сувязі з тым, што ўзровень гаспадарчай дзейнасці дазваляў пракарміць лішніх людзей і не забіваць палонных;

4) павышаецца роля мужчын-воінаў і правадыра племені. На апошняй стадыі першабытнабшчыннага ладу ўзнікае лад ваеннай дэмакратыі, пры якім вярхоўнай уладай у родзе і племені становіцца сход мужчын-воінаў, які вырашаў пытанні вайны і міру, а таксама выбіраў старэйшын і правадыра племені.

У жалезным веку плямёны на тэрыторыі Беларусі знаходзіліся на стадыі развітога патрыярхату. Асноўнай адзінкай грамадства была вялікая патрыярхальная сям'я, якая аб'ядноўвала 1-4 пакалення бліжэйшых суродзічаў. Некалькі сем'яў стваралі род, які валодаў пэўнай тэрыторыяй з паселішчамі, участкамі зямлі, што апрацоўвалі, і пашай для жывёлы. Для вялікай патрыярхальнай сям'і, ці роду, стваралася гарадзішча, якое мела абарончую сістэму валоў і равоў. На поўдні Беларусі жыццё на ўмацаваных гарадзішчах працягвалася да першых ст. н. э., на поўначы – амаль да сярэдзіны 1 тыс. У далейшым асноўнай формай паселішчаў стала неўмацаванае селішча. З пашырэннем ворыўнага земляробства ўзнікла асобная гаспадарка малой сям'і. Аб'яднаныя не кроўнымі сувязямі, а агульнасцю гаспадарчага жыцця, такія сем'і ўтваралі сельскую (суседскую, земляробчую) абшчыну, якая ва ўсіх славян называлася "мірам", "верв'ю", "грамадой". Члены абшчыны былі звязаны кругавой парукай, узаемнай адказнасцю за вынікі гаспадарчай дзейнасці, захаванасцю і размеркаваннем абшчыннай уласнасці, падтрыманнем нормаў традыцыйнага права[14].

## Літаратура

1. Язэпенка, І. Першабытнаабшчынны лад / І. Язэпенка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. –1996. – Т. 3– С. 468.

2. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч. Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча. – Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996.

3. Загорульский, Э.М. Начало формирования населения Белоруссии (дославянский период) / Э.М. Загорульский. – Минск, 1996.

4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Экаперспектыва", 2000-2008. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / В. Вяргей [і інш.]. – 2000.

[14] Гл. падрабязна: "Жалезны век // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: " Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – Т. 3 –1996.– С. 362".

# Раздзел II. ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ПЕРЫЯД ФЕАДАЛІЗМУ

Перыяд існавання на беларускіх землях феадалізму як грамадска-эканамічнай фармацыі так ці інакш адлюстроўваецца ў большасці падручнікаў, але ў многіх з іх (аднатомных выданнях) – досыць схематычна.[15] Найбольш дасканала праблемы развіцця прадукцыйных сіл і вытворчых адносін у час феадалізму раскрываюцца у "Нарысах гісторыі Беларусі", "Эканамічнай гісторыі Беларусі", першым, другім і трэцім тамах шматтомнай "Гісторыі Беларусі". Гэтая літаратура і будзе прапанавана намі студэнтам для вывучэння вызначаных ніжэй пытанняў[16].

## Што такое "феадалізм"?

"Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" дае наступнае тлумачэнне паняцця ***"феадалізм"*** (ад лац. feodum, уладанне): гэта грамадска-эканамічная фармацыя, якая прыходзіць на змену рабаўладальніцкаму, ці першабытнаабшчыннаму ладу і папярэднічае капіталізму. Асноўная эканамічная сутнасць феадалізму – прысваенне феадаламі дадатковага прадукту шляхам эксплуатацыі сялян на аснове манапольнай уласнасці на зямлю і няпоўнай уласнасці на непасрэдных вытворцаў[17].

Адштурхоўваючыся ад дадзенага вызначэння, трэба паставіць пытанні, адказы на якія могуць даць дакладнае ўяўленне пра феадалізм і яго асаблівасці на Беларусі:

1. На змену якому ладу прыходзіць феадалізм на тэрыторыі Беларусі?
2. Якім шляхам фармуецца феадалізм на беларускіх землях?
3. Якія храналагічныя рамкі перыяду існавання феадалізму на тэрыторыі Беларусі?
4. Якімі рысамі характарызуецца феадалізм?

## На змену якому ладу прыходзіць феадалізм на тэрыторыі Беларусі?

На тэрыторыі Беларусі феадалізм прыходзіць на змену першабытнаабшчыннаму ладу. Феадальныя адносіны фармуюцца паступова ў працэсе разлажэння першабытнабшчыннага ладу. У V-VIII стст. эканоміка Беларусі з'яўлялася ***шматукладнай (суіснавалі розныя эканамічныя ўклады)***.

---

[15] Новік. Я.К. Гісторыя Беларусі: ад старажытных часоў – па 2008 г. : вучэб. дапамож. / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік. – Мн.: Вышэйшая школа, 2009 – 512 с.; Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн.: Современная школа, 2006. – 456 с.; Чигринов, П.Г. Очерки истории Беларуси: учеб. пособие / П.Г. Чигринов.– 3-е изд. испр. – Мн.: Выш.шк., 2007. – 463 с. і інш.

[16] Нарысы гісторыі Беларусі: у 2-х ч. / М.П. Касцюк [і інш.]; пад рэд. М.П. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Беларусь, 1994. – Ч. 1. – 527 с.; Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча.– Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – 432 с.; Гісторыя Беларусі: у 2 ч.: курс лекцый / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст. – 656 с.; Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (г. р.) [і інш.]. – Мн: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / В. Вяргей [і інш.]. – 2000. – 351 с.; Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (г. р.) [і інш.]. – Мн: Экаперспектыва, 2000 – 2008. – Т. 2: Беларусь у перыяд ВКЛ / Ю. Бохан [і інш.]. – 2008.– 688 с.; Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (г. р.) [і інш.]. – Мн: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 343 с.

[17] Гл. падрабязна: "Феадалізм // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 2003. – Т. 6, кн. II. – С. 27.

***Эканамічны ўклад*** – гэта галіна гаспадаркі (эканомікі), уласцівая грамадству на пэўным этапе яго існавання. Эканамічны (гаспадарчы) уклад уяўляе сабой тып адносін паміж людзьмі, які мае ў сваёй аснове тую, ці іншую форму ўласнасці. Сукупнасць эканамічных укладаў і суадносіны паміж імі характарызуюць грамадскі лад і ступень яго развіцця [1, 232].

У V-VIII стст. ***суіснавалі наступныя эканамічныя ўклады***:

- першым гаспадарчым укладам быў ***першабытнаабшчынны***, ці родаплемянны, заснаваны на агульнай (калектыўнай) уласнасці, які потым трансфармаваўся ў абшчынна-сялянскі ўклад. Земляробчай (суседска-вялікасямейнай абшчыне) VIII-IX стст. адпавядае тэрмін ***"верв"***. У тэндэнцыях развіцця земляробчай абшчыны ўсё больш выяўляліся пачаткі фармавання індывідуальных сялянскх гаспадарак;

- ***феадальны ўклад***, які толькі пачынае фармавацца. З'яўляецца феадальная ўласнасць на зямлю (адбываецца захоп абшчыннай зямлі);

- ***рабаўладальніцкі ўклад.*** Патрыярхальнае рабства з'яўляецца яшчэ ў родаплемянным грамадстве, калі ваеннапалонных ператваралі ў рабоў і выкарыстоўвалі для патрэб усёй радавой абшчыны. Абшчыннікі працавалі разам з рабамі, якія з'яўляліся памочнікамі ў складзе патрыярхальнай сям'і. Са з'яўленнем прыватнай уласнасці асобныя сем'і пачалі выкарыстоўваць працу рабоў для сваіх патрэб.

Узнікае пытанне, ці быў у нашай гісторыі перыяд, калі рабаўладальніцкі ўклад з'яўляўся пануючым? Адназначнага адказу на гэтае пытанне на сёнешні дзень няма.Традыцыйна беларускія і расійскія гісторыкі адказвалі на гэтае пытанне адмоўна. Было прынята лічыць, што яшчэ да IX ст. феадальныя адносіны на Русі ўмацаваліся і сталі пануючымі. Але ў канцы XX ст. з'явіўся шэраг работ, у якіх сцвярджаецца, што ў Кіеўскай Русі, як і у іншых краінах, спачатку існавала рабаўладальніцкая фармацыя, а затым у XI-XIII стст. яе змяніў феадалізм [1, 237]. Тым не менш, большасць гісторыкаў пагаджаецца з тым, што з IX ст. феадальны уклад стаў пануючым.

## Якім шляхам фармуецца феадалізм на беларускіх землях?

У VI-IX стст. у некаторых краінах Еўропы пачаўся працэс складвання новага феадальнага ўкладу і новай формы залежнасці.

Працэс станаўлення феадалізму ў Еўропе, як лічаць даследчыкі, ішоў дзвюма шляхамі:

1) **сінтэзным** (у выніку сінтэзу протафеадальных элементаў познеантычнага і варварскага грамадстваў: узор – паўночна-французская мадэль феадалізму)[18];

2) **безсінтэзным** (пры поўнай адсутнасці грэка-рымскага ўплыву на фармаванне класавага грамадства): узор – Англія (за выключэннем паўднёвых раёнаў), Паўднёвая Шатландыя, часткова Германія. Без усялякага ўзаемадзеяння з познарымскімі адносінамі адбывалася раскладанне родавага ладу і станаўленне феадальных адносін у Скандынаўскіх краінах, а таксама ў краінах лясной паласы Ўсходняй Еўропы, у тым ліку на тэрыторыі Беларусі.

[18] Гл. падрабязна: Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В.Стралец, Л.Ю.Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – С. 23.

Феадалізацыя сярэднявечнага грамадства была ў сваёй аснове заканамерным гістарычным працэсам узнікнення буйнога землеўладання і феадальнай залежнасці сялян. Але на тэрыторыі Беларусі яна адбывалася без узаемадзеяння з познарымскімі адносінамі ў працэсе раскладання родаплемянных адносін.

***У генезісе федальных адносін на беларускіх землях вылучаюцца два этапы***:

- ***першы***, так званы ***"даvotчынны" этап***, ахопліве IX-XI стст., характарызуецца пераважна дзяржаўнай формай маёмасці. Яна была вынікам абкладання свабодных абшчыннікаў суседніх зямель данінай, якая пазней пераўтварылася ў феадальную рэнту [1, 239]. Пісьмовыя крыніцы сведчаць, што ў крывічоў-палачан, радзімічаў і дрыгавічоў ўжо ў VI-VIII стст. былі свае княжанні, якія склаліся на аснове этнічных супольнасцей. Дзяржаўная зямельная ўласнасць падзялалася на княжацка-дзяржаўную і дзяржаўна-карпаратыўную. У першым выпадку распараджальнікам дзяржаўнага зямельнага фонду быў князь, у другім – яго саўдзельнікамі ў гэтай справе з'яўляліся баяры[19]. Ёсць меркаванне, што ***баярства, якое вядзе свой пачатак з племяннoй знаці***, магло мець уласныя зямельныя надзелы раней, чым іх атрымалі князі, якія ўзначалілі дзяржаву.

Асноўную частку насельніцтва складалі вольныя сяляне-абшчыннікі, т. зв. ***смерды.*** Князь здзяйсняў збор даніны з сялян метадам "***палюддзя***". Княжацкі суд абкладваў смердаў сістэмай штрафаў ("прадаж") у казну. Абшчыннікі маглі страціць магчымасць свабоднага карыстання даходамі ад сваіх зямель, якія сталі ўласнасцю дзяржавы. Гэтыя землі з сялянамі маглі па загадзе князя перадавацца ў карыстанне прадстаўнікам вярхушкі грамадства. Гісторыкі лічаць, што ў канцы XI ст., калі ў Полацкім княстве была адноўлена дынастыя Рагвалодавічаў, існаваў прыярытэт князя на размеркаванне зямельнага фонду. У X-XI стст. меў распаўсюджанне так званы "васалітэт без ленаў", калі вышэйшая знаць магла надзяляцца князем правам збору на сваю карысць даніны з той ці іншай тэрыторыі. Пры гэтым зямля заставалася дзяржаўнай маёмасцю, а прадстаўнікі служылай знаці не былі землеўладальнікамі;

- ***другі этап*** генезісу феадалізму пачынаецца з XII ст., калі існуюць такія ***формы землеўладання, як княжацкае (даменіяльнае), баярскае, царкоўнае.***

***Дамены*** *– гэта асабістыя ўладанні князя, якія застаюцца за ім незалежна ад знаходжання на княжацкім прастоле і з'яўляюцца спадчыннымі. У склад княжацкага дамена ў раннім сярэднявеччы ўваходзілі двары, гарады, сёлы. Яны маглі быць раскіданы па розных кутках дзяржавы, з'яўляліся асноўнай крыніцай даходаў на ўтрыманне князя і яго двара, а таксама фондам зямельных надзелаў васалаў.*

***Баярскае землеўладанне*** складалася з зямельных уладанняў прадстаўнікоў служылай знаці і уладанняў родавай знаці. Крыніцамі фармавання буйнога землеўладання былі:

- захоп свабодных зямель;
- захоп абшчынных зямель шляхам прамога насілля.

---

[19] **Баяры** – вышэйшы слой феадальнага грамадства ў Кіеўскай Русі, пазней – у рускай дзяржаве, былі васаламі князя, абавязанымі служыць у яго войску; 2) ваеннаслужылыя людзі ў ВКЛ. Гл.: Баяры // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1993. – Т.1. – С. 338.

Буйнейшымі землеўладальнікамі становяцца мясцовыя князі, прадстаўнікі родаплемяннной вярхушкі, вышэйшыя чыны княжацкага двара. Асноўнай формай феадальнага землеўладання выступае ***вотчына***, якая знаходзіцца ў поўнай уласнасці феадала. У адрозненне ад Заходняй Еўропы, феадальнае землеўладанне на беларускіх землях адразу набывае форму ***безумоўнага, спадчыннага землеўладання***.

Адначасова з ростам феадальнага землеўладання з асяроддзя вольных сялян – абшчыннікаў выдзяляюцца катэгорыі залежных сялян: ***радовічаў, закупаў, удачаў і халопаў***[20].

***Царкоўнае землеўладанне*** набывае развіццё з XII ст. Царкоўныя ўстановы ў X-XI стст. існавалі за кошт ***дзесяціны*** (1/10 усіх даходаў сялянскіх гаспадарак). З цягам часу да дзесяціны царкве пачынаюць дадавацца зямельныя ўгоддзі, іншыя княжацкія наданні з улікам значнасці царкоўнага аб'екта.

## Якія храналагічныя рамкі перыяда існавання феадалізму на тэрыторыі Беларусі?

Эканоміка кожнага грамадства амаль заўсёды шматукладная, аднак больш прагрэсіўны ўклад можа стаць пануючым. На тэрыторыі Беларусі феадальны ўклад стаў пануючым прыкладна з IX стагоддзя і існаваў да XIX ст.

Гісторыю феадалізму на Беларусі можна падзяліць на тры перыяды:

1) раннефеадальны: IX – першая палова XIII стст., які характарызуецца раздзяленнем сацыяльных функцый паміж абшчыннікамі, што займаліся сельскагаспадарчай і іншай вытворчай працай, і кіраўнікамі грамадства – ваенным і духоўным саслоўем. Фармуецца саслоўе землеўладальнікаў і сялянскае саслоўе землекарыстальнікаў;

2) развіты феадалізм: другая палова XIII– першая палова XVII стст., які які характарызуецца развітымі феадальнымі адносінамі з іх складанай сістэмай супадначаленасці і карпаратыўнасці. Правы феадалаў на зямлю дапаўняюцца правамі на асобу селяніна;

3) раскладанне і крызіс феадалізму – другая палова XVII – першая палова XIX стст. калі адбываецца зараджэнне капіталістычных адносін і раскладанне традыцыйных феадальных эканамічных і грамадскіх парадкаў [2, 64].

Аўтары асобных падручнікаў адзначаюць, што да канца XVIII ст. выспявае крызіс феадальнай сістэмы, а з канца XVIII ст. пачынаецца генезіс і зацвярджэнне капіталізму [5, 7]. Але між тым у гэты час эканоміка захоўвала свой пераважна феадальны характар.

## Якімі рысамі характарызуецца феадальны лад?

Феадальная гаспадарка заснавана на ***спалучэнні буйной зямельнай уласнасці феадалаў з дробнай індывідуальнай гаспадаркай непасрэдных вытворцаў – сялян***. Адсюль перавага аграрнага сектару эканомікі над прамысловым і гандлёвым.

---

[20] Гл. падрабязна:Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, В.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча. Выд. 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 72-76.

***Феадалізм характарызуецца наступнымі рысамі, уласцівымі гэтаму спосабу вытворчасці:***

1) панаваннем буйной зямельнай уласнасці, якая знаходзілася ў руках класа феадалаў;

2) спалучэннем яе з дробнай індывідуальнай гаспадаркай непасрэдных вытворцаў – сялян, якія часта захоўвалі ў індывідуальнай уласнасці асноўныя сродкі вытворчасці, жывёлу і сядзібу;

3) своеасаблівым статусам сялян, якія не з'яўляліся землеўладальнікамі, а толькі карысталіся зямлёй на розных умовах аж да права спадчыннага землекарыстання;

4) рознымі формамі і ступенямі пазаэканамічнага прымусу сялян: асабістая і пазямельная залежнасць, судовае падпарадкаванне ўладзе феадала, саслоўнае непаўнапраўе сялян;

5) перавагай аграрнага сектара над гандлёвым і прамысловым;

6) панаваннем натуральнай гаспадаркі;

7) нізкім станам прылад працы і тэхнікі земляробства.

Прааналізуем гэтыя рысы больш падрабязна.

***Панаванне буйной зямельнай уласнасці, якая знаходзілася ў руках класа феадалаў.*** У XIII-XV стст. на беларускіх землях працягваўся працэс фармавання і развіцця феадальных адносін. У гэты час беларускія землі знаходзіліся ў складзе ВКЛ. Вярхоўным уласнікам усёй зямлі ў азначаны час з'яўляўся вялікі князь (гаспадар). Да сярэдзіны XV ст. у яго асабістую уласнасць уваходзілі не толькі спадчынныя, але і дзяржаўныя землі, якія складалі так званы дамен, што ў сярэдзіне XVI ст. займаў амаль палову тэрыторыі дзяржавы. Асноўныя прыбыткі з гаспадарскіх уладанняў ішлі ў дзяржаўны скарб, на патрэбы войска, утрыманне адміністрацыі і вялікакняскага двара.

Уладанні свецкіх і духоўных феадалаў пастаянна пашыраліся за кошт дзяржаўных зямель. З часоў утварэння ВКЛ дамен стаў фондам для ўзнагароджання вялікім князем феадалаў, якія мелі асабістыя заслугі перад дзяржавай. Дастатковая колькасць зямлі з дзяржаўнага фонду пераходзіла ў сферу прыватнага землеўладання. Калі ў канцы XIV ст. на дзяржаўных землях жыла большая частка насельніцтва, то ў першай чвэрці XVI ст. – толькі 1/3 [2, 87].

Рост феадальнага землеўладання ў XV-XVI стст. адбываўся рознымі шляхамі: вялікакняжацкімі падараваннямі, дарэннямі з боку буйных федалаў васалам ці царкве, купляй-продажам, залогам (заставай) і інш. Землі раздаваліся князем на розных умовах: на пэўны час ("да волі", "да жывата"), альбо "на вечнасць" (з правам ці без права продажу). У выніку княскіх падараванняў узнікае новая форма феадальнага землеўладання – ***умоўнае землеўладанне*** (найчасцей, на умове нясення ваеннай службы). Да сярэдзіны XV ст. усе свецкія феадалы, якімі з'яўляліся воіны-рыцыры, называліся баярамі. З XV ст. дробныя землеўладальнікі, якія неслі службу ў вялікага князя ці буйных феадалаў, сталі называцца ***баяры-шляхта, альбо шляхта***. Буйнейшыя спадчынныя ўладальнікі маёнткаў называліся ***магнатамі, альбо панамі***. Некаторыя з іх былі князямі – нашчадкамі Руракавічаў і Гедымінавічаў. Буйныя феадалы ў 1528 г. складалі 19 % ад агульнай колькасці землеўладальнікаў і валодалі 46,4% зямельных угоддзяў. У той жа час дробныя феадалы, якія валодалі не больш чым 18 валокамі зямлі, складалі ў Беларусі 81 %, мелі 53,6 % зямельнага фонду [2, 88].

Правы і прывілеі феадалаў паступова заканадаўча афармляліся. У канцы XVI ст. паны і шляхта былі пароўнены ў правах, а ўсё феадальнае саслоўе стала называцца шляхтай. Асноўным яе абавязкам была ваенная служба. І ў той жа час ёй забаранялася займацца рамяством і гандлем. З цягам часу некаторая частка шляхты беднела і нават страчвала свае землі, але фармальна працягвала належаць да вышэйшага саслоўя.

Буйным землеўледальнікам з'яўлялася і царква, асабліва каталіцкая.

***Развіццё дробнай індывідуальнай гаспадаркі непасрэдных вытворцаў – сялян.*** Пры феадальным ладзе сялянства з'ўлялася асноўнай вытворчай сілай грамадства. Сялянская гаспадарка да сярэдзіны XV ст. была адной з асноўных частак эканомікі краіны. Сялянскі двор меў назву "дым", што азначала звычайную сям'ю, радзей – некалькі сем'яў і іх уласнасць: пабудовы, жывёлу, прылады працы, а таксама зямлю, якой "дым" карыстаўся на падставе звычаёвага права. Дым быў і адной з найдаўнейшых адзінак падаткаабкладання. Назва "дым" мела сінонімы: "хлеб" (адзін хлеб ужываюць), "саха" (адной сахой аруць).

Значную ролю ў сялянскім жыцці адыгрывала абшчына (грамада). Яна арганізоўвала сялянскае землекарыстанне і выплату павіннасцяў. Абшчына доўгі час захоўвала права займацца раскладам павіннасцяў паміж дымамі. У абшчынным карыстанні былі выганы, сенажаці, рыбныя ловы, лясныя ўваходы. Паступова феадалы прысвойвалі сабе права распараджацца абшчыннымі землямі і іншыя функцыі абшчыны.

У працэсе рэалізацыі аграрнай рэформы 1557 г.[21] асноўнай адзінкай падаткаабкладання стала валока[22], сялянская абшчына была аслаблена і нават разбурана (асабліва на захадзе і ў цэнтры Беларусі).

***Статус сялян: ад землеўладальнікаў да землекарыстальнікаў.*** У перыяд станаўлення феадальнай эканомікі вольныя сяляне – абшчыннікі з'яўляліся землеўладальнікамі. Па меры развіцця феадальных адносін доля абшчыннага і сялянскага землеўладання пастаянна змяншалася. У выніку падпарадкавання сялян дзяржаве яны вымушаны былі плаціць ёй даніну. Некаторыя даследчыкі лічаць даніну найстаражытнейшай формай феадальнай рэнты [2, 84]. На нашу думку, гэта не зусім дакладна. ***Феадальная рэнта*** – гэта эканамічная форма рэалізацыі ўласнасці феадала на зямлю і сродак пазаэканамічнага прымусу. Інакш кажучы, – ***гэта частка дадатковага прадукту залежных сялян, якая прысвойваецца землеўладальнікам.*** *Вядома* ***тры формы феадальнай рэнты:*** адпрацовачная (паншчына), прадуктовая (натуральны аброк), грашовая (на Беларусі называлася чыншам). Натуральны аброк (прадукамі земляробства, палявання, рыбнай лоўлі) пераважаў падчас станаўлення феадальных адносін. Паншчына была асноўнай формай феадальных абавязкаў сялян падчас сталага феадалізму і на пачатку яго раскладання. Грашовая рэнта, якая давала сялянам досыць вялікую ступень гаспадарчай самастойнасці, стала пераважаючай у перыяд раскладання феадальнага ладу, калі ўсе дзяржаўныя сяляне былі пера-

---

[21] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча.– Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 90.

[22] **Валока** – асноўная зямельная мера і адзінка абкладання сялян павіннасцямі ў ВКЛ. Валока як адзінка вымярэння плошчы ўваходзіла ў сістэму мер ВКЛ, мела 30 маргоў (21,3 га); гл.: Валока // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Б.І. Сачанка (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1994. – Т. 2. – С. 213.

ведзены на грашовы аброк, і многія памешчыкі таксама свядома пераводзілі сялян на грашовы аброк, а потым наймалі іх на працу з мэтаю павышэння таварнасці сваёй гаспадаркі.

Акрамя абавязкаў у адносінах да свайго гаспадара, сяляне павінны былі таксама працаваць на карысць дзяржавы: будаваць і рамантаваць замкі, дарогі, масты, удзельнічаць у зборах грошай на ваенныя патрэбы.

Сяляне, якія жылі на дзяржаўных землях, мелі права на асабістае карыстанне зямлёю. Рост попыту на збожжа ў краінах Заходняй Еўропы (пры тым, што гаспадарка развівалася на экстэнсіўнай аснове), стымуляваў працэс далейшага запрыгоньвання сялянства. У выніку аграрнай рэформы 1557 г. ("Уставы на валокі") сяляне страчвалі правы на зямельныя ўчасткі, якія традыцыйна лічыліся ў іх спадчынным валоданні.

З мэтаю павышэння даходу ад зямель, уся зямля ў дзяржаўных маёнтках дзялілася на валокі, лепшыя з якіх адводзіліся пад вялікакняжацкія гаспадаркі – ***фальваркі***[23]. Іншыя – раздаваліся сялянам у падворнае землекарыстанне. Сялянская сям'я атрымлівала валоку, ці частку яе, з якой выконвала дакладна ўстаноўленыя павіннасці.

Такую ж рэформу сталі праводзіць у сваіх маёнтках і прыватныя ўласнікі, у выніку чаго на беларускіх землях зацвердзілася ***фальварачна-паншчынная сістэма гаспадаркі***. Стварэнне на ўсход ад Эльбы фальварачна-паншчыннай сістэмы гаспадаркі ўвайшло ў гісторыю як "***другое выданне прыгонніцтва***" (значна больш жорсткае, чым у IX-XV стст.).

***Формы і ступені пазаэканамічнага прымусу сялян.*** Прадуктовая рэнта, якая ўзнікла яшчэ ў час раскладання першабытнабшчынных адносін і фармавання феадальных, узымалася ў розных формах: ***"дзякло"*** (жытам, пшаніцай, аўсом, сенам), ***"мезлева"*** (мясам, яйкамі, прадуктамі бортніцтва і палявання).

Па меры развіцця феадальных адносін у XV-XVI стст. асноўнай формай феадальнай рэнты становіцца паншчына. Для больш эфектыўнага выканання гэтай павіннасці з сярэдзіны XV ст. у Вялікім Княстве Літоўскім уводзяцца абмежаванні на права пераходу ад аднаго землеўладальніка да другога.

***Па ступені феадальнай залежнасці сяляне*** на працягу доўгага часу падзяляліся на чэлядзь нявольную, пахожых і непахожых людзей.

***Пахожыя*** сяляне маглі пераходзіць ад аднаго феадала да другога са згоды гаспадара, пры ўмове выканання ўсіх павіннасцяў.

***Непахожыя*** сяляне жылі ў адным месцы і выконвалі павіннасці па спадчыне. Пахожыя сяляне пры ўмове невыканання павіннасцяў, невыплаце пазык маглі трапіць у катэгорыю непахожых.

***Чэлядзь нявольная*** знаходзілася ў поўнай уласнасці феадала, працавала ў іх маёнтках, але не мела зямельных надзелаў і абслугоўвала дваравую гаспадарку.

У залежнасці ад сутнасці павіннасцяў і ролі ў маёнткавай гаспадарцы сяляне падзяляліся на шэраг катэгорый: цяглых, асадных, агароднікаў і слуг[24].

---

[23] **Фальварак** (польск. folwark, ад ням. vorwerk – хутар) – від феадальнага зямельнага ўладання ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай: двор феадала з комплексам будынкаў і угоддзяў; гл. падрабязней: Фальварак // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: " Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– Мн., 2003. – Т. 6, кн. II. – С. 23.

[24] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча. – Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 95.

Правядзенне аграрнай рэформы 1557 г. і ўпарадкаванне павіннасцяў суправаджалася замацаваннем сялян за зямлёй, пераўтварэннем розных іх катэгорый у адзін клас-саслоўе – прыгоннае сялянства. Такім чынам, на Беларусі ў XV-XVI стст. акрэсленыя формы пачало набываць ***прыгоннае права***[25] (сістэма юрыдычных норм, якія замацоўвалі пазямельную, судовую, асабістую (пазаэканамічны прымус) залежнасць сялян ад феадалаў). Прыгоннае права атрымала і заканадаўчае замацаванне.

***Этапы запрыгоньвання сялянства***

| Этапы | Назва дакумента | Змены ў становішчы сялянства |
|---|---|---|
| I этап | Прывілей (Казіміраў прывілей)1447 г. | пачаў працэс юрыдычнага афармлення прыгоннага права, пацвердзіў даўнее права феадалаў на вотчынны суд. |
| II этап | Судзебнік (Статут) Казіміра 1468 г. | пазбаўляў залежных сялян права свабоднага адыходу ад феадала. |
| III этап | Статут ВКЛ 1529 г. | адмаўляў сялянам у праве ўласнасці на зямлю. |
| IV этап | Аграрная рэформа 1557 г. Жыгімонта II Аўгуста | правядзенне аграрнай рэформы і ўпарадкаванне павіннасцяў суправаджалася замацаваннем сялян за зямлёю, ператварэннем розных іх катэгорый у адзін клас-саслоўе – прыгоннае сялянства. |
| V этап | Статут ВКЛ 1566 г. | уводзіў 10-гадовы тэрмін пошуку беглых ці крадзеных сялян і адміністрацыйныя пакаранні супраць тых, хто іх хаваў. |
| VI этап | Статут ВКЛ 1588 г. | падоўжыў тэрмін пошуку беглых сялян да 20 гадоў, пазбаўляў сялян права пераходу і залічваў у стан непахожых людзей тых, хто пражываў на зямлі феадала 10 гадоў. |

Па меры росту насельніцтва адбывалася здрабненне сялянскіх надзелаў з 1 – ½ валокі да ½ – ¼ валокі. У канцы XVI – першай палове XVII стст. на захадзе Беларусі сярэдні зямельны надзел складаў 0,71 валокі (тут пераважала паншчыннае вядзенне гаспадаркі). На ўсходзе Беларусі сярэдні надзел быў 0,82 валокі, і перавага аддавалася чыншу.

***Перавага аграрнага сектара над гандлёвым і прамысловым.*** Гэтая перавага захоўвалася ўвесь час існавання феадальнага ладу. Сельская гаспадарка з'яўлялася сацыяльна-эканамічнай асновай феадальнага грамадства. Асноўнымі заняткамі насельніцтва заставаліся земляробства і жывёлагадоўля, прычым вядучая роля належала земляробству. Земляробства было асноўным заняткам амаль 90 % насельніцтва.

Для заняткаў земляробствам сяляне спачатку асвойвалі ўрадлівыя землі з прыдатнымі для земляробства глебамі, потым пачалі распрацоўваць лясныя ўчасткі (здзяйснялі вырубку лясоў).

---

[25] Гл. падрабязна: Прыгоннае права // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– 1999. – Т. 5. – С. 581.

У XI-XIII стст. асноўнай сістэмай ***земляробства*** была папаравая сістэма з прымяненнем двухполля, альбо трохполля. З XIV ст. стала пераважаць трохполле, але ў той жа час працягвалі існаваць старыя прымітыўныя сістэмы земляробства.

*Асноўнай галіной сельскай гаспадаркі было раслінаводства. У X-XIII стст. на тэрыторыі Беларусі вырошчвалі амаль усе вядомыя ў наш час збожжавыя культуры: азімае і яравое жыта, ячмень, проса, бабовыя, лён, грэчку, капусту, рэпу, цыбулю, буракі. У XIII-XV стст. актыўна вырошчвалі моркву, часнок, каноплі. Існавала і садоўніцтва: вырошчвалі вішні, слівы і іншую садавіну. Ураджай збожжа быў сам 3-4, а на ўгноенных палетках сам 4-5 (гэта значыць, што збіралі ўраджаю ў 3-4, або ў 4-5 разоў больш, чым сеялі).*

***Жывёлагадоўля*** забяспечвала мясны рацыён насельніцтва і абслугоўвала патрэбы земляробчай галіны. Разводзілі свіней, буйную рагатую жывёлу, займаліся птушкагадоўляй (куры, качкі, гусі). Важную ролю адыгрывала развядзенне коней. У якасці цяглавай сілы на захадзе Беларусі больш выкарыстоўвалі валоў, на ўсходзе – коней. Жывёлагадоўля давала не толькі мяса і малочныя прадукты, якія ўжывалі ў ежу, але і ўгнаенне, якое павялічвала ўраджайнасць.

Пэўнае месца ў гаспадарцы, асабліва для некаторых населеных пунктаў, займала паляванне на буйную дзікую жывёлу. На больш дробную дзікую жывёлу і на птушак таксама палявалі паўсюдна.

Як сельскае, так і гарадское насельніцтва займалася ***промысламі***. Самым распаўсюджаным відам промыслу з'яўлялася рыбалоўства. Захоўвалі пэўную ролю бортніцтва, збор грыбоў, ягад і іншых дзікарослых пладоў. Самымі распаўсюджанымі хатнімі промысламі былі прадзенне і ткацтва.

***Рамяство***. У перыяд станаўлення феадальных адносін адбываўся працэс выдзялення рамяства як важнейшай галіны эканамічнага жыцця. У IX-XII стст. самымі распаўсюджанымі відамі рамеснай дзейнасці ў сельскай мясцовасці з'яўляліся ганчарства, кавальская справа, металургія, ювелірная справа.

З працэсам развіцця рамяства і аддзяленнем яго ад сельскай гаспадаркі звязаны і працэс узнікнення і росту гарадоў. У гарадскім рамястве вядучую ролю адыгрывалі кавальская справа, ювелірная справа, апрацоўка бурштыну, ганчарства, вытворчасць плінфы (старажытнай цэглы), апрацоўка драўніны, косці, каменю, гарбарная і шавецкая вытворчасць.

З XIII ст. у ВКЛ, як і ва ўсёй Еўропе, ідзе працэс актыўнага развіцця рамяства і гандлю. Гэтаму спрыяў рост прадукцыйнасці сельскагаспадарчай працы і прыбавачнага прадукту, які дазваляў пракарміць значную частку насельніцтва, не звязаную з сельскагаспадарчай вытворчасцю. Цэнтрамі рамяства і гандлю становяцца гарады і мястэчкі (невялікія паселішчы гарадскога тыпу). Імкнучыся пазбавіцца ад феадальнай залежнасці, гарады змагаюцца за Магдэбургскае права[26].

*Сярод гарадскіх рамеснікаў вялікую вядомасць набываюць ганчары. Акрамя посуду, значна пашыралася вытворчасць цэглы, чарапіцы, кафлі, што было*

---

[26] **Магдэбургскае права** – феадальнае гарадское права, якое ўзнікла ў XIII ст. у г. Магдэбург і дзейнічала ў гарадах Усходняй Германіі, Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Гл.: Магдэбургскае права // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– 1999. – Т.5. – С. 5.

*выклікана пашырэннем маштабаў будаўніцтва. Развівалася апрацоўка скур і рамёстваў, звязаных з гэтым. У гарбарнай вытворчасці было каля 25 прафесій. Вырабы ганчарства, скура і замша карысталіся попытам не толькі на ўнутраным, але і на знешнім рынку, вывозіліся ў Польшчу і Заходнюю Еўропу. Вядомы былі і іншыя рамесныя спецыяльнасці: піваварь, мяснікі, муляры, скрыннікі, рэзнікі і інш.*

У другой палове XVI ст. большая частка насельніцтва беларускіх гарадоў займалася рамяством, дакументы згадваюць у гарадах больш за 100 прафесій і спецыяльнасцяў [2, 96]. Для абароны сваіх інтарэсаў рамеснікі па прыкладу Заходняй Еўропы аб'ядноўваюцца ў так званыя цэхі, а купцы ствараюць свае аб'яднанні – брацтвы ці гільдыі[27].

***Натуральны характар гаспадаркі.*** Вотчына, якая ўзнікае на этапе ранняга феадалізму, з'яўлялася адасобленай эканамічнай адзінкай, амаль не звязанай з суседнімі гаспадаркамі, з горадам, чым і тлумачыцца агульны натуральны характар гаспадаркі ў эпоху феадалізму. Вотчынная гаспадарка арыентавалася ў асноўным на ўласныя патрэбы і ўласныя рэсурсы, што вяло да замацавання арыентацыі на эканамічную самадастатковасць. На этапе ранняга феадалізму, ва ўмовах панавання натуральнай гаспадаркі, гандаль выяўляўся галоўным чынам у продажу лішкаў прадуктаў феадальнымі вотчынамі, альбо сялянамі з таго, што ў іх заставалася пасля задавальнення ўласных запатрабаванняў. Найбольш развітымі былі сувязі паміж горадам і вёскай. З вёскі дастаўляліся сельскагаспадарчыя прадукты і сыравіна для рамеснай вытворчасці. Вырабы гарадскіх рамеснікаў збываліся сярод вясковага насельніцтва.

У XIII-XV стст., калі вялікія князі сталі актыўна раздаваць дзяржаўныя землі прыватным уладальнікам, гэтыя землеўладальнікі доўгі час не мелі магчымасці і патрэбы заводзіць сваю гаспадарку, а задавольваліся аброкам з сялян. Толькі з сярэдзіны XV ст. з'явіліся першыя феадальныя гаспадаркі, арыентаваныя на вытворчасць таварнай прадукцыі [4, 184]. З умацаваннем ВКЛ і паступовай цэнтралізацыяй дзяржавы, прыблізна з кан. XIV – пач. XV стст. фармуецца агульнадзяржаўны ўнутраны рынак княства. У гарадах і мястэчках рэгулярнымі становяцца кірмашы, куды прыязджаюць не толькі мясцовыя гандляры, але і купцы з замежжа. Цэнтрамі гандлю становяцца гарады, забяспечаныя правам на самакіраванне.

Міжнародны гандаль у IX-XIII стст. быў развіты слаба. Найбольш актыўны гандлёвы абмен вёўся з паўднёварускімі гарадамі (Кіевам і іншымі), з Візантыяй, гарадамі Прычарнамор'я. Асноўнымі экспартнымі таварамі для беларускіх зямель былі футра, мёд, воск, смала, лён і вырабы з яго, разная косць. З паўднёварускіх гарадоў везлі вырабы са шкла (шкляныя бранзалеты), з Прычарнамор'я – амфары з віном і алеем, з Каўказа прывозілі самшыт, з якога выразалі грабяні. З Візантыі, Блізкага Ўсходу і Пярэдняй Азіі прывозіўся шыкоўны шкляны посуд, з Персіі – фаянсавы посуд, з Арабскага Ўсходу – дарагія тканіны. З Ноўгарада і Прыбалтыкі на беларускія землі трапялі вырабы заходне-

---

[27]Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча.– Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996 – С. 96.

еўрапейскіх майстроў (посуд з металу, зброя). Асноўнымі шляхамі зносін у старажытнасці былі водныя. Для Полацкай зямлі найбольшае значэнне меў шлях "з варагаў у грэкі", які звязваў Заходнюю Еўропу, краіны Прыбалтыкі з Прычарнамор'ем.

*У грашовым абарачэнні Беларусі ў IX-XI стст. былі арабскія срэбныя манеты (дырхемы), срэбныя манеты з Германіі, Англіі, Чэхіі, Францыі (дэнарыі). Ужываліся і грошы агульнаславянскага паходжання, якія чаканіліся ў Кіеве (срэбранікі і златнікі). У XII-XIII стст. на Беларусі быў безманетны перыяд, таму ў абарачэнні хадзілі плацёжныя злiткі са срэбра (грыўні, рублі).*

*Пасля крыжовых паходаў і каланізацыі нямецкімі рыцарамі польскіх, латышскіх і эстонскіх зямель ствараюцца перадумовы для ўзнікнення новага напрамку міжнароднага гандлю –* ***Ганзейскага****: па Балтыйскаму і Паўночнаму марам. Тут ствараецца* ***Ганзейскі саюз***[28]*, дзякуючы чаму, ў гандлёвыя сувязі з Еўропай уключаюцца польскія, беларускія, рускія землі.*

**Нізкі стан прылад працы і тэхнікі земляробства**. Пры феадалізме тэхнічны прагрэс здзяйсняўся вельмі павольна. Земляробства вялося ў адпаведнасці са склаўшыміся на працягу стагоддзяў традыцыямі, і земляробчая тэхніка таксама не мянялася стагоддзямі.

*Ворныя прылады ў сярэднявеччы выраблялі з дрэва. Металічнымі былі толькі асобныя іх часткі. Ужывалася рала з металічным наральнікам, у IX ст. з'явілася драўляная саха з двума металічнымі наральнікамі. Апрача ворных, выкарыстоўваліся прылады ручной апрацоўкі глебы: драўляныя рыдлёўкі з металічнымі акоўкамі і металічныя матыкі. Ураджай збіралі металічнымі сярпамі. Формы сярпоў, якія з'явіліся ў IX-XIII стст., амаль не змяніліся да XIX-XX стст. Зерне намалочвалі драўлянымі цапамі. Лён і каноплі апрацоўвалі на ільномялках, часалі вялікімі драўлянымі грабянямі. На муку зерне малолі з дапамогаю каменных жорнаў. Крупу выраблялі ў нажных і ручных ступах. Алей выціскалі простымі прэсамі.*

## Літаратура


1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. / В. Вяргей [і інш.]. – 2000.

2. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнай рэд. В.І. Галубовіча.– Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996.

3. Грузицкий, Ю.Л. Экономическая история Беларуси и зарубежных стран. Методические рекомендации по подготовке к экзамену / Ю.Л. Грузицкий. – Мн.: НКФ "Экоперспектива", 1996.

4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т. 2: Беларусь у перыяд ВКЛ / Ю. Бохан [і інш.]. – 2008.

5. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. – Ч. 1: Ад старажытных часоў – па люты 1917 г.


---

[28] **Ганза** – (Hansa – ням. саюз, таварыства) – гандлёвы саюз купецтва паўночна-еўрапейскіх гарадоў з цэнтрам ў Любеке, які здзяйсняў сваю дзейнасць у басейне Паўночнага і Балтыйскага мораў. У саюз увайшлі анямечаныя гарады Шчэцын, Гданьск, Рыга, Рэвель, як пастаўшчыкі збожжа. У абарот ганзейскага гандлю паступалі воўна з Англіі, рыба, лес, жалеза – са Швецыі, збожжа і бурштын – з Балтыкі, пушніна, мёд і воск – з рускай Поўначы.

## Раздзел III. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРЫЯД КАПІТАЛІЗМУ: ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ

### Што такое "капіталізм"?

Перыяд існавання на беларускіх землях капіталізму як грамадска-эканамічнай фармацыі адлюстроўваецца ў большасці падручнікаў, якія вызначаны намі ў папярэднім раздзеле, а таксама досыць падрабязна – ў трэцім і чацвёртым тамах шматтомнай "Гісторыі Беларусі"[29].

"Энцыклапедыя гісторыі Беларусі" дае наступнае вызначэнне капіталізму: "***Капіталізм*** – гэта грамадска-эканамічная фармацыя, заснаваная на прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці і эксплуатацыі наёмнай працы капіталам. Асноўныя рысы капіталізму:

– панаванне таварна-грашовых адносін і прыватнай уласнасці на сродкі вытворчасці;
– наяўнасць развітога грамадскага падзелу працы;
– рост аграмаджэння вытворчасці;
– ператварэнне рабочай сілы ў тавар;
– эксплуатацыя наёмных рабочых капіталістамі[30], (прычым капіталізм вызначаецца панаваннем эканамічнага прымусу, у адрозненне ад форм пазаэканамічнага прымусу, уласцівых для феадалізма і рабаўладальніцтва).

Развіцце і зацвярджэнне капіталізму пачалося ў перыяд гісторыі, які прынята называць "новым часам"[31]. На беларускіх землях станаўленне капіталістычных адносін пачынаецца значна пазней. Калі фармаванне і развіццё феадалізму на беларускіх землях ішло амаль паралельна з гэтым жа працэсам у Заходняй Еўропе, то ў эпоху новага часу праявілася адставанне нашага рэгіёна ад заходнееўрапейскага па многім паказчыкам, найперш у эканамічным сэнсе. Напэўна, першым пытаннем, на якое патрэбна даць адказ, будзе пытанне аб прычынах больш позняга складвання перадумоў для фармавання капіталістычных адносін на беларускіх землях. І толькі пасля гэтага можна будзе вызначыць храналагічныя рамкі перыяду капіталізму і асаблівасці станаўлення капіталістычных адносін на Беларусі.

### Чаму станаўленне капіталістычных адносін на беларускіх землях пачынаецца пазней, чым у Заходняй Еўропе?

Да XVI ст. у краінах Заходняй Еўропы склаліся перадумовы для зацвярджэння капіталізму[32]. ***Адраджэнне, Вялікая навуковая рэвалюцыя XV-XVII стст. і Рэфармацыя*** ідэйна падрыхтавалі зацвярджэнне капіталізму. А матэрыяльныя перадумовы для зацвярджэння новага грамадска-эканамічнага ладу

[29] Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва" 2000-2008. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 343 с.; Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Экаперспектыва", 2000-2008. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (кан. XVIII – пач. XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 519 с.

[30] Гл. падрабязна: Капіталізм // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1997. – Т. 4.– С. 98.

[31] Новы час – перыяд гісторыі, які пачынаецца з XV ст. і доўжыцца да заканчэння Першай сусветнай вайны (1918 г.). Гл.: Новая і навейшая гісторыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1999. – Т. 5. – С. 329.

[32] Гл. падрабязна: Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В.Стралец, Л.Ю.Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – С. 51.

стварылі Вялікія геаграфічныя адкрыцці, якія за кароткі тэрмін улілі ў эканоміку хрысціянскага Захаду велізарныя рэсурсы. Вялікія геаграфічныя адкрыцці прывялі да пашырэння сусветнага рынку, уключылі ў тавараззварот новыя, раней невядомыя еўрапейцам тавары, садзейнічалі ўзнікненню новых цэнтраў міжнароднага гандлю вексялямі, валютай, таварамі, перамясцілі гандлёвыя шляхі ў акіяны, паклалі пачатак каланізацыі адкрытых тэрыторый. Гэтыя наступствы ВГА істотна паскорылі працэс ***першапачатковага накаплення капіталу (ПНК), які лічыцца зыходным пунктам зацвярджэння капіталізму***. У аснове першапачатковага накаплення капіталу ляжала аддзяленне дробнага вытворцы ад уласных сродкаў вытворчасці і яго пераўтварэнне ў наёмнага рабочага.

Для арганізацыі капіталістычнай вытворчасці былі неабходны дзве ўмовы:

1) наяўнасць юрыдычна свабодных людзей, пазбаўленых сродкаў вытворчасці і вымушаных прадаваць сваю рабочую сілу;

2) накапленне грашовых сродкаў у руках пэўнай групы прадпрымальнікаў (купцоў, ліхвяроў, цэхавых майстроў).

Вялікія геаграфічныя адкрыцці якраз і садзейнічалі ўтварэнню гэтых умоў. У дадатак да пералічаных вышэй наступстваў ВГА, трэба згадаць і пра так званую “рэвалюцыю цэн”[33], якая змяніла эканамічную сітуацыю ў еўрапейскіх дзяржавах. Падзенне рэальных заробкаў у шэрагу дзяржаў садзейнічала павышэнню прыбыткаў капіталістаў. Абясцэньванне грашовых сродкаў дваранства вяло да заняпаду ўсёй феадальнай сістэмы. Павышэнне цэн на тавары выклікала разарэнне дробных вытворцаў.[34]

Найбольш актыўна фармаванне капіталістычных вытворчых адносін ішло ў краінах, якія мелі выгаднае геаграфічнае становішча – знаходзіліся ў цэнтры шляхоў сусветнага гандлю (Галандыя, Англія).

Працэс станаўлення капіталізму на беларускіх землях пачаўся значна пазней, чым у Заходняй Еўропе. Нягледзячы на тое, што ў культурным сэнсе беларускія землі знаходзіліся пад пераважным уплывам заходняй культурнай традыцыі (тут актыўна распаўсюджваліся і адыгрывалі важную ролю ў развіцці культуры ідэі Адраджэння і Рэфармацыі), у сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі панавалі зусім іншыя тэндэнцыі.

Беларускія землі ў XVI ст. былі ў складзе ВКЛ, а ў другой палове XVI ст. ўвайшлі у склад Рэчы Паспалітай, якая з’яўлялася кантынентальнай краінай і, як і іншыя кантынентальныя краіны, знаходзілася далёка ад асноўных гандлёвых шляхоў, не мела калоній, не магла выкарыстоўваць тыя формы першапачатковага назапашвання капіталу, якія выкарыстоўвалі, напрыклад, Галандыя і Англія (знешні гандаль і, у тым ліку, гандаль рабамі, пірацтва, рабаванне калоній і інш.). Калі ў XVI ст. у Заходняй Еўропе пачаўся працэс генезісу капіталізму, Усходняй Еўропе, у адпаведнасці са склаўшымся сусветным падзелам працы, была адведзена роля “аграрнай перыферыі” Заходняй Еўропы. З зямель, якія размяшчаліся на ўсход ад Эльбы (ВКЛ, Польшча, Усходняя Прусія) на

[33] **“Рэвалюцыя цэн”** была выклікана наплывам каштоўных металаў у Еўропу (золата і серабра). За стагоддзе колькасць каштоўных металаў павялічылася амаль утрая. Пры гэтым золата і серабро былі атрыманы ў калоніях на аснове прымусовай, бясплатнай працы абарыгенаў. Таму грошы з высакародных металаў значна патаннелі, а цэны на тавары адпаведным чынам узраслі.

[34] Трэба згадаць, што працэс юрыдычнага вызвалення залежных сялян пачаўся ў Заходняй Еўропе значна раней у выніку **камутацыі** рэнты (перавода павіннасцяў у грашовую форму).

захад вывозілася сельскагаспадарчая прадукцыя. Рост попыту на збожжа ў краінах Заходняй Еўропы (пры тым, што гаспадарка развівалася на экстэнсіўнай аснове), стымуляваў працэс далейшага запрыгоньвання сялянства, прымацавання яго да зямлі і стварэння фальваркаў. Асноўныя вытворцы матэрыяльных даброт – сяляне – заставаліся фактычна і юрыдычна несвабоднымі аж да XIX ст. Такім чынам, на беларускіх землях у XVI-XVII стст. працэс першапачатковага назапашвання капіталу не змог рэалізавацца.

Да таго ж і ў палітычным жыцці беларускіх зямель панавалі зусім іншыя тэндэнцыі, чым у Заходняй Еўропе. Нідэрландская і Англійская рэвалюцыя паклалі пачатак эры ***буржуазных рэвалюцый***[35]. Рэч Паспалітая таксама перажыла крызіс абсалютызму, што, як вядома, у краінах Заходняй Еўропы было праявай фармавання перадіндустрыяльнай цывілізацыі. Але гэты крызіс завяршыўся не ўсталяваннем буржуазнай дэмакратыі (як у краінах Заходняй Еўропы), а зацвярджэннем "шляхецкай рэспублікі". Шляхецкая анархія ў далейшым перашкаджала фармаванню капіталістычных адносін і стабільнаму эканамічнаму развіццю краіны, а слабая каралеўская ўлада не праяўляла зацікаўленасці ў правядзенні ***меркантылісцкай палітыкі***[36].

## Калі пачынаецца працэс станаўлення капіталістычных адносін на беларускіх землях?

На Беларусі вылучаюць два асноўныя перыяды эвалюцыі капіталізму: 1) генезіс капіталістычных адносін (XVI ст. – 1861 г.); 2) усталяванне капіталістычнай фармацыі (1861-1917 гг.). Генезіс капіталізму таксама мае два этапы: 1) узнікненне і пашырэнне капіталістычных адносін (XVI – сярэдзіна XVIII ст.); 2) станаўленне капіталістычнага ўкладу (1861-1917 гг.)[37]. На першым этапе пракапіталістычныя тэндэнцыі ў сацыяльна-эканамічным развіцці праяўляюцца ў росце рыначных сувязей, спецыялізацыі рамяства, што служыла глебай для яго каапeрацыі, развіцці крэдытных аперацый, якія паскаралі маёмасную дыферэнцыяцыю рамеснікаў, выкарыстанні багатымі рамеснікамі і купцамі наёмнай працы, развіцці промыслаў (буды, смалакурні, рудні, цагельні, сукнавальні) у мястэчках і гарадах. У другой палове XVII – першай палове XVIII ст. ў выніку глыбокага заняпаду эканомікі Беларусі, выкліканага шматлікімі войнамі, працэсы развіцця капіталізму запаволіліся.

Новыя праявы станаўлення капіталістычных адносін на беларускіх землях вызначаюцца ў другой палове XVIII ст., у працэсе пераадолення эканамічнага заняпаду. У эканаміцы РП відавочна пашыраюцца таварна-грашовыя адносіны:

---

[35] **Буржуазная рэвалюцыя** – гэта тып сацыяльнай рэвалюцыі, якая аб'ектыўна накіравана на ліквідацыю феадалізму і ўсталяванне палітычнай улады буржуазіі, стварэнне ўмоў для развіцця капіталізму. Не мяняючы карэнным чынам прыватнага характару ўласнасці на сродкі вытворчасці, буржуазная рэвалюцыя здымае з яе абмежаванні і надае першаступеннае значэнне фінансаваму і прамысловаму капіталу. На гэтай аснове ствараецца новы тып рынку – капіталістычны. Новая сацыяльная сіла, што прыходзіць да ўлады ў выніку буржуазнай рэвалюцыі, кардынальна мяняе форму дзяржаўнага ладу: на змену абсалютысцкай манархіі прыходзіць абмежаваная (канстытуцыйная) манархія, або рэспубліка. Першай пераможнай буржуазнай рэвалюцыяй была Нідэрландская (1566-1609), другой – Англійская (1640-1688). Гл.: Буржуазная рэвалюцыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. кал.: Б.І. Сачанка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– Мн., 1994. – Т. 2. – С. 138-139.

[36] **Меркантылізм** (іт. mercante – гандляр) – палітыка нацыянальных дзяржаў, накіраваная на павелічэнне грошай ў казне і дасягненне актыўнага гандлёвага балансу за кошт развіцця мануфактур і росту, тым самым, экспарту гатовых вырабаў, захопу галоўных шляхоў заморскага гандлю і каланіяльных кампаній.

[37] Гл. падрабязна: Капіталізм // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – Т. 4. – С. 100.

1) актывізуецца экспарт збожжа ў Заходнюю Еўропу, што было абумоўлена ростам цэн на гэты прадукт на знешнім рынку у 3-4 разы. У другой палове XVIII ст. сельскагаспадарчая прадукцыя складала 80 % усіх тавараў Вялікага княства Літоўскага, якія вывозіліся за мяжу [1, 170; 201];

2) з мэтаю павелічэння вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ў працэсе аграрнай рэформы надворнага падскарбія ВКЛ Антонія Тызенгаўза аднаўляюцца фальваркі, якія спынілі сваё існаванне ў гады войн і эканамічнага крызісу;

3) у маёнтках буйных феадалаў (латыфундыях)[38] адбываецца рэарганізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці (укараняюцца шматпольныя севазвароты, дасягненні агранамічнай навукі, у абмежаваных памерах выкарыстоўваецца праца наёмных рабочых). Амаль 70 % усяго збожжавага экспарту ВКЛ прыходзілася на долю буйных прыватнаўласніцкіх гаспадарак [1, 176];

4) развіваюцца прамысловыя заняткі: у буйных маёнтках ствараюцца вінакурні (бровары), млыны, алейні (маслабойні), фолюшы (сукнавальні);

5) па прычыне росту попыту на лесаматэрыялы ў Заходняй Еўропе, развіваецца лясны промысел, арыентаваны на знешні рынак (нарыхтоўка тАварнага лесу, лесаматэрыялаў, паташны[39] промысел);

6) актыўна развіваецца гандаль з Заходняй Еўропай, у якім вялікую ролю адыгрываюць нёманскі і заходнедзвінскі водныя шляхі. З захаду імпартуюцца як рэчы асабістага карыстання, так і тавары масавага попыту і вытворчага прызначэння;

7) Антоніям Тызенгаўзам у 60-70-я гг. XVIII ст. ствараецца больш за 20 буйных прамысловых прадпрыемстваў у каралеўскіх эканоміях[40].

*Першым прадпрыемствам мануфактурнага тыпу была шкляная мануфактура ў Налібоках (зараз Стаўбцоўскі раён Мінскай вобласці). Яна была пабудавана ў пачатку 20-х гг. XVIII ст. жонкай канцлера ВКЛ Ганнай Радзівіл. У наступны час з'яўляецца яшчэ шэраг вотчынных мануфактур[41], якія цяжка лічыць ў поўным сэнсе гэтага слова капіталістычнымі прадпрыемствамі[42]. Да канца XVIII ст. ў Беларусі ўжо налічвалася (без вінакурных і піваварных) звыш 250 прадпрыемстваў, акрэсленых як "фабрыкі"і "заводы", многія з якіх узніклі да падзелаў Рэчы Паспалітай [1, 199];*

8) актыўна развіваецца ўнутраны гандаль. Прычым, калі знешні гандаль сельскагаспадарчымі прадукатамі знаходзіўся пераважна ў руках магнатаў, галоўнымі пастаўшчыкамі іх на ўнутраны рынак былі сяляне. Развіццю ўнутранага гандлю садзейнічалі мерапрыемствы ўрада па развіццю гандлю і шляхоў зносін (будаўніцтва трактаў і каналаў, усталяванне адзіных для ВКЛ мер вагі,

---

[38] **Латыфундыі** (лац. latifundium) вялікае прыватнаўласніцкае зямельнае ўладанне пераважна з паўфеадальнымі формамі эксплуатацыі працы (Гл.: Латыфундыя // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1997. – Т. 4. – С. 337-338).

[39] **Паташ** – рэчыва ў выглядзе белага зярністага парашку са шчолачнымі ўласцівасцямі, якое атрымлівалі з попелу.

[40] **Эканоміі** – феадальныя зямельныя ўладанні ў Рэчы Паспалітай, выдзеленыя ў канцы XVIII ст. з дзяржаўных земляў для задавальнення патрэб караля і прыдворнай казны. Мелі ўласнае адміністрацыйна-гаспадарчае кіраванне. На Беларусі існавалі Брэсцкая, Гродзенская, Пінская і Слонімская эканоміі. (Гл.: Эканомія // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 2003. – Т. 6, кн. II. – С. 252).

[41] **Вотчынныя мануфактуры** – прадпрыемствы мануфактурнага тыпу, якія абслугоўваліся прымусовай працай прыгонных сялян, выкарыстоўвалі рамесную тэхніку і былі заснаваны на кааперацыі і тэхнічным падзеле працы.

[42] У 1751 г. князь Міхаіл Казімір Радзівіл заснаваў у Слуцку фабрыку паясоў. У Ружанах з'явіліся суконная і палатняная фабрыкі князя Сапегі, у мястэчку Ілля (Мінскі павет) – шкляны завод графа Салагуба, у маёнтку Мыш (Навагрудскі павет) – шкляны завод гетмана Масальскага. Прадпрыемствы, акрэсленыя як "фабрыкі" і "заводы", амаль не адрозніваліся ад звычайных майстэрняў па велічыні, аб'ёму вытворчасці і арганізацыі працы, на большасці з іх выкарыстоўвалася праца прыгонных сялян [6, 114-115].

аб'ёму і даўжыні, увядзенне "генеральнай мытнай пошліны", абавязковай для ўсіх, у тым ліку і для шляхты, духавенства і караля, якія раней яе не плацілі.

*У другой палове XVIII ст. праз палескія балоты пракладваюцца пінска-слонімскі і пінска-валынскі тракты. Па рашэнні Скарбавай камісіі праводзяцца работы па ачыстцы і рэгуліроўцы рэк, збудаванні рачных партоў, будаўніцтве дарог і мастоў. У 1775 г. скончана будаўніцтва Вялікага Пінскага канала (канала Агінскага), які праз Шчару, Ясельду і Прыпяць злучыў Нёман з Дняпром. У 1775-1783 гг. быў пабудаваны другі канал (меў назву Каралеўскага, а потым называўся Дняпроўска-Бугскім), які адкрываў шлях з Прыпяці ў Заходні Буг і, тым самым, злучаў Вісленскі і Дняпроўскі басейны.*

Уваходжанне беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі і іх уключэнне ў агульнарасійскі рынак, з аднаго боку, стымулявала далейшы рост таварнасці сельскай гаспадаркі, а з другога боку, вяло да кансервацыі феадальна-прыгонніцкіх адносін.

Імкненне памешчыкаў павысіць прыбытковасць сваіх гаспадарак вымушала іх выкарыстоўваць удасканаленыя сельскагаспадарчыя машыны, працу наёмных рабочых, уводзіць травасеянне і шматпольныя севазвароты. Гэта сведчыла аб далейшым развіцці капіталістычных адносін у нетрах феадальнай эканомікі.

*Асновай гаспадаркі памешчыкаў заставалася ворнае земляробства. З другой паловы XVIII ст. пануючай сістэмай яго стала папарнае трохполле. З пашырэннем пасеваў бульбы ў многіх маёнтках яно змянялася чатырохполлем. З развіццём тонкарунай авечкагадоўлі, галоўным чынам на захадзе Беларусі, у некаторых панскіх гаспадарках з'явілася шматполле з травасеяннем. Шырэй ужываліся новыя агратэхнічныя прыёмы (зяблевае ворыва, прапалка, вапнаванне глебы), паляпшалася ўгнаенне палёў. У некаторых гаспадарках ужываліся ўдасканаленныя прылады (плугі, жалезныя бароны). Сеялкі, жняяркі, сенакасілкі сустракаліся рэдка. Многія памешчыкі, разумеючы перавагу наёмнай працы, пераводзілі сялян на грашовы аброк і дазвалялі займацца адыходніцтвам[43], ці самі наймалі іх на працу. У канцы XVIII ст. у магнацкай сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі наёмная рабочая сіла склала 17,2 %, Усходняй Беларусі – 7,4 % [3, 125].*

У эпоху позняга феадалізму наёмная праца не ўяўляла яшчэ альтэрнатывы паншчыне, а толькі спадарожнічала ёй. Ва ўмовах захавання экстэнсіўнага характару развіцця сельскай гаспадаркі росту таварнай прадукцыі большасць памешчыкаў дасягалі шляхам пашырэння плошчы фальваркавай ворнай зямлі. Гэта здзяйснялася як шляхам асваення новых зямель, так і ў выніку захопу сялянскіх угоддзяў. Пашырэнне плошчы фальваркавай ворнай зямлі вяло да ўзмацнення феадальнага прыгнёту сялянства, павелічэння адпрацовачных павіннасцяў.

Выключна цяжкім заставалася і становішча дзяржаўных сялян (іх колькасць складала 21 % сялянства), таму што амаль ўсе дзяржаўныя маёнткі здаваліся з публічных таргоў у доўгатэрміновую арэнду чыноўнікам, дробнай шляхце. З мэтаю пераадолення крызісных з'яў феадальна-прыгонніцкай сістэмы царскія ўлады рэалізуюць спробы гаспадарчых рэформ. У снежні 1839 г. пачалася пера-

[43] **Адыходніцтва** – часовы адыход сялян з вёсак у гарады на прамысловыя прадпрыемствы, сельскагаспадарчыя работы свайго і іншых рэгіёнаў краіны, а таксама за мяжу. (Гл.: Адыходніцтва // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі".– 1993. – Т. 1. – С. 63-64).

будова ***адміністрацыйна-гаспадарчага кіравання дзяржаўнай вёскай заходніх губерняў***. Яна з'яўлялася састаўной часткай агульнарасійскай ***рэформы П.Д. Кісялёва***, якая была накіравана на прыпыненне працэсу абеззямельвання і збяднення дзяржаўных сялян, змяншэнне сацыяльнай напружанасці ў вёсцы. У Беларусі і іншых "заходніх губернях" рэформа па сацыяльна-эканамічным змесце была больш глыбокая, чым у цэнтральнай Расіі. Гэта тлумачыцца асаблівай вастрынёй сялянскага пытання ў гэтым рэгіёне і тым, што царызм баяўся зліцця сялянскіх хваляванняў з нацыянальна-вызваленчым рухам.

***У працэсе рэалізацыі рэформы:***

- ***праводзілася люстрацыя*** (падрабязнае апісанне маёнткаў і вызначэнне памераў сялянскага землекарыстання і павіннасцяў). Люстрацыя павінна была прывесці "ў вядомасць" дзяржаўную маёмасць, ліквідаваць сялянскае малазямелле, рэгламентаваць падатковы прыгнёт, дамагчыся росту плацёжаздольнасці дзяржаўнай вёскі. Люстрацыя праводзілася ў 2 этапы: 1) да 1844 г. – пры захаванні фальварачна-паншчыннай сістэмы; 2) з 1844 г. – шляхам паскоранага пераводу сялян дзяржаўных маёнткаў на аброк, знішчэння фальварачна-паншчыннай сістэмы. Да 1857 г. на аброк былі пераведзены ўсе дзяржаўныя мёнткі Мінскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай губерняў. Адмова ад прыгонніцкай сістэмы і перавод дзяржаўных сялян на аброк – галоўныя вынікі люстрацыі, што вызначыла яе буржуазна-прагрэсіўны характар;

- ***здзяйснялася перабудова кіравання дзяржаўнай вёскай***. Агульнакіраўнічыя функцыі, якія раней былі сканцэнтраваны ў Дэпартаменце дзяржаўных маёмасцей міністэрства фінансаў з 01.01.1838 г. перадаваліся новаму міністэрству дзяржаўных маёмасцяў (міністр Кісялёў). На Беларусі ўстанаўліваліся 3 адміністратыўныя ярусы кіравання дзяржаўнай вёскай: губерня – акруга – сельскае ўпраўленне. Функцыі валасной адміністрацыі былі размеркаваны паміж часовымі ўладальнікамі і сялянскімі выбарнымі. Новая адміністрацыя ўпарадкавала кіраванне дзяржаўнымі маёнткамі, увяла жорсткі кантроль за часовымі ўладальнікамі, павысіла статус сялянскіх грамад;

- ***рэалізоўвалася палітыка "апякунства"*** над дзяржаўнымі сялянамі, якая ўключала арганізацыю прыходскіх школ, развіццё сістэмы медыцынскай дапамогі, стварэнне ўзорных маёнткаў, арганізацыю харчовай дапамогі сялянам праз спецыяльна пабудаваныя хлебныя магазіны і г. д.

Рэформа палепшыла становішча дзяржаўных сялян. У выніку правядзення люстрацыі павіннасці казённых сялян Віцебскай і Магілёўскай губерняў зменшыліся на 62-65 %, Гродзенскай і Мінскай – на 30-35 %, зямельныя надзелы ў апошніх губернях павялічыліся на 32-36, у Магілёўскай – на 15 % [3, 111]. Рэформа надала імпульс сялянскай ініцыятыве, спрыяла пашырэнню таварна-грашовых адносін і стварэнню рынка наёмнай рабочай сілы. Адбыліся перамены ў прававым становішчы дзяржаўных сялян (за дзяржаўнымі сялянамі прызнаваліся грамадзянскія свабоды, што выгадна адрознівала іх ад памешчыцкіх падданых). У прыватнаўласніцкіх маёнтках урад Расійскай імперыі у 1840-1850 гг. праводзіў інвентарную рэформу, якой імкнуўся вызначыць памер сялянскіх надзелаў і абмежаваць рост павіннасцяў, але рэформа была праведзена толькі часткова. Наогул, захаванне прыгонніцтва перашкаджала працэсу капіталізацыі сельскай гаспадаркі, скоўвала развіццё прамысловасці. Толькі правядзенне сялянскай рэформы 1861 г. расчысціла шлях для свабоднага развіцця капіталістычных адносін.

## Якім чынам рэалізоўвалася рэформа 1861 г. на Беларусі?

Ва ўмовах крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы для пераадолення адставання Расіі ад краін Захаду (што яскрава прявілася ў паражэнні Расіі ў Крымскай вайне 1853-1856 гг.) царскі ўрад пайшоў на рэалізацыю шэрагу буржуазных рэформаў, першай з якіх стала сялянская. ***Сялянская рэформа 1861 г.***, асноўныя пачаткі якой былі выкладзены ў Маніфесце Аляксандра II ад 19 лютага 1861 г., скасавала прыгоннае права і кардынальна змяніла становішча сялян. Асабістыя, маёмасныя правы сялян, парадак кіравання сялянамі і выканання імі казённых, земскіх і грамадскіх павіннасцяў, а таксама правілы аб выкупе зямлі, выкладзеныя ў ***"Агульным палажэнні"***, былі аднолькавымі для ўсіх губерняў Расіі, дзе меліся прыгонныя. А вось парадак надзялення сялянства зямлёй і выканання павіннасцяў за карыстанне ёю, якія вызначаліся ***"Мясцовымі палажэннямі"***, істотна адрозніваліся ў розных рэгіёнах Расійскай імперыі. Былі распрацаваны яшчэ ***дадатковыя палажэнні***, якія адносіліся да асобных груп прыгоннага насельніцтва.

У адпаведнасці з "Агульным палажэннем" сяляне атрымлівалі некаторыя грамадзянскія правы, яны маглі займацца промысламі, гандляваць, набываць рухомую і нерухомую маёмасць, паступаць у навучальныя ўстановы і на службу, несці асабістую адказнасць перад судом і г. д. "Агульнае палажэнне" прызнавала памешчыкаў уласнікамі ўсёй зямлі, якая належала ім да рэформы. Частка гэтай зямлі адводзілася для надзялення сялян, але не ў асабістую ўласнаць, а на пастаяннае карыстанне. На працягу дзевяці гадоў сяляне абавязаны былі трымаць адведзены ім надзел і выконваць за гэта павіннасці ў выглядзе паншчыны, або аброку. Гэты час яны называліся часоваабавязаннымі і не маглі пакінуць сваё месца жыхарства без дазволу памешчыка. Толькі пасля заключэння ***выкупной здзелкі*** сяляне станавіліся ўласнікамі зямлі. Сядзібную зямлю селянін мог выкупіць у любы час, незалежна ад жадання памешчыка, а палявы надзел – толькі з яго згоды. Выкупная сума, якую сяляне павінны былі плаціць за надзел, вызначалася шляхам капіталізацыі пераведзенага на грошы аброку з дзесяціны з разліку 6 % гадавых (такім чынам, сяляне плацілі не толькі за зямлю, але і выкупалі свае аброчныя павіннасці). Сяляне плацілі памешчыку 20 % выкупной сумы, астатнія 80 % памешчыкі атрымлівалі ад дзяржавы ў выглядзе каштоўных папер, якія яны маглі прадаваць, або закладваць. Такім чынам, дзяржава, якая выступіла пасрэднікам паміж памешчыкамі і сялянамі, адтрымала вялікую выгаду ад рэалізацыі рэформы, таму што:

1) сяляне на працягу 49 гадоў павінны былі плаціць дзяржаве так званыя **выкупныя плацяжы;**

2) сяляне павінны былі таксама плаціць і працэнты, якія дзяржава брала за дадзеную сялянам пазыку. На 1 студзеня 1907 г., калі гэтыя плацяжы былі адменены, сяляне заплацілі дзяржаве і памешчыкам за зямлю амаль у 4 разы больш, чым яна каштавала да рэформы. Дзяржава, такім чынам, змагла сканцэнтраваць у сваіх руках вялікія сродкі, якія пайшлі на чыгуначнае будаўніцтва, развіццё прамысловасці. Гэта прадвызначыла так званы дзяржаўны характар капіталізму ў Расіі.

На Беларусі рэформа праводзілася паводле двух "Мясцовых палажэнняў". На Магілёўскую і Віцебскую (акрамя Дрысенскага і латгальскіх паветаў) губерні распаўсюджвалася "Мясцовае палажэнне" для губерній "вялікарасійскіх, на-

варасійскіх і беларускіх". У Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай губернях, Дрысенскім і латгальскіх паветах Віцебскай губерні дзейнічала асобнае "Мясцовае палажэнне". Замацаваны ў гэтых Палажэннях розны парадак надзялення сялян зямлёй і выканання павіннасцяў ва ўсходніх і заходніх паветах Беларусі тлумачыцца тым, што ва ўсходніх паветах, падобна да рускіх губерняў, існавала сялянскае абшчыннае землекарыстанне, а ў заходніх жа і цэнтральных паветах Беларусі, як і ў Літве, панскія сяляне карысталіся ворнай і сенакоснай зямлёй падворна. Ва ўсходніх паветах вышэйшы надзел вагаўся ад 4 да 5,5 дзесяцін, ніжэйшы складаў ад 1,8 дзесяціны да 1,2 дзесяціны на мужчынскую душу. У выпадку, калі дарэформавы надзел перавышаў вышэйшы, устаноўлены "Палажэннем", памешчык меў права адразаць лішак у сваю карысць. Дарэчы, адрэзкі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях сталі пашыранай з'явай: у асобных паветах сяляне ў працэсе рэалізацыі рэформы страцілі ад 25 да 40 % зямлі [6, 147]. У заходніх паветах нормы надзелаў не вызначаліся. У сялян захоўваліся прысядзібныя і палявыя надзелы, якімі яны карысталіся да 1861 г. Адрэзкі дапускаліся толькі ў тых выпадках, калі памер сялянскага надзелу перавышаў устаноўлены інвентаром, або калі ў памешчыка заставалася пасля рэформы менш 1/3 часткі зручных зямель.

Незадаволенасць сялян ўмовамі рэформы і пачатак паўстання 1863-1864 гг. прымусілі царскі ўрад стаць на шлях лавіравання, пайсці на ўступкі сялянам. Паводле ўказа ад 01.03.1863 г. у Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай, Дрысенскім і латгальскіх паветах Віцебскай губерняў часоваабавязанныя адносіны сялян да памешчыкаў спыняліся з 01.05.1863 г., сялян пераводзілі на абавязковы выкуп з паніжэннем выкупных плацяжоў на 20%. Указам ад 02.11.1863 г. гэтыя правілы з 01.01.1864 г. пашыраліся на Магілёўскую і астатнія 8 паветаў Віцебскай губерні. Згодна з цыркулярам губернатара М.М. Мураўёва ад 18.10. 1863 г. сялянам, абеззямеленым памешчыкамі ў працэсе інвентарнай рэформы, давалі па 3 дзесяціны зямлі. Нагадаем, што у іншых рэгіёнах Расіі толькі ў 1881 г. быў выдадзены закон, па якім часоваабавязанныя сяляне да 1 студзеня 1883 г. павінны былі перайсці на абавязковы выкуп. Такім чынам, рэформа на беларускіх землях прайшла на больш выгадных умовах, чым у іншых рэгіёнах Расіі.

## У чым заключаюцца асаблівасці развіцця капіталістычных адносін на беларускіх землях?

Ёсць шэраг момантаў, звязаных з развіццём капіталістычных адносін на беларускіх землях, засваенне якіх дапаможа зразумець асаблівасці гэтага працэсу ў нашым рэгіёне:

1) станаўленне капіталізму адбывалася ва ўмовах адсутнасці ўласнай нацыянальнай дзяржавы і, адпаведна, уласнай дзяржаўнай эканамічнай ініцыятывы. Пры тым, што ў працэсе рэалізацыі аграрнай рэформы 1861 г. дзяржава сканцэнтравала ў сваіх руках велізарныя фінансавыя рэсурсы, і капіталізм у Расійскай імперыі набыў дзяржаўны характар, дзяржаўныя сродкі амаль не ўкладваліся ў развіццё эканомікі Беларусі;

2) як і ў эпоху феадалізму, зыходнай базай для развіцця эканомікі беларускіх зямель з'яўлялася сельская гаспадарка і вёска. Менавіта там былі сканцэнтраваны эканамічная ініцыятыва, асноўныя фінансавыя, сыравінныя і

працоўныя рэсурсы. Гарады і гарадская эканоміка ў працэсе станаўлення капіталізму выконвалі дапаможную ролю.

**Якім чынам развіваўся капіталізм у сельскай гаспадарцы Беларусі?**

Рэформа 1861 г. мела вялікае значэнне для станаўлення капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы. Сяляне атрымалі асабістыя і маёмасныя правы. Была ліквідавана манаполія памешчыкаў на зямлю і на эксплуатацыю сялянскай працы. Але развіццё капіталізму здзяйснялася з захаваннем перажыткаў феадалізму (памешчыцкае землеўладанне, сервітуты, абшчына). Гэта быў так званы "прускі" шлях развіцця капіталізму (з марудным перарастаннем прыгонніцкай сістэмы ў капіталістычную на аснове памешчыцкай гаспадаркі), які істотна адроўзніваўся ад "амерыканскага" (фермерскага, пры адсутнасці памешчыцкага землеўладання) шляху. Некаторыя даследчыкі кажуць пра асобны "рускі" шлях, які адрозніваўся ад "прускага" тым, што рэформа была праведзена з актыўным удзелам дзяржавы, і дзяржава, а не буржуазія (як у Прусіі), атрымала найбольшую выгаду ад рэалізацыі рэформы.

У выніку рэформы 1861 г. і іншых аграрных законаў 1860-80-х гг. сялянскае пытанне не было вырашана да канца. Памешчыкі захавалі ў сваёй уласнасці больш за палову зямлі. У 1877 г. дваранам належала 50,3 % зямлі, казне, царкве і іншым установам – 11,2 %, сялянскія надзелы складалі 33,4 % зямельнай плошчы. Недахоп зямлі, нізкая культура земляробства, велізарныя падаткі не дазвалялі большай частцы сялян весці самастойную гаспадарку і пераўтваралі іх у наёмных рабочых. Пераход да капіталізму адбываўся паступова [4]. Тым не менш, развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы Беларусі ішло хутчэй, чым у большасці іншых рэгіёнаў Расіі. Гэтаму спрыялі:

1) мерапрыемствы, праведзеныя царскім урадам у сувязі з паўстаннем 1863-64 гг., якія аблягчалі ўмовы вызвалення сялян ад прыгоннай залежнасці;

2) будаўніцтва ў 1860-1870-я гг. чыгунак, што садзейнічала збыту прадукцыі, як унутры рэгіёна, так і за яго межамі.

*Праз Гродна ў 1862 г. прайшла чыгунка Пецярбург – Варшава. У 1866-1868 гг. Віцебск і Полацк сталі станцыямі Рыга-Арлоўскай чыгункі. У 1871 г. з усходу на захад Беларусь перасякла чыгунка Масква – Брэст. Яна прайшла праз Оршу, Барысаў, Мінск, Баранавічы. Праз два гады пачаўся рух на беларускім участку (Смаргонь - Маладзечна - Мінск - Асіповічы - Бабруйск - Жлобін - Гомель) Лібава-Роменскай чыгункі. У той жа час праз Брэст прайшла чыгунка з Украіны да мяжы з Прусіяй. Такім чынам, беларускія губерні атрымалі надзейныя шляхі зносін з Пецярбургам, Масквой, Украінай, партовымі гарадамі: Рыгай і Лібавай, Варшавай і Заходняй Еўропай;*

3) адсутнасць абшчыны на большай частцы тэрыторыі Беларусі. На беларускіх землях пераважала падворная сістэма землекарыстання (64,1% сялянскіх двароў). Абшчына (35,9 % двароў) была пашырана толькі ў Магілёўскай і Віцебскай губернях [5].

Важна зразумець, ***у чым дакладна праявілася развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы***. На нашу думку, гэта выявілася ў:

1) станаўленні новых форм арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці;
2) класавым расслаенні сялянства;
3) павышэнні ўзроўня тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі;
4) росце гандлёвага земляробства і жывёлагадоўлі ў памешчыкаў і сялян [5].

***Новыя формы арганізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці.*** У парэформавы час у памешчыцкіх гаспадарках пашыралася выкарыстанне вольнанаёмнай працы. Кантынгент сельскагаспадарчых рабочых фармаваўся з розных груп беззямельных сялян і перасяленцаў. У 1897 г. на Беларусі было 130 тыс. пастаянных сельскагаспадарчых рабочых, напярэдадні Першай сусветнай вайны – 200 тыс. [5]. Аднак некаторая частка памешчыкаў аддавала перавагу ***адработкам***[44]. Многія памешчыкі па прычыне недахопу сродкаў для вядзення гаспадаркі, адпаведных навыкаў для гэтага, немагчымасці прадаць зямлю шырока практыкавалі здачу зямлі ў ***арэнду***[45]. Развіццю арэндных адносін спрыяла сялянскае малазямелле, а таксама меры па абмежаванню куплі-продажу зямлі яўрэямі і "асобамі польскага паходжання"[46]. У 1887 г. каля ¼ дваранскай зямлі было ў арэндзе [7].

***Класавае расслаенне сялянства.*** У 1877 г. бяднейшае сялянства (да 15 дзесяцін[47] на двор) складала 61,9 %, сярэдняе (15-20 дзесяцін) – да 27,6 %, заможнае (больш за 20 дзесяцін) – 10,5 % ад агульнай колькасці двароў. Да пачатку Першай сусветнай вайны дыферэнцыяцыя сялян паглыбілася: бедната – 69 %, серадdespiteнякі – 20 %, заможныя сяляне – 11 % [5].

***Павышэнне ўзроўня тэхнічнай аснашчанасці сельскай гаспадаркі.*** З развіццём капіталістычных адносін пашыралася выкарыстанне ў сельскай гаспадарцы машын і штучных угнаенняў. У сярэдзіне 1890-х гг. па ўзроўню выкарыстання сельскагаспадарчай тэхнікі ў памешчыцкай і сялянскай гаспадарцы Беларусь займала 2-е месца ў Расіі (пасля Наварасіі), аднак да 1910 г. яна страціла гэтыя пазіцыі [5]. Скарыстанне машын і палепшаных прылад працы садзейнічала выцясненню адпрацовак вольнанаёмнай працай, згаленню цесна звязанага з імі сярэдняга сялянства, ператварэнню кабальнага селяніна ў наёмнага рабочага.

*У большасці маёнткаў выкарыстоўваліся малатарні, веялкі, сячкарні. У гаспадарках, пабудаваных на капіталістычных пачатках, глебу апрацоўвалі жалезнымі плугамі і баронамі. У многіх маёнтках выкарыстоўваліся і складаныя сельскагаспадарчыя машыны (сеялкі, жняяркі, сенакасілкі). Але асноўная частка сялян карысталася старымі прымітыўнымі прыладамі працы.*

***Рост гандлёвага земляробства і жывёлагадоўлі ў памешчыкаў і сялян.*** У парэформавы час таварна-грашовыя адносіны сталі вызначальным фактарам

[44] **Адработкі** – кабальная форма найму сялян са сваімі прыладамі працы і цяглом да памешчыка, або заможнага селяніна за арандаваную зямлю, пазычаныя грошы, хлеб, лясные матэрыялы, у пагашэнне штрафаў і інш. (Гл. падрабязна: Адработкі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі. – 1993. – Т. I. – С. 58.)

[45] **Арэнда** – (ад лац. arrendare праз польск. arenda – аддаваць у наймы) маёмасная пазыка, дагавор, па якім арэндадавец (грамадзянін, прадпрыемства, установа ці арганізацыя) абавязваецца даць арандатару маёмасць у часовае карыстанне за пэўную плату. (Гл. падрабязна: Арэнда // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.].– Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– 1993. – Т. I. – С. 197.)

[46] **Абмежавальныя законы** – сукупнасць нарматыўных актаў царскай адміністрацыі па абмежаванні маёмасных правоў у сферы землеўладання і землекарыстання насельніцтва Беларусі, Літвы і Правабярэжнай Украіны ў кан. XVIII – пач. XX стст. (Гл. падрабязна: Абмежавальныя законы // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.– 1993. – Т. I. – С. 14).

[47] **Дзесяціна** – старажытнаруская мера зямельных плошчаў. Як галоўная пазямельная адзінка вымярэнняў уведзена ў Расіі Межавой інструкцыяй 1753 г. у выглядзе казённай дзесяціны, плошча якой устанаўлівалася 1,0925 га ў пераліку ў метрычную сістэму. (Гл. падрабязна: Дзесяціна // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (галоўны рэд.) [і інш.].– Мн.: "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі . – 1996. – Т. 3 – С. 227).

эвалюцыі сельскагаспадарчай вытворчасці. Развіццё капіталізму ў аграрнай сферы суправаджалася ростам таварнасці. Беларускія губерні ўсё актыўней уцягваліся ў агульнарасійскія рыначныя адносіны. Ужо ў 1860-я гг. сфармаваўся рэгіянальны сельскагаспадарчы рынак. Панская гаспадарска ўсё цясней звязвалася з рынкам, станавілася прадпрымальніцкай. Сялянская гаспадарка таксама набывала буржуазны характар. Аднак у ёй панаваў дробнатаварны ўклад, звязаны з простай таварнай вытворчасцю.

У 1860-70-я гг. на першы план вылучалася збожжавая вытворчасць. Беларусь з'яўлялася рэгіёнам інтэнсіўнага вывазу збожжа. Прычым, 55,8 % таварнага збожжа давалі сялянскія гаспадаркі [5].

У канцы XIX ст. Беларусь, як і іншыя рэгіёны Расі, ахапіў аграрны крызіс. Назіралася рэзкае зніжэнне цэн на збожжа, абумоўленае прытокам на еўрапейскія рынкі танных збожжавых і вырабаў з іх з ЗША, Канады, Аргенціны, Аўстраліі. У выніку вытворчасць збожжа на продаж у сельскай гаспадарцы Беларусі страціла першынствуючае значэнне.

У гэтых умовах памешчыкі і сялянская буржуазія пачалі пераарыентоўваць сваю гаспадарку на жывёлагадоўлю, перш за ўсё малочную, што прыносіла большы прыбытак. Малочная жывёлагадоўля стала вядучай таварнай спецыялізаванай галіной сельскай гаспадаркі Беларусі. Расла тэхнічная перапрацоўка малочных прадуктаў. У гэты час на Беларусі было больш за 200 маслабойняў і сыраварняў. Вываз малочных прадуктаў у 90-я гг. павялічыўся у параўнанні з 70-мі гадамі прыкладна ў чатыры разы. У кан. XIX ст. беларускія і прыбалтыйскія губерні сталі трэцім па важнасці (пасля паўночных і сібірскіх) рэгіёнам малочнай гаспадаркі Расіі [5]. Таксама адбывалася спецыялізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці на мясной жывёлагадоўлі. Практыкаваўся адкорм буйной рагатай жывёлы на продаж, развівалася свінагадоўля. Па памерах свінагадоўлі Беларусь і Літва поруч з Правабярэжнай Украінай займалі першае месца ў еўрапейскай частцы Расіі [3, 189].

З кан. XIX ст. актывізавалася льноводства. Асноўная маса таварнага льновалакна вывозілася за мяжу: у Германію, Аўстра-Венгрыю, Англію, Францыю, Бельгію.

Аб паглыбленні спецыялізацыі сельскай гаспадаркі сведчыць пашырэнне вытворчасці кармавых і тэхнічных культур, сярод якіх першае месца займала бульба. Па вытворчасці бульбы заходнія губерні разам з прыбалтыйскімі займалі першае месца ў еўрапейскай Расіі [3, 190].

*Хуткі рост пасеваў бульбы і выцясненне бульбай збожжавых з'яўляецца паказчыкам развіцця капіталізму ў земляробстве, бо тэхнічныя культуры былі больш таварнымі. Пашырэнне пасяўной плошчы пад бульбай вяло да паляпшэння тэхнічнай аснашчанасці (плуг замест сахі) сельскагаспадарчай вытворчасці і павышэння ўзроўню агратэхнікі – замены архаічнага трохполля (азімыя, яравыя, папар) папарнапрапашнымі, чатырохпольнымі севазваротамі, пры якіх адно поле заўсёды засявалася гэтай культурай.*

**Якім чынам развіваўся капіталізм у прамысловасці Беларусі?**

Усе тры асноўныя формы арганізацыі прамысловасці XIX ст. – дробнатаварная, мануфактурная і фабрычная вытворчасць – склаліся яшчэ ў дарэформавай Беларусі. Для беларускай прамысловасці дарэформавага перыяду была

характэрна пераважна дробнатаварная вытворчасць у форме рамяства і дробнакапіталістычных прадпрыемстваў[48]. У 1860 г. такія прадпрыемствы складалі 96 % усіх прадпрыемстваў. Працягвалася і развіццё мануфактурнай вытворчасці са спалучэннем прымусовай і вольнанаёмнай працы. У 1860 г. мануфактуры складалі 0,5 % колькасці прамысловых прадпрыемстваў, канцэнтравалі 7,7 % рабочых і далі 7,4 % прадукцыі ўсёй прамысловасці [2, 56].

Прамысловы пераварот на Беларусі пачынаецца толькі з 20-х гг. XIX ст. ***Прамысловы пераварот*** – гэта сукупнасць эканамічных, сацыяльных і палітычных зрухаў, азнаменаваўшых пераход ад мануфактурнай стадыі капіталізму да фабрычнай сістэмы вытворчасці, заснаванай на машыннай тэхніцы. У выніку гэтых зрухаў капіталістычны спосаб вытворчасці атрымаў адпавядаючы яго характару тэхнічны базіс і зацвердзіўся як фармацыя[49].

Вызначым акалічнасці, якія паспрыялі прамысловаму перавароту:

1) увядзенне з 1797 г. адзіных для беларускага і расійскага рынку мер даўжыні і вагі;

2) пачатак ажыццяўлення з 1830 г. афіцыйнай палітыкі абароны правоў вытворцаў шляхам дзяржаўнага зацвярджэння прамысловых клеймаў. Адзначым, што першае і другое названыя намі мерапрыемствы паклалі пачатак стандартызацыі – неад'емнай рысы індустрыяльнага грамадства [3, 119];

3) набыццё за мяжой удасканаленнага абсталявання і паравых машын, запазычванне заходнееўрапейскай тэхналогіі вытворчасці;

4) назапашванне капіталаў у руках дваран-прадпрымальнікаў, гандляроў і рамеснікаў, а таксама асобных сялян, якія паспяхова займаліся прадпрымальніцтвам.

*Першы паравы рухавік у Беларусі з'явіўся на Хомскай суконнай фабрыцы (Кобрынскі павет) памешчыка В. Пуслоўскага. У 1818 г. граф М. Румянцаў ухваліў прапанову механіка Гомельскай эканоміі англічаніна А. Сміта аб будаўніцтве паравой лесапільні і парахода. У 1824 г. адбылося выпрабаванне парахода. Такім чынам, у Беларусі быў пакладзены пачатак выкарыстанню паравых рухавікоў на транспарце [3, 123]. У 1841 г. узнік мукамольны завод капіталістычнага тыпу ў Магілёве, затым цукровы – у Беліцы.*

Да сярэдзіны 50-х гг. XIX ст. паравыя машыны меліся ва ўсіх галінах беларускай прамысловасці, за выключэннем сілікатнай. У адрозненне ад цэнтральных губерняў Расійскай імперыі, дзе прамысловы пераварот пачаўся ў баваўнянай прамысловасці, у ***Беларусі лідэрам тэхнічнага прагрэсу ў першай палове XIX ст. з'яўляліся асобныя прадпрыемствы суконнай і харчовай прамысловасці*** [3, 123]. Яшчэ ў дарэформавы час пачаўся прамысловы пераварот і ў металаапрацоўчай прамысловасці [6, 169].

*Аб гэтым сведчыць не толькі ўкараненне паравых рухавікоў у галіне металаапрацоўкі, але і змяненне яе тэхналогіі. У металургіі, напрыклад, крычны спосаб атрымання жалеза быў заменены пудлінгавым (у домнах). Ужо ў 50-я гг. XIX ст. тры пудлінгавыя печы былі на Старынкаўскім чыгуналіцейным заводзе (Чэрыкаўскі павет), адна – на Барысаўшчынскім металургічным заводзе (Барысаўскі павет), восем – на Налібокскім металургічным камбінаце (Ашмянскі*

[48] Да дробнакапіталістычных прадпрыемстваў звычайна адносілі прадпрыемствы з колькасцю работнікаў ад 5 да 16, без паравога рухавіка, з гадавой выручкай менш за 1 тыс рублёў.

[49] Гл. падрабязна: Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В.Стралец, Л.Ю.Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – С. 51.

*павет). Яшчэ да сялянскай рэформы на першых двух выраблялiся паравыя машыны [6, 169]. У 70-я гг. XIX ст. закрылiся апошнiя металургiчныя прадпрыемствы Беларусi, аднак металаапрацоўка i машынабудаванне працягвалi развiвацца, абслугоўваючы ў асноўным патрэбы сельскай гаспадаркi. У 1884 г. у Пiнску быў адчынены адзiны ў паўночна-заходнiх губернях суднабудаўнiчы завод.*

Прамысловы пераварот адбываўся на Беларусi i ў iншых галiнах (дрэваапрацоўчая, харчовая, хiмiчная) i завяршыўся у канцы 90-х гг., на 10 гадоў пазней, чым у Расii. За 40 парэформавых гадоў аб'ём фабрычнай прадукцыi ўзрос у 37 разоў. У першыя два дзесяцiгоддзi пасля рэформы 1861 г. фабрычна-завадская прамысловасць развiвалася марудна. З усiх прадпрыемстваў, якiя мелiся ў 1890 г., удзельная вага заснаваных у 60-70-я гг. складала трохi болей за 18 %. Асноўная колькасць фабрык i заводаў была пабудавана ў 80-90 гг. Да 1890 г. фабрыкi i заводы Беларусi давалi амаль палову (47,8 %) усёй прамысловай прадукцыi [6, 170].

Негледзячы на будаўнiцтва фабрык i заводаў, дробныя прадпрыемствы амаль на працягу ўсяго парэформавага перыяду пераважалi па колькасцi. Вялiкая удзельная вага дробнатаварнай вытворчасцi ў прамысловасцi Беларусi тлумачыцца як гiстарычнымi, так i эканамiчнымi ўмовамi[50].

Прамысловасць Беларусi абапiралася на мясцовую сыравiнную базу, у першую чаргу лясныя багаццi i прадукцыю сельскай гаспадаркi. Гэта i вызначыла развiццё яе вядучых галiн – ***харчасмакавай i тэкстыльнай***. Значнае развiццё ў парэформавы час атрымалi таксама гарбарная, шкляная, сiлiкатна-будаўнiчая галiны вытворчасцi.

Галоўнай галiной харчовай прамысловасцi на Беларусi было ***вiнакурства***. Гэтаму спрыяла, найперш, выключная манаполiя дваран на вiнакурства, якая захавалася з часоў РП, а таксама наяўнасць таннай сыравiны, працоўнай сiлы i абсталявання. Гэтая галiна прамысловасцi была цесна звязана с сельскай гаспадарскай i мела сельскагаспадарчы характар. У якасцi сыравiны для вiнакурства выкарыстоўвалася збожжа, а ў канцы XIX ст. – пераважна бульба. У 1887 г. у заходнiх губернях канцэнтравалася каля 21,5 % вiнакурных прадпрыемстваў Расii. У апошнiя два дзесяцiгоддзi XIX ст. колькасць вiнакурных прадпрыемстваў некалькi скарацiлася, але iх агульная вытворчасць значна ўзрасла. Гэта адбывалася за кошт тэхнiчнага ўдасканалення, асаблiва ў апошнiя 5 гадоў XIX ст. Такiя ж працэсы скарачэння колькасцi прадпрыемстваў разам з iх узбуйненнем i павелiчэннем вытворчасцi назiралiся i ў пiваварнай i тытунёвай вытворчасцi.

Актыўна развiвалася вытворчасць цукру (таксама выключна дваранская галiна прамысловасцi), мукамольная прамысловасць, свечкавая, мылаварная, гарбарная вытворчасцi. Але ўжо ў 80-я гг. XIX ст. цукровыя заводы Беларусi спынiлi сваё iснаванне, не вытрымаўшы канкурэнцыi з боку цукровай прамысловасцi Украiны. Гарбарная, шкляная i сiлiкатна-будаўнiчая галiны прамысловасцi паступова павялiчвалi памеры вытворчасцi, аднак тэхнiчны прагрэс у iх здзяйсняўся вельмi павольнымi тэмпамi.

У тэкстыльнай прамысловасцi пачатку XIX ст. панавала вытворчасць палатняных, а з 20-х гг. XIX ст. – вытворчасць ваўняных тканiн [3, 125]. Да канца XIX ст. удзельная вага прадукцыi тэкстыльных прадпрыемстваў у агуль-

---

[50] Гл. падрабязна: Эканамiчная гiсторыя Беларусi: вучэбны дапаможнiк / В.I. Галубовiч, Р.I. Ермашкевiч, Г.П. Бушчык [i iнш.]; пад агульнай рэд. В.I. Галубовiча.– Выд 2-е, дап. i перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 168.

най вытворчасці прамысловасці знізілася. Беларуская тэкстыльная вытворчасць не вытрымала канкурэнцыі з боку прадпрыемстваў гэтай галіны, якія існавалі на тэрыторыі Польшчы і ў Цэнтральнай Расіі.

Лясная прамысловасць спачатку арыентавалася на вываз сырога лесу, які павялічваўся з кожным годам. Побач з гэтым пачалі ўзнікаць прадпрыемствы па глыбокай перапрацоўцы драўніны (папяровыя, запалкавыя і інш.). Шматлікія прадпрыемствы лясной прамысловасці выраблялі дошкі, гонт, паркет, шпалы, драўняную масу, картон.

Развіццё фабрычна-завадской вытворчасці з'явілася асновай росту гарадоў. Аднак на Беларусі не сфармаваліся такія буйныя прамысловыя цэнтры, якімі ў Расіі з'яўляліся Пецярбург, Масква. Галоўная прычына гэтага – спецыялізацыя беларускай прамысловасці на перапрацоўцы мясцовай сельскагаспадарчай, лясной і мінеральнай сыравіны, што абумовіла яе размяшчэнне ў сельскай мясцовасці. У парэформавы час у гарадах выраблялася толькі каля 31 % усёй прадукцыі [6, 171].

### Якім чынам фармаваліся асноўныя класы капіталістычнага грамадства?

У дарэформавы час пралетарыят Беларусі складаўся з наёмных рабочых мануфактур, першых фабрык і заводаў, а таксама занятых у сферы будаўніцтва, транспарту і сувязі. У 1860 г. налічвалася каля 41,5 тыс наёмных рабочых (без занятых на промыслах і ўладальнікаў майстэрань) у тым ліку 7,8 тыс. фабрычных і мануфактурных [3, 210]. У парэформавы час пралетарыят актыўна расце колькасна за кошт былога прыгоннага сялянства. Але сярод рабочых гарадской прамысловасці Беларусі ўдзельная вага выхадцаў з мяшчан была значна вышэй, а з сялян – ніжэй, чым у цэнтральнай Расіі і ў цэлым па Расійскай імперыі. Гэта тлумачыцца палітыкай штучнай "урбанізацыі" яўрэйскага насельніцтва ў заходніх губернях, якую праводзіў царызм. У выніку, паводле перапісу 1897 г., яўрэі сярод мяшчан беларускіх гарадоў складалі 77,1 % [3, 211].

На мяжы XIX-XX стст. у прамысловасці Беларусі працавала 237 тыс. рабочых. На чыгунках колькасць рабочых дасягала 25 тыс. У іншых сферах народнай гаспадаркі (рачны і гужавы транспарт, будаўніцтва, гандаль, сельская гаспадарка і інш) было занята каля 200 тыс. чалавек. Агульная колькасць пастаянных наёмных рабочых у Беларусі ў той час перавышала 460 тыс. [3. 211].

Развіццё капіталістычных адносін на беларускіх землях спрыяла ўтварэнню сваёй мясцовай буржуазіі. Асноўнымі крыніцамі фармавання буржуазіі Беларусі былі прадстаўнікі саслоўя дваран і купцоў, у меншай ступені – мяшчан і сялянства.

Буржуазія не ўяўляла адзінага цэлага, таму што паміж яе прадстаўнікамі існавалі істотныя нацыянальныя і рэлігійныя адрозненні. Значная частка буржуазіі вырасла з асяроддзя яўрэяў – купцоў і мяшчан. Паводле перапісу 1897 г., сярод купцоў пяці беларускіх губерняў было 84,5 % яўрэяў. Яўрэйская буржуазія з'ўлялася ўласнікам больш чым паловы (51 %) фабрык і заводаў [3, 213].

### Якія змены адбываліся ў гаспадарчым развіцці Беларусі ў перыяд манапалістычнага капіталізму?

Гісторыю развіцця *капіталізму* падзяляюць на *3 асноўныя стадыі*:

I – генезіс капіталізму, мануфактурны перыяд развіцця (XVI ст. – апошняя трэць XVIII ст.);

II – даманапалістычная стадыя, якая характарызавалася прамысловым пераваротам і індустрыялізацыяй (апошн. трэць XVIII ст. – апошн. трэць XIX ст.);

III – пераход ад свабоднай канкурэнцыі да панавання манаполій (70-я гг. XIX ст. – пач. XX ст.).

Другі перыяд развіцця капіталізму (панавання свабоднай канкурэнцыі) пачынаецца з прамысловага перавароту. На Беларусі гэты перыяд пачаўся, як вядома, пазней, чым у іншых рэгіёнах. А вось перыяд манапалістычнага капіталізму пачынаецца ў Расіі (і на беларускіх землях) прыкладна адначасова з Заходняй Еўропай.

Асноўнай рысай развіцця капіталістычных краін у канцы XIX ст. быў паступовы пераход ад капіталізма, заснаванага на свабоднай канкурэнцыі асобных самастойных прадпрыемстваў, да манапалістычнага капіталізму. Гэты пераход стаў вынікам усяго папярэдняга развіцця эканомікі капіталізму і ўздыму яго прадукцыйных сіл[51].

Расія ў разглядаемы перыяд па агульным колькасным паказчыку сусветнага сукупнага прыродна-дэмаграфічнага, фінансава-эканамічнага і ваеннатэхнічнага патэнцыялу займала чацвёртае – пятае месца разам з Францыяй, прычым значна саступаючы ЗША, Вялікабрытаніі і Германіі. Але па ўзроўні індустрыялізацыі грамадства і эканамічным патэнцыяле Расія разам з Японіяй уваходзіла ў трэцюю групу індустрыяльна развіваючыхся краін, адстаючы нават ад другога эшалона прамыслова развітых дзяржаў – Аўстра-Венгрыі і Італіі, дзе працэс індустрыялізацыі грамадства яшчэ не завяршыўся[52].

Дзяржаўны ўплыў на развіццё эканомікі Расіі ў канцы XIX ст. істотна ўзмацніўся. Рэалізацыя дзяржавай эканамічнай праграмы, накіраванай на забеспячэнне фарсіраванай індустрыялізацыі, садзейнічала актыўнаму паступленню замежных капіталаў у краіну[53]. Павелічэнне інвестыцый у прамысловасць выклікала ў 90-я гг. сапраўдны прамысловы бум. Рэзка ўзрасла ступень канцэнтрацыі вытворчасці, з'явіліся новыя галіны вытворчасці (вугле- і нафтаздабыча, хімічная, машынабудаванне), узніклі новыя прамысловыя раёны. Пачынаючы з 80-х гг. сталі ўзнікаць манапалістычныя аб'яднанні, прычым вельмі часта з удзелам дзяржавы. Значна ўзрос аб'ём знешняга гандлю Расіі, але пры гэтым вываз тавараў працягваў адыгрываць рашаючую ролю ў параўнанні з вывазам капіталу.

Беларускія землі ў гэты час адыгрывалі раней вызначаную ім ролю аграрнага прыдатку. Асноўнай галіной эканомікі заставалася сельская гаспадарка, у якой было занята больш за 75 % насельніцтва, а 90 % –атрымлівалі прыбыткі з зямлі. Развіццё аграрнага сектару стрымлівалася захаваннем феадальных перажыткаў пры адносна развітым аграрным капіталізме. З мэтаю ліквідацыі гэтых перажыткаў і стварэння трывалай апоры ўлады ў выглядзе сельскай буржуазіі і заможнага сялянства дзяржава пайшла на рэалізацыю пачынаючы з 1906 г. аграрнай рэформы, якая па прозвішу старшыні Савета Міністраў П.А. Сталыпі-

---

[51] Гл. падрабязна: Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В.Стралец, Л.Ю.Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – С. 62.

[52] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнаай рэд. В.І. Галубовіча. – Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ "Экаперспектыва", 1996. – С. 180.

[53] Гл. падрабязна: Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В.Стралец, Л.Ю.Малыхіна; пад рэд. Н..М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – С. 62.

на атрымала назву ***“сталыпінская аграрная рэформа”***. У працэсе рэалізацыі рэформы здзяйснялася разбурэнне сельскай пазямельнай абшчыны, насаджэнне дробнакапіталістычнай сялянскай зямельнай уласнасці, хутарской формы землекарыстання, перасяленне беззямельных і малазямельных сялян у Сібір, на Далёкі Ўсход, у Сярэднюю Азію, Казахстан і іншыя рэгіёны імперыі. У працэсе рэалізацыі рэформы ў Магілёўскай і Віцебскай губернях з абшыны выйшла 139,4 тыс. сялянскіх двароў (63 % іх агульнай колькасці). Спадзяванні ўрада на масавае ўтварэнне хутарскіх і водрубных гаспадарак не апраўдаліся. У перыяд 1907-1916 гг. у 5 заходніх губернях толькі 10% сялянскіх двароў перасялілася на хутары[54].

Прамысловасць захоўвала ранейшую галіновую структуру. У 1908 г. харчовая і дрэваапрацоўчая галіны вытворчасці давалі 70,5 % аб’ёму прадукцыі ўсёй фабрычна-завадской прамысловасці [8, 211]. Нізкай заставалася ступень канцэнтрацыі вытворчасці. У 1913 г. вытворчасць дробнай і саматужнай прамысловасці Беларусі склала 53,5 % усёй валавой прадукцыі. Неабходнасць развіцця прамысловасці, асабліва новых вытворчасцяў (паглыбленая перапрацоўка драўніны: фанерная і папяровая вытворчасці і інш.) стымулявала пераход да акцыянернай формы арганізацыі прамысловасці (з удзелам расійскага і замежнага капіталу). Напярэдадні Першай сусветнай вайны ў Беларусі існавала 34 акцыянерных таварыствы. Як і ў Германіі, дзе ступень канцэнтрацыі прамысловасці была невысокай, асноўнымі формамі манапалістычных аб’яднанняў сталі сіндыкаты. У прамысловасць актыўна пранікаў замежны капітал (германскі – у лесаапрацоўку, бельгійскі і французскі – у тэкстыльную вытворчасць) [6. 179-194].

## Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т.3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII-XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004.

2. Болбас, М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795-1861гг.) / М.Ф. Болбас. – Мн., 1966.

3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Экаперспектыва, 2000-2008. – Т.4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пач. XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005.

4. Грузіцкі, Ю. Сельская гаспадарка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (галоўны рэдактар) [і інш.]. – Мн.: “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі. – Т.6,кн.І. – 2001.

5. Бейлькін, Х.Ю. Аграрнае пытанне / Х.Ю. Бейлькін, У.А. Палуян, В.С. Развецкі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.]. – Мн.: “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі. – Т. І. – 1993.

6. Эканамічная гісторыя Беларусі: Вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульнаай рэд. В.І. Галубовіча.– Выд 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: НКФ “Экаперспектыва”, 1996.

7. Бейлькін,Х.Ю. Арэнда зямлі на Беларусі / Х.Ю. Бейлькін, А.М. Сарокін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: М.В. Біч, А.П. Грыцкевіч, М.І. Ермаловіч) [і інш.].– Мн.: “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі, 1993. – Т.І.

8. Саракавік, І.А. Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І.А. Саракавік. – Мн., 2006.

[54] Гл. падрабязна: Сталыпінская аграрная рэформа // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. / рэд. калегія: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: “Беларуская энцыклапедыя” імя Петруся Броўкі. – 2001. – Т. 6. кн. І. – С. 399.

## Раздзел IV. ШЛЯХІ І МЕТАДЫ БУДАЎНІЦТВА ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

### Тэма: ЭКАНОМІКА БЕЛАРУСІ Ў 1918-1945 гг.

#### Станаўленне сістэм рэгулюемай эканомікі ў свеце. Прыкметы каманднa-адміністрацыйнай сістэмы

У пачатку міжваеннага перыяда эканоміка вядучых еўрапейскіх краін развівалася паспяхова. Але ж у 1920-1921, 1929-1933 і ў 1937-1938 гг. Прамысловасць і сельская гаспадарка еўраамерыканскай цывілізацыі перажывалі цяжкія крызісы. У 30-я гг. XX ст. склаліся тры розныя мадэлі дзяржаўнага рэгулявання эканамічных працэсаў, якія адпавядалі палітычнай накіраванасці дзяржаў:

1) ***таталітарная гаспадарча-эканамічная сістэма***, пры якой фашысты і нацыянал-сацыялісты захавалі прыватную ўласнасць на сродкі вытворчасці і рынкавыя механізмы функцыянавання эканомікі, але пад жорсткім наглядам дзяржавы. Сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг. стаў тупіком, у які зайшла індустрыяльная цывілізацыя, і Гітлер адрадзіў сацыяльна-палітычную структуру даіндустрыяльных цывілізацый.

*Крызіс у **Германіі** быў найбольш моцным, засілле буйнога карпаратыўнага капіталу выразным, працоўныя, былыя афіцэры, дробныя гаспадары і служачыя наогул былі выбіты з каляіны Першай сусветнай вайной, і палітычнай нестабільнасцю. Рэпарацыі паглыбілі дэфіцыт бюджэта Германіі, і ў 1922-1923 гг. у краіне пачалася гіперінфляцыя – рост цэнаў у сотні мільёнаў разоў. Замежныя інвестыцыі, займы, укараненне навуковай арганізацыі працы дазволілі ў другой палове 20-х гадоў аднавіць прамысловасць у Германіі і зноў выйсці на першае месца ў Еўропе і другое ў свеце.*

*У пачатку 1933 г. да ўлады прыйшлі нацысты. Іх эканамічная праграма арыентавалася на падрыхтоўку да вайны, што азначала мілітарызацыю і курс на аўтаркію – самазабеспячэнне неабходнымі рэсурсамі. Для пераводу эканомікі на ваенныя рэйкі быў утвораны складаны апарат дзяржаўнага рэгулявання. Яго аснову складаў "фюрэр-прынцып" – падпарадкаванне ўсіх сектараў эканомікі і груп прадпрыемстваў загадам упаўнаважаных чыноўнікаў – "віртшафтсфюрэраў". У 1933 г. быў прыняты Закон аб прымусовым карцеліраванні дробных і сярэдніх прадпрыемстваў", а ў 1934 г. – "Закон аб падрыхтоўцы да арганічнай пабудовы германскай гаспадаркі".*

*Міністр эканомікі Я. Шахт атрымаў паўнамоцтвы на ўтварэнне, роспуск ці змяненне гаспадарчых аб'яднанняў і назначэнне іх кіраўнікоў. Закон "Аб арганізацыі нацыянальнай працы" (1934 г.) забараняў прафсаюзы, стачкі, пераход працоўных на іншае прадпрыемства, дэклараваў спыненне ў Германіі класавай барацьбы і аб'яднанне працоўных і фабрыкантаў у адзіны "Нямецкі працоўны фронт", у якім заработная плата рэгулявалася міністэрствам. Сродкам скарачэння беспрацоўя стала ўвядзенне ў 1935 г. сярод насельніцтва ўзростам з 18 да 25 год працоўнай павіннасці, з 1938 г. яна стала ўсеагульнай. Для рэгулявання сельскай гаспадаркі было створана "імперскае саслоўе па харчаванню", земляробы былі аб'яўлены "салдатамі фронта харчавання". Уводзілася сістэма прымусовых паставак сельгаспрадукцыі;*

2) ***ліберальна-рэфармісцкая мадэль***, у адпаведнасці з якой у дэмакратычных краінах былі сфармуляваны ідэі пашырэння рэгулюючай ролі дзяржавы ў эканоміцы ў мэтах рэалізацыі правоў і свабод чалавека. У гэтай канцэпцыі цэнтральнае месца займаюць праграмы сацыяльнай дапамогі немаёмасным, беспрацоўным, інвалідам, праграмы пенсій і дапамогі па старасці, абгрунтавана дзяржаўнае ўмяшальніцтва пры вырашэнні спрэчных пытанняў паміж прадпрымальнікамі і рабочымі, садзеянне сістэмам адукацыі, аховы здароўя, жыллёвага будаўніцтва. Вялікае значэнне надавалася дзяржаўнай рэгуляцыі эканамічнага працэса, асабліва дзейнасці буйных карпарацый і трэстаў. Практыка гаспадарчага і сацыяльнага развіцця капіталізма 30-х і пасляваенных дзесяцігоддзяў пацвердзіла слушнасць англійскага эканаміста Дж. М. Кейнса (1883-1946 гг.) адносна шырокіх магчымасцяў дзяржавы ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных праблем грамадства.

*24 кастрычніка 1929 г. з краху на фондавай біржы ў Нью-Йорку пачаўся крызіс эканомікі* ***Злучаных Штатаў Амерыкі****, які атрымаў назву "Вялікай дэпрэсіі". Крызіс закрануў шырокія масы рабочых, служачых, інтэлігенцыі. Асабліва моцна пакутвалі дробныя і сярэднія прадпрымальнікі.*

*Выхад з крызісу, быў знойдзены на шляху буйнамаштабнага дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай, які здзейсніла адміністрацыя прэзідэнта Ф.Д. Рузвельта. На першым этапе рэформ была ўмацавана банкаўская сістэма: буйныя банкі атрымалі фінансавую дапамогу дзяржавы, мноства дробных банкаў перастала існаваць. Перастаў існаваць залаты стандарт, за кошт дзяржаўнага бюджэта ўрад вылучыў значныя пазыкі прамысловым, гандлёвым і транспартным кампаніям. Галоўнае месца ў так званым "Новым курсе Рузвельта" было адведзена аднаўленню прамысловасці. Згодна "Нацыянальнаму акту аб аднаўленні прамысловасці" (дзейнічаў з 1933 г. па 1935 г.) уводзілася сістэма дзяржаўнага рэгулявання прадпрыемствамі. Былі вылучаны 3,3 млрд. $ на арганізацыю грамадскіх работ для беспрацоўнай моладзі ад 18 да 25 гадоў, на якіх у студзені 1934 г. было ўсяго занята 5 млн. чалавек, дапамогу па беспрацоўю атрымлівалі 20 млн. амерыканцаў.*

*"Акт аб рэгуляванні сельскай гаспадаркі" (1933 г.) ставіў мэту павысіць кошт сельгаспрадукцыі праз скарачэнне яе аб'ёму, што ўзмацніла працэс канцэнтрацыі ў сельскай гаспадарцы ЗША. Паколькі акт супярэчыў Канстытуцыі ЗША, Вярхоўны Суд адмяніў яго ў 1936 г.*

*На другім этапе "новага курса" праводзіліся сацыяльныя рэформы, адбывалася станаўленне працоўнага законадаўства. "Нацыянальны акт аб працоўных зносінах" (1935) прызнаў за працоўнымі права на калектыўную абарону сваіх інтарэсаў праз прафсаюзы, калектыўныя дагаворы з прадпрымальнікамі. "Закон аб сацыяльным забеспячэнні" увёў сістэму выплаты пенсій па старасці і дапамогі інвалідам і беспрацоўным.*

*З дапамогай дзяржаўных інвестыцый урад Ф.Д. Рузвельта стымуляваў попыт, што адпавядала тэорыі Дж. М. Кейнса* ***кейнсіянства***[55]*. Да 1939 г. практыка дэфіцытнага фінансавання ўздзейнічала на аднаўленчыя працэсы ў*

---

[55] **Кейнсіянства** – тэорыя англійскага эканаміста Дж. М. Кейнса аб неабходнасці ўмяшання дзяржавы ў эканоміку для забеспячэння бесперапыннага эканамічнага росту, пераразмеркавання прыбытку ў сацыяльную сферу.

*эканоміцы ЗША. Дактрына Кейнса была прызнана тэарэтычнай асновай змяшанай эканомікі актыўнага ўмяшальніцтва дзяржавы ў рынак.*

*"Вялікая дэпрэсія", пачаўшыся ў ЗША, у 1930 г. ахапіла і краіны Заходняй Еўропы. У развітых краінах без работы апынуліся каля 30 млн. чалавек, разараліся цэлыя галіны вытворчасці. Раней за астатнія краіны на шлях выхаду з крызісу ўступіла **Швецыя**. Гэта было звязана з дзейнасцю Стакгольмскай школы эканамістаў і прыходам да ўлады ў 1932 г. урада сацыял-дэмакратаў. Дзяржаўныя інвестыцыі і грамадскія работы, як і ў ЗША, павысілі плацёжаздольнасць насельніцтва. Эканамісты Стакгольмскай школы прапанавалі праграму антыцыклічнай палітыкі. Цэнтральнае аб'яднанне прафсаюзаў і Аб'яднанне прадпрымальнікаў Швецыі заключыла ў 1938 г. "Пагадненне аб мірным спосабе дасягнення калектыўнага дагавору". Такім чынам, быў закладзены фундамент "народнага дома" – шведскай сацыял-дэмакратычнай мадэлі краіны ўсеагульнага дабрабыту. **Францыя** атрымала выгаду з набыццём Эльзаса і Латарынгіі, права эксплуатацыі Саара і германскія рэпарацыі. У пачатку 30-х гг. там таксама склалася дэмакратычная мадэль рэгуляванай эканомікі. Меней паспяховым было эканамічнае развіццё **Англіі**, за 10 год яна так і не дасягнула даваеннага ўзроўню;*

3) ***каманднa-адміністрацыйная сістэма (КАС)***, у працэсе стварэння якой бальшавікі пайшлі па шляху поўнай нацыяналізацыі сродкаў вытворчасці ў гады правядзення палітыкі "ваеннага камунізму" ў 1918-1920 гг., часткова адступілі ад гэтых прынцыпаў ў гады НЭПа (1921-1927 гг.) і канчаткова перайшлі да ўтварэння планавай дзяржаўнай эканомікі ў час правядзення індустрыялізацыі і прымусовай калектывізацыі ў 30-я гг.

***Прыкметы каманднa-адміністрацыйнай сістэмы (КАС):***

- адміністрацыйныя метады кіравання;
- звышжорсткая цэнтралізацыя сістэмы вытворчасці і размеркавання матэрыяльных рэсурсаў;
- характэрны для даіндустрыяльнай цывілізацыі пазаэканамічны прымус, які ажыццяўляўся на грунце феадальных і рабаўладальніцкіх метадаў, надзвычайных метадаў;
- манапольная ўласнасць камуністычнай і дзяржаўнай наменклатуры на сродкі вытворчасці, на канчатковы вырабляемы прадукт, адчужэнне непасрэдных вытворцаў ад уласнасці;
- слабая ўспрымальнасць да навукова-тэхнічнай рэвалюцыі (НТР). Супярэчнасці паміж КАС і аб'ектыўнай неабходнасцю ў тэхналагічным базісе, які адпавядаў нацыянальным інтарэсам краіны;
- пераважна экстэнсіўны тып эканамічнага развіцця;
- ураўняльны прынцып выплаты заработнай платы, размеркавання вынікаў працы ў спалучэнні з сістэмай прывілеяў;
- планавая эканоміка.

У другой палове 1930-х гг. пашыралася сістэма сацыяльнай абароны насельніцтва. Асабліва хуткія тэмпы роста назіраліся ў аўтамабільнай, авіяцыйнай, хімічнай і радыётэхнічнай прамысловасці. Развіваліся міжнародныя гандлёвыя сувязі, раслі аб'ёмы экспарта капітала, укараняліся новыя тэхнічныя вынаходніцтвы. Усё гэта прывяло да памяншэння беспрацоўя, вырашэння жыл-

лёвай і харчовай праблем, росту заработнай платы. Паляпшаліся ўмовы працы, што знізіла сацыяльную напружанасць. Але наступны сусветны эканамічны крызіс 1937-1938 гг. абвастрыў адносіны паміж вядучымі краінамі свету і падштурхнуў іх да пачатку Другой сусветнай вайны.

Першая палова XX ст. азнаменавалася новым рыўком у пашырэнні еўрапацэнтрычнага свету. Рэальнасцю станавілася геапалітычнае, эканамічнае і камунікатыўнае адзінства чалавецтва. Ствараецца Ліга Нацый, складваецца Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін – правобраз агульнапланетарнай палітыка-прававой сістэмы. Пры ўсёй адметнасці, супрацьлегласці ліберальна-дэмакратычнай і таталітарнай альтэрнатыў развіцця грамадства, з'яўляюцца і некаторыя агульныя заканамернасці – дэмакратызацыя палітычнага жыцця, сацыялізацыя дзяржавы і ўсёй сістэмы грамадскіх інстытутаў, развіццё інфармацыйнай прасторы, імклівае нарошчванне навукова-тэхнічнага патэнцыяла, больш складаная дыферэнцыяцыя сацыяльнай структуры. Крызіс 1929-1933 гг. паставіў канчатковую кропку на свабодна-прадпрымальніцкім капіталізме і зрабіў дзяржаўнае рэгуляванне пастаянным ключавым элементам эканамічнай і сацыяльнай сфер жыцця заходняга грамадства. Гэтыя змяненні ўжо ў другой палове стагоддзя прывядуць да паступовай трансфармацыі індустрыяльнага грамадства і фармаванню сусветнай постіндустрыяльнай інфармацыйнай цывілізацыі.

### Палітыка "ваеннага камунізма" і яе вынікі

Пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі 1917 г. на тэрыторыі былой Расійскай імперыі пачаліся сацыялістычныя пераўтварэнні ў эканоміцы. Другі Ўсерасійскі з'езд Саветаў (кастрычнік 1917 г.) прыняў "Дэкрэт аб зямлі" і тым самым абвясціў канфіскацыю буйнога прыватнага землеўладання, нацыяналізацыю зямлі і ўраўняльнае яе размеркаванне. Рэалізацыя гэтых палажэнняў праводзілася і на тэрыторыі Заходняй вобласці РСФСР, куды з лістапада 1917 г. увайшлі не акупаваныя Германіяй беларускія землі.

***Палітыка "ваеннага камунізма" (1918-1920 гг.)***, якая праводзілася ў рамках Савецкай Расіі і беларускіх зямель, вызваленых ад нямецкай акупацыі ў лістападзе 1918 г., уяўляла сабою тып гаспадарчай сістэмы, у якой не было эканамічнага механізма. Кіраванне абапіралася на адміністрацыйныя метады і жорсткую цэнтралізаваную адміністрацыйную структуру, пры якіх патрабавалася наладжваць улік, аналіз, кантроль, планаванне. Стаўка на ліквідацыю таварна-грашовых рыначных адносін прывяла да фактычнай адмены грошай і пераходу на талонную сістэму натураплаты, калі замест зарплаты выдаваўся паёк.

Галоўнымі задачамі ў гады грамадзянскай вайны і замежнай інтервенцыі былі правядзенне харчовай разверсткі[56] і манаполіі хлебнага гандлю, нацыяналізацыя ўсёй прамысловасці, жорсткае размеркаванне харчовых і прамысловых тавараў, усеагульная працоўная павіннасць. Быў ліквідаваны прыватны гандаль, адбылося адзяржаўленне кааперацыі. Рабілася спроба наладзіць прамы прадуктаабмен паміж горадам і вёскай, што вяло да натуралізацыі эканамічных сувязей.

---

[56] **Харчразвёрстка** – рэквізіцыя загараджальнымі атрадамі лішкаў хлеба ў насельніцтва для пакрыцця выдаткаў на армію і ўтрыманне рабочых, бралі яе большай часткай у якасці пазыкі, за папяровыя грошы.

Характэрна, што менавіта сельская бедната была ў вёсцы сілай, непасрэдна зацікаўленай ў палітыцы ваеннага камунізму: у правядзенні харчразвёрсткі савецкая ўлада кіравалася класавымі прынцыпамі (з беднаты не браць нічога, з серадлякоў – памяркоўна, з багатых – шмат), а пры размеркаванні прадуктаў да 25 % перадавалася беззямельным і малазямельным сялянам.

Першыя сацыяльна-эканамічныя новаўвядзенні Савецкай улады ў Беларусі сведчаць аб тым, што яны не мелі самастойнага зместу, а ў цэлым адпавядалі палітыцы, якую праводзіў урад Савецкай Расіі. Так, на падставе дэкрэта СНК РСФСР ад 11 студзеня 1919 г. уводзілася развёрстка дзяржаўнай нарыхтоўкі хлеба і іншых прадуктаў для забяспячэння Чырвонай Арміі, рабочых і служачых дзяржаўнага апарата. У ацэнцы гэтага факту гісторыкі разыходзяцца дыяметральна. "Толькі гэтая мера магла ўратаваць насельніцтва ад голаду", – упэўнены І.І. Коўкель і Э.С. Ярмусік [2, 357]. "Харчраскладка, якая ігнаравала інтарэсы сялянства, з'явілася прычынай голаду як у гарадах, так і сельскай мясцовасці", – гучыць у дысананс палажэнне І. М. Ігнаценкі [4, 75].

Прыняты пазней на аснове Канстытуцыі РСФСР 1918 г. Асноўны Закон БССР вызначыў галоўныя задачы на пераходны перыяд ад капіталізма да сацыялізму: ліквідацыю сацыяльнай няроўнасці, адмену прыватнай уласнасці на зямлю, лясы, нетры, воды, сродкі вытворчасці, пераход іх ў дзяржаўнае карыстанне. Праца была прызнана галоўным абавязкам грамадзян рэспублікі.

Прадэклараваныя прынцыпы былі ўзяты на ўзбраенне ўрадам і Кампартыяй ССР Літвы і Беларусі. Канкрэтныя дадзеныя аб рашучых мерах па ліквідацыі разрухі ў прамысловасці і на транспарце, паляпшэнні ўмоў працы, забеспячэнні працоўных прадуктамі харчавання, арганізацыі медыцынскага і культурнага абслугоўвання, правядзенні фінансава-крэдытнай палітыкі, тавараабмене з Украінай і Савецкай Расіяй служаць доказам цеснай эканамічнай сувязі з РСФСР. Напрыклад, акрамя тых сродкаў, якія былі атрыманы ад нацыяналізацыі прыватных банкаў і прадпрыемстваў, толькі за сакавік – ліпень 1919 г. Наркамфін РСФСР асігнаваў для народнай гаспадаркі ЛітБела 200 млн. рублёў, не ўлічваючы сродкаў іншых камісарыятаў [2, 357].

У лютым – верасні 1919 г., у першыя месяцы польска-савецкай вайны, сацыяльна-эканамічная дзейнасць на беларускіх землях праводзілася ўрадавымі ўстановамі Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Літвы і Беларусі (ЦВК і Саўнаркама), мясцовымі органамі савецкай улады і ЦК КП(б) Літвы і Беларусі. ЛітБел не паспела сфармавацца як дзяржава з ўсёй атрыбутыкай сацыяльна-палітычнага інстытута такога кшталту: не былі дакладна вызначаны граніцы, праект Канстытуцыі ЛітБела, які быў падрыхтаваны на грунце Асноўнага закона РСФСР, так і не быў прыняты, Беларуска-літоўская армія праіснавала толькі тры месяцы. І самае галоўнае – тэрыторыя абвешчанай рэспублікі ў хуткім часе стала арэнай баявых дзеянняў польска-савецкай вайны.

Калі зайшла гаворка аб утварэнні ЛітБела, прадстаўнікі БССР прапанавалі зацвердзіць двух народных камісараў па земляробству – асобна па Літве і па Беларусі. Лічылася, што ў БССР ленінскі Дэкрэт аб зямлі праводзіўся ў жыццё больш паслядоўна, з перадачай канфіскаваных зямель сялянам. Але на сёння агульнапрызнаным з'яўляецца факт, што насуперак патрабаванням Дэкрэта аб зямлі ўрад ЛітБела не надзяляў сялян канфіскаванай памешчыцкай зямлёй, а ўзяў курс на арганізацыю ў іх калектыўных форм землеўладкавання. Аграрныя

пераўтварэнні Савецкай улады на тэрыторыі былой Мінскай губерні, якая ўваходзіла ў склад ЛітБела, не прывялі да рэвалюцыйнага падзела зямлі, дэкрэт аб сацыялізацыі не быў распаўсюджаны на ўсю тэрыторыю Беларусі, і таму ўраўняльнага размеркавання зямлі не існавала. Значная частка канфіскаваных царкоўных, памешчыцкіх і іншых земель Мінскай губерні, якія не ўвайшлі ў дзяржаўны фонд, была размеркавана сярод малазямельных сялян і сельскагаспадарчых рабочых [3, 46].

У вырашэнні зямельнага пытання дапускаліся памылкі – кіраўніцтва Літоўска-Беларускай рэспублікі ўзяло абсалютна няправільны, антыленінскі курс пры вырашэнні аграрнага пытання, ў выніку чаго Савецкая ўлада не была падтрымана шырокімі масамі працоўнага сялянства. Прычына гэтых памылак заключалася ў тым, што ўрад выступаў супраць падзелу былой памешчыцкай зямлі сярод бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак, і гэта выклікала вядомае незадавальненне сялян. “Многія павятовыя з’езды Саветаў Літоўска-Беларускай ССР, якія адбываліся ў пачатку 1919 г., выказаліся за ўтварэнне ў памешчыцкіх маёнтках саўгасаў”, а “некаторыя сяляне нават адмаўляліся атрымаць у карыстанне памешчыцкую зямлю, баючыся новага вяртання памешчыкаў” [6, 73]. Існуе таксама дакументальнае пацверджанне таго, што і да калгасаў, арганізаваных у памешчыцкіх маёнтках, у сялян былі негатыўныя адносіны – у іх бачылі былыя памешчыцкія эканоміі [5, 213]. Адначасова ў тагачасных рашэннях з’ездаў Саветаў большасць сялян патрабавала надзялення іх памешчыцкай зямлёю, інвентаром. У здзяйсненні аграрных пераўтварэнняў у інтарэсах бедных слаёў насельніцтва вёскі не было вопыта і ў іншых партыйных арганізацый краіны.

Арарныя пераўтварэнні ў вызваленай частцы Мінскай губерні ў канцы 1919-1920 г. пад кіраўніцтвам Кампартыі ЛітБела таксама ўтрымлівалі сур’ёзныя памылкі, былі супярэчлівымі і непаслядоўнымі. Пачатак афіцыйнаму выпраўленню гэтых памылак – надзяленню сялян зямлёй – быў пакладзены на пасяджэнні ЦК КП(б) ЛіБ 2 сакавіка 1920 г. Новы накірунак ў аграрнай палітыцы быў замацаваны ў “Тэзісах па аграрнаму пытанню”, прынятых ЦК КП(б) ЛіБ 24 мая 1920 г. З прыняцця гэтага дакумента пачалося на Беларусі практычнае ажыццяўленне ленінскага Дэкрэта аб зямлі.

У складаных умовах ваеннага часу 1919-1920 гг. ў Літоўска-Беларускай ССР праводзілася калектывізацыя. Першыя саўгасы і калгасы ўтвараліся, як правіла, у былых памешчыцкіх маёнтках, што стала асаблівасцю Беларусі, ў адрозненне ад іншых губерняў Расіі, дзе калектыўныя гаспадаркі былі арганізаваны на надзельнай зямлі. Так, у Магілёўскай губерні ў маі 1919 г. з 225 калгасаў 75 % было ўтворана на памешчыцкай зямлі, 10 % – на дзяржаўнай, і толькі 15 % – на надзельнай [5, 190].

Створаныя калгасы былі нерэнтабельнымі, стратнымі. Паспешна арганізаваныя саўгасы, ТОЗы, камуны і арцелі не апраўдалі надзей ні органаў улады, ні сялянства – не хапала цяглавай сілы, насення, спецыялістаў. Вясной 1919 г. была засеяна толькі палова калгасных земель. Каб выправіць становішча летам 1919 г. кіраўніцтва ЛітБела пачало здаваць сялянам частку земель у арэнду на ільготных умовах, але вырашыць праблему не ўдалося.

Сістэма нармаванага размеркавання харчовых тавараў у ССРБ і ССРЛітБел капіравала існуючую тады ў РСФСР – на паёк былі пастаўлены толькі рабочыя

дзяржаўнага і прыватнага сектараў і дзяржаўныя служачыя. "Цяжкім было становішча гарадскіх пластоў – мяшчан, служачых, рамеснікаў і саматужнікаў, дробных прадпрымальнікаў – каб атрымаць сродкі на пражыццё, многія непралетарскія сем'і вымушаны былі гандляваць на "таўкучцы" "рэшткамі былой роскашы"[57]. На пачатак 1921 г. валавы збор збожжавых культур у параўнанні з даваенным скараціўся больш чым ў 2 разы. Паменшыліся пасяўныя плошчы, пагалоўе жывёлы. Старшыня беларускага ўрада А.Р. Чарвякоў у 1921 г. адзначыў: з-за працяглага недахопу харчоў насельнікам БССР пагражала выраджэнне [1, 140].

Але ў правядзенні палітыкі "ваеннага камунізму" была дасягнута галоўная задача бальшавіцкага ўраду – захаванне савецкай улады і заканчэнне вайны. Эканамічнае становішча беларускіх зямель пасля заканчэння замежнай ваеннай інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны было цяжкім. Даўжыня чыгункі скарацілася на 2/3, не хапала паліва, знасіўся машынны парк. Працавала толькі 40 % буйных прамысловых прадпрыемстваў. Аб'ём валавай прадукцыі складаў толькі 15-20 % да паказчыкаў 1913 г. Узровень тэхнічнай і вытворчай базы прамысловасці быў нізкім.

За гады вайны змяніўся склад рабочага класа Беларусі – не хапала кваліфікаваных рабочых, толькі 1/3 з іх з'яўлялася патомнымі пралетарыямі.

Была парушана фінансавая сістэма: на 1 студзеня 1919 г. пакупная здольнасць рубля знізілася ў параўнаннні з 1913 г. у 16 разоў. У 1920 г. заработная плата рабочых складала 10-20 % даваеннага ўзроўню. Сяляне сталі патрабаваць права самастойна распараджацца зямлёю і прадукцыяй, выказвалі незадаволенасць канфіскацыяй лішкаў. Вясной 1921 г. Беларусь апынулася ў хвалі 89 сялянскіх выступленняў з ярка акрэсленай палітычнай афарбоўкай. Узброеннае паўстанне маракоў Кранштата, якія патрабавалі адмены харчразвёрсткі і свабоднага гандлю хлебам, адлюстравала настроі сялянства ў цэлым. У 1920-1921 гг. савецкія рэспублікі перажывалі найцяжэйшы эканамічны крызіс, і гэта стала прычынай прыняцця ленінскім урадам сістэмы надзвычайных мер, скіраваных на аднаўленне эканомікі і стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы індустрыяльнага грамадства. Каб стабілізаваць сітуацыю і прадухіліць страту ўлады, лідэры савецкай краіны схіліліся да адмовы ад рэвалюцыйнай практыкі дзеянняў на карысць рэфармісцкай – у савецкую сістэму былі ўключаны элементы рыначнай эканомікі.

## Асаблівасці ажыццяўлення НЭПа ў Беларусі. Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы індустрыяльнага грамадства

***НЭП – новая эканамічная палітыка*** савецкай дзяржавы ў пачатку 1920-х гг., пасля грамадзянскай вайны і замежнай інтэрвенцыі, якая абапіралася на прынцыпы выкарыстання таварна-грашовых (рыначных) адносін і матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках сваёй дзейнасці. З канца 1920-х гг. гэтая палітыка была згорнута ў сувязі з увядзеннем "сталінскай мадэлі" развіцця грамадства.

Пераход да НЭПу прадугледжваў выкарыстанне планавання, рэалізацыя якого ўскладвалася на планавую камісію – ***Дзяржплан*** – да мая 1923 г. яго функцыі ажыццяўляла пераважна Эканамічная нарада пры СНК БССР.

---

[57] Гл. Гісторыя Беларусі: у 6 тамах / А. Вабішчэвіч і інш.; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэдактар) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5. Беларусь ў 1917-1945 гг. – С. 124-140.

***Параўнальная характарыстыка эканамічнай палітыкі бальшавікоў у 1917-1927 гг.***

| "Ваенны камунізм" | Новая эканамічная палітыка |
|---|---|
| 1918-1920 гг. | 1921-1927 гг. |
| Прычыны: | |
| 1) імкненне захаваць савецкую ўладу ў час вайны<br>2) спроба камуністаў ажыццявіць некаторыя камуністычныя ідэалы – ліквідацыю грошай, зацвярджэнне камунны і г. д. | 1) заканчэнне вайны;<br>2) пераважнасць сялянскага насельніцтва; неабходнасць пераадолення палітычнага крызісу, выкліканага незадаволенасцю сялянства палітыкай савецкай улады;<br>3) неабходнасць адраджэння эканомікі |
| Адрозненні ў горадзе: | |
| 1) ураўнаванне заработнай платы;<br>2) дзяржаўнае забеспячэнне прадпрыемстваў;<br>3) усеагульная працоўная павіннасць;<br>4) цэнтралізацыя кіравання эканомікай;<br>5) усеагульная нацыяналізацыя прадпрыемстваў | 1) заработная плата ў адпаведнасці з кваліфікацыяй і выработкай;<br>2) перавод прадрыемстваў на гаспадарчы разлік;<br>3) пераход да свабоднага найму працоўнай сілы, легалізацыя беспрацоўя;<br>4) утварэнне саўнаргасаў – тэрытарыяльных упраўленняў эканомікай;<br>5) дазвол арэнды і прыватных прадпрыемстваў |
| Адрозненні ў вёсцы: | |
| 1) харчразвёрстка;<br>2) імкненне насадзіць у вёсцы калектыўныя гаспадаркі;<br>3) натуральны падатак;<br>4) забарона эксплуатацыі | 1) харчпадатак;<br>2) свабодны выбар формы землекарыстання;<br>3) грашовы падатак (з 1923/24 гг.);<br>4) дазваленне найма рабочай сілы, арэнды зямлі і інвентара |
| Адрозненні ў гандлі: | |
| 1) забарона падпольнага гандлю;<br>2) спроба ажыццявіць прамы тавараабмен паміж вёскай і горадам | 1) дапушчэнне свабоды гандлю з 1921 г.;<br>2) стабілізацыя фінансавай сістэмы;<br>3) суіснаванне і канкурэнцыя дзяржаўнага, кааператыўнага і прыватнага гандлю |

***Сельская гаспадарка.*** Пачаткам НЭПа стаў ***X з'езд РКП(б) ў сакавіку 1921 г.***, на якім была прынята праграма мер пераходу да сацыяльных рэформ. Дазвалялася частковая дэнацыяналізацыя, развіццё прадпрымальніцтва ў гандлі, дробнай і саматужнай прамысловасці, нават ***канцэсіі*** (арэнда дзяржаўных прадпрыемстваў замежнымі прадпрымальнікамі). Харчразвёрстка была заменена на харчпадатак, які быў меншы па памерах, аб'яўляўся загадзя, складаў спачатку 20 % ад атрыманага ўраджаю, а потым – ужо як не натуральны, а сельскагаспадарчы грашовы падатак зменшыўся да 10 %. З 1 студзеня 1924 г. харчпадатак збіраўся толькі чырвонцамі ў памеры да 5 % даходу з аднаго двара.

У верасні 1922 г. у РСФСР быў прыняты "Закон аб працоўным землекарыстанні", у якім абгаворваліся такія формы землеўладкавання, як арцель, абшчына, прыватнае ўладанне ў выглядзе вотрубаў і хутароў і г. д. Дазвалялася

здача зямлі ў арэнду і выкарыстанне наёмнай працы. У 1920-1923 гг. 89 % насельніцтва рэспублікі па-ранейшаму пражывала ў сельскай мясцовасці. Увядзенне НЭПа супала па часе з перадачай зямлі сялянам, якім яна патрабавалася асабліва востра. Але большасць сельскіх гаспадарак зямлі не атрымала: 23,3 % усіх зямель перадалі сялянам, 69,9 % – у дзяржаўныя лясныя і зямельныя фонды, 3,8 % – саўгасам, калгасам, кааператывам. Патрэбна ўлічваць, што ў Беларусі пад балотамі знаходзілася 16 % усёй зямлі, пад лясамі – 25 %[58].

Жывёлагадоўля была развіта слаба. 1/5 гаспадарак не была забяспечана цяглавай сілай і вяла апрацоўку зямлі з дапамогай суседзяў. Агульная таварнасць вёскі была нізкай, у 1926 г. яна не дасягнула даваеннага ўзроўню.

Народны камісар земляробства БССР з 1921 да 1929 г. ***Дз.Ф. Прышчэпаў*** склаў "Пяцігадовы перспектыўны план развіцця ляснoй і сельскай гаспадарак БССР на 1925-1929 гг.", які прадугледжваў стварэнне хутароў і дробных пасёлкаў па тыпу вотрубаў. У адрозненне ад сталыпінскай аграрнай рэформы пры землеўпарадкаванні праводзілася дадаткова надзяленне малазямельных сялян за кошт пераразмеркавання зямлі, адразання лішкаў у кулакоў. З гэтай мэтай быў створаны спецыяльны зямельны фонд. Такім чынам Дз. Прышчэпаў праводзіў дзяржаўную палітыку не ў інтарэсах кулакоў, як пасля яго абвінавачвалі, а ў інтарэсах сялян, якія падтрымлівалі яе[59]. У выніку да канца 20-х гг. аднаасобнае землекарыстанне (двары, хутары і вотрубы) на Беларусі складала больш за 25 % сялянскага землекарыстання.

У той жа час ў гады НЭПа ў рэспубліцы ўмацавалася сельскагаспадарчая кааперацыя – пачалося развіццё гаспадарак калектыўнага землекарыстання (у формах вытворчай кааперацыі – сельгасарцелей, камун, таварыстваў па сумеснай апрацоўцы зямлі (ТОЗаў); у разнастайных прасцейшых формах кааперацыі – крэдытных, забеспячэнскіх, збытавых; у спецыялізаваных відах кааператыўных аб'яднанняў – меліяратыўных і крэдытных, машынных і конна-машынных, масларобных і сыраварных, жывёлагадоўчых і насенняводчых і г. д.). Хаця да 1927 г. у Беларусі ў асноўным захоўвалася свабода выбару землекарыстання, Зямельны кодэкс БССР 1925 г. ужо абмяжоўваў развіццё хутароў і вотрубаў, вызначаў адрэзкі зямель у тых, хто меў яе звыш нормы, рэкамендаваў калектыўныя формы землекарыстання.

***Фінансавая палітыка.*** Зацікаўленасць таваравытворцаў у паглыбленні рэфармавання эканамічных адносін на аснове заахвочвання іх ініцыятывы і прадпрымальнасці прымусіла ўлады ўжо з восені 1921 г. зрабіць новае адступленне ад прынцыпаў нярыначнай эканомікі – радыкальна пераўтварыць тавараабмен у куплю-продаж. У жніўні 1921 г. СНК БССР прыняў пастанову "Аб правядзенні гандлю", якая дазваляла ўсім грамадзянам з 16 гадоў свабодна гандляваць прадуктамі сельскай гаспадаркі, рамеснымі і фабрычнымі вырабамі. Было знята абмежаванне гандлю мясцовымі рынкамі – дазволены гандаль на кірмашах, дзейнічалі гандлёвыя біржы. Прыватны гандляр найбольш актыўна праяўляў

---

[58] Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2: Люты 1917-1997 гг. – С. 129.

[59] ***Прышчэпаўшчына*** – абвінавачванне партыўным кіраўніцтвам КП(б) ў нацыянал-дэмакратызме, так званым "правым ўхілу" у партыі і дзяржаве, контррэвалюцыйнай антыкалгаснай дзейнасці ў галіне сельскай гаспадаркі (у тым, што рабілі стаўку на беларускага кулака і г. д.). Калі Дз.Ф. Прышчэпаў быў зняты з пасады наркома земляробства БССР і арыштаваны ў 1930 г. па сфабрыкаванай справе "Саюза вызвалення Беларусі", работнікі Наркамзема ў знак пратэсту падалі заявы аб звальненні.

сябе ў рознічным гандлі, дзяржаўныя органы – у аптовым, кааператыўныя – спалучалі абедзве функцыі. Такім чынам, развіваліся тры віды гандлю: прыватны, дзяржаўны, кааператыўны.

Вялікія памеры набылі інфляцыйныя працэсы, якія перайшлі ў гіперінфляцыю. У лютым 1922 г. даваенны залаты рубель ацэньваўся ў 150 тыс. савецкіх рублёў. Ва ўмовах разрухі і галечы фармаванне бюджэту з'яўлялася надзвычай складанай справай. Асноўнымі яго крыніцамі былі сельская гаспадарка, даходы з прыватных і дзяржаўных прадпрыемстваў, кампартыя і савецкая ўлады не грэбавалі ніякімі сродкамі, уключаючы канфіскацыю таго, што было назапашана на працягу стагоддзяў служыцелямі розных канфесій. ***Фінансавая рэформа*** Г.Я. Сакольнікава ўяўляла сабою серыю такіх мерапрыемстваў, як:

- аднаўленне ў 1921 г. Дзяржбанка і стварэнне акцыянерных, камерцыйных і іншых банкаў;
- арганізацыя ўнутранага валютнага рынку;
- развіццё знешняга гандлю, стымуляванне экспарту;
- збіранне валютных рэзерваў для ажыццяўлення валютных інтэрвенцый;
- ліквідаванне бюджэтнага дэфіцыту;
- эмісія ў 1922 г. Дзяржбанкам чырвонцаў наміналам 10 рублёў, меўшых намінальнае залатое забеспячэнне (7,74 г. чыстага золата) і падтрыманне яго валютнага курсу. Да лета 1923 г. ён не выходзіў з буйнога аптовага абароту і міжбанкаўскіх разлікаў. Але вясной 1923 г. эмісія чырвонцаў выклікала стыхійнае выцісканне саўзнакаў, і летам чырвонец пранік у рознічны абарот;
- 1924 г. – спыненне выпуску саўзнакаў, іх выкуп за новыя казначэйскія білеты з намінальным залатым зместам вартасцю 1, 3 і 5 рублёў, што ўяўлялі сабою разменныя купюры чырвонца і разменныя срэбраныя і медныя манеты. На валютным рахунку ўнутры краіны і за мяжой чырвонцы свабодна абменьваліся на золата і замежныя валюты па даваенным курсе царскага рубля – 1 амерыканскі долар каштаваў 1 рубель 94 капейкі.

***Прамысловасць.*** Фактычна да 1926-1927 гг. прамысловасць расла галоўным чынам колькасна, за кошт далучэння Віцебшчыны і Гомельшчыны. Асноўнымі галінамі буйной прамысловасці былі харчовая, дрэваапрацоўчая і папяровая. Многія прадпрыемствы з другой паловы 1921 г. былі зняты з дзяржбюджэту і пераведзены на гаспадарчы разлік (з студзеня 1922 г. – папяровая прамысловасць, да канца 1922 г. – амаль уся дзяржаўная прамысловасць). Перавод прамысловасці на закладзеныя ў НЭПе прынцыпы гаспадарання запатрабаваў новых форм арганізацыі прамысловай вытворчасці. Вынікам стаў пераход да гаспадарчых аб'яднанняў як самастойнай гаспадарчай адзінкі. Замест главкаў буйной нацыянальнай прамысловасцю кіравалі ***трэсты*** – аб'яднанні аднародных ці звязаных паміж сабой прадпрыемстваў, якія атрымалі поўную гаспадарчую і фінансавую незалежнасць, у тым ліку права выпуску доўгатэрміновых аблігацыйных пазык, што стала сродкам пераходу да гаспадарчага разліку. У 1924 г. у БССР дзейнічалі 9 трэстаў – Скуратрэст, Металатрэст, Дзяржспірт, Паператрэст, Шклотрэст, Харчтрэст, Торфтрэст і іншыя, ствараліся ***сіндыкаты*** – аб'ядніанні трэстаў на аснове кааперацыі. Была адноўлена грашовая аплата працы, уведзены тарыфы зарплаты, адмянялася працоўная павіннасць.

Аказвалася патрымка дробным, сярэднім і кааператыўным прадпрыемствам. Вернуты пад прыватнае ўпраўленне шляхам здачы на 2-5 гадоў у арэнду

раней нацыяналізаваныя прамысловыя аб'екты (арэндная плата аказвалася натурай). На долю прыватнага сектара прыходзілася ад 1/5 да 1/4 прамысловай прадукцыі. У дробнай прамысловасці было занята 73 % рабочых, якія выпускалі 58 % валавай прадукцыі.

Для забеспячэння эканамічнай стабільнасці неабходна было правядзенне індустрыялізацыі. З 1926 г. разгарнулася будаўніцтва шэрага буйных прадпрыемстваў – Бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната, Гомсельмаша, Магілёўскай фабрыкі штучнага шоўку і г. д.

У снежні 1920 г. у мэтах хуткага аднаўлення гаспадаркі быў распрацаваны план дзяржаўнай элекрыфікацыі Расіі (ГОЭЛРО), згодна з якім у БССР было пабудавана звыш 20 электрастанцый. З 1927 г. было пачата будаўніцтва Беларускай дзяржаўнай раённай электрастанцыі (БелДРЭС) каля г. Орша. На працягу 1924-1928 гг. прадукцыя фабрык і заводаў у БССР павялічылася ў 2,3 раза. Сярод прамысловых галін найбольш дынамічна аднаўляліся, а затым развіваліся, тарфяная, металаапрацоўчая, электратэхнічная.

***Эканамічныя крызісы ў гады НЭПа:***

І – "крызіс збыту" разгарнуўся восенню ***1923*** г. ва ўмовах таварнага голаду. Са жніўня 1922 г. назіраліся "нажніцы цэн"[60], што было выклікана больш хуткім аднаўленнем сельскай гаспадаркі, тым, што Кампартыя і савецкі ўрад намагаліся паскорыць развіццё індустрыі за кошт вёскі шляхам узнімання цэн на прамысловыя тавары;

ІІ – крызіс на рубяжы ***1925/1926*** гг. быў звязаны з "вострым дэфіцытам тавараў" па прычыне невыканання плана хлебанарыхтовак і недахопу сродкаў для распачаўшайся індустрыялізацыі, калі дзяржава зноў звярнулася да надзвычайных мер. Крызіс паказаў, што вельмі цяжка накіраваць накапленні прыватнага сектара на мэты, якія выбірае дзяржава;

ІІІ – сацыяльна-палітычны крызіс на рубяжы ***1927/1928*** гг., калі дзяржава канчаткова адмовілася ад рыначных механізмаў рэгулявання эканомікай.

Частыя крызісы НЭПа тлумачыліся тым, што партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва імкнулася да паскоранай мадэрнізацыі грамадства пад сцягам "рыўка ў сацыялізм", што не магло не весці да пастаянных збояў у працэсе ўзнаўлення. Адмаўленне ад гэтай палітыкі стала заканамерным наступствам абавастрэння супярэчнасцяў НЭПа.

***Супярэчнасці НЭПа:***

- неадпаведнасць паміж аўтарытарнай палітычнай сістэмай і рыначна-адміністрацыйнымі метадамі эканомікі;
- адсутнасць рыначнага механізма ў адносінах паміж лёгкай і цяжкай прамысловасцю, апошняя працавала на дзяржаўных заказах і датацыях;
- адсутнічала рэальная канкурэнцыя паміж дзяржаўнымі і кааператыўнымі прадпрыемствамі;
- не дала доўгачасовага эфекту грашовая рэформа: прычыны гэтага – малы аб'ём савецкага экспарту, нізкая велічыня залатога запасу чырвонца;
- па прычыне дзяржаўнай манаполіі знешняга гандлю адсутнічалі нармальныя сувязі з сусветнай эканомікай.

---

[60] **"Нажніцы цэн"** – істотная розніца паміж цэнамі на прамысловыя і сельскагаспадарчыя тавары. Часцей прамысловыя тавары дарагія, а сыравіна і прадукты сельскай гаспадаркі пры збыце іх вытворцам – вельмі танныя.

***Вынікамі НЭПа*** сталі: аднаўленне сельскай гаспадаркі ў 1926 г., прамысловасці ў 1926/1927 гг.; павелічэнне колькасці прадпрыемстваў; напаўненне спажывецкага рынку, развіццё абаротнага гандлю. ***Менавіта с ў 20-я гг. XX ст. у Беларусі была закладзена матэрыяльна-тэхнічная база індустрыяльнага грамадства***[61].

## Індустрыялізацыя ў БССР

Беларусь да пачатку 1926 г. заставалася рэспублікай са слабаразвітай індустрыяй – доля прамысловай прадукцыі складала толькі 23,5 % (у 1923/1924 гг. яе удзельная вага ў прамысловасці СССР складала толькі 0,7 %, а ў 1925/1926 гг. – 0,67 %). Адчувалася неабходнасць у мадэрнізацыі эканамічнага комплексу. Востра стаяла праблема інжынерна-тэхнічных кадраў, кваліфікаваных рабочых. Пераадолець тэхніка-эканамічную адсталасць магчыма было толькі разгарнуўшы шырокую рэканструкцыю старых прадпрыемстваў і новае капітальнае будаўніцтва. Узрастала цэнтралізацыя ў кіраванні грамадска-палітычнай, ідэялагічнай, культурнай і эканамічнай сферамі жыцця. Развіццё прамысловасці і транспарту сталінская большасць бачыла толькі ў сацыялістычным напрамку. Гэта азначала курс на жорсткае планаванне, высокую ступень цэнтралізацыі кіравання, фактычна абсалютную адсутнасць прыватнага сектару і іншыя меры. Дадзеная палітыка індустрыялізацыі была сфармулявана на XIV з'ездзе (снежань 1925 г.) і пацверджана XV з'ездам Усесаюзнай КП(б) у снежні 1927 г. 8 верасня 1926 г. СНК СССР прыняў рашэнне максімальна ўзмацніць абкладанне падаткамі прыватнага капіталу, перайсці да поўнага адзяржаўляння дробнай вытворчасці і гандлю.

***Сацыялістычная індустрыялізацыя*** – палітыка Камуністычнай партыі і савецкага ўрада, якая мела мэту стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу сацыялізму, заснаваць дзяржаву з магутным эканоміка-вытворчым, навукова-тэхнічным і абаронным патэнцыялам, забяспечыць рост прадукцыйнасці працы, няўхільнае павышэнне дабрабыту працоўных. У аснове афіцыйнай палітыкі ляжала сталінскае ўяўленне аб сацыялізме як унітарнай сістэме кіравання грамадствам.

Індустрыялізацыя ў БССР праходзіла як састаўная частка адзінага эканамічнага працэсу ўсяго Савецкага Саюза. Меліся і свае ***асаблівасці***:

1) прыгранічнае знаходжанне зрабіла немэтазгодным развіццё ў Беларусі прадпрыемстваў цяжкай прамысловасці[62] і ваеннага комлексу. Тут развіваліся легкая[63], пераважна перапрацоўчая прамысловасць;

2) адсутнасць нафты, газа, каменнагу вуглю, руд металу і сыравіны для будаўніцтва абумовіла арыентацыю прамысловасці на мясцовую сыравіну;

3) адчуваўся недахоп кваліфікаваных кадраў.

План ажыццяўлення індустрыялізацыі з улікам асаблівасцей Беларусі прыняў Пленум ЦК КП(б)Б 27-29 красавіка 1926 г. – ён быў накіраваны на развіццё керамічнай, шкляной, запалкавай, дрэваапрацоўчай, ільнапрадзільнай, па-

---

[61] **Індустрыяльнае грамадства** – грамадства, для якога характэрны развітая і складаная сістэма падзелу працы пры моцнай яе спецыялізацыі, масавая вытворчасць тавараў на шырокі рынак, аўтаматызацыя вытворчасці і кіравання, навукова-тэхнічная рэвалюцыя.

[62] **Цяжкая прамысловасць** – галіны прамысловасці групы "А", дзе выпрабляюцца сродкі вытворчасці (машыны і абсталяванне).

[63] **Лёгкая прамысловасць** – галіны прамысловасці групы "Б", дзе вырабляюцца тавары народнага спажывання.

пяровай, гарбарнай, харчовай і іншых галін вытворчасці. Няцяжка заўважыць, што спецыялізацыя прамысловага сектара эканомікі краю мала адрознівалася ад дарэвалюцыйнага перыяду і захоўвала традыцыйную спецыфіку і сувязь з эканамічным сектарам Расіі.

Для забеспячэння тэмпаў індустрыялізацыі ўжывалася амаль палова нацыянальнага прыбытку, зберажэнні працоўных (праз сістэму дзяржаўных пазык, аблігацый), асігнаванні з агульнадзяржаўнага бюджэту. За тры гады індустрыялізацыі былі пабудаваны фанерны завод у Віцебску, скуразавод "Бальшавік" і галантэрэйная фабрыка "Беларуска" у Мінску, запалкавая фабрыка і ільночасальны камбінат у Рэчыцы, (Мінск) і г. д. – усяго 150 фабрык і заводаў.

Пачатак доўгатэрміноваму планаванню савецкай эканомікі быў пакладзены ўвядзеннем ленінскага плана ГОЭЛРО. У сярэдзіне 1920-х гг. пачало ўводзіцца планаванне на 1 год, калі яно перапляталася з прыватнымі ініцыятывай і капіталамі. З мэтай пераходу да планавага развіцця гаспадаркі, сацыяльнай і культурнай сфер на пяцігадовы тэрмін на XV з'ездзе УКП(б) (снежань 1927 г.) былі складзены "Дырэктывы па складанню пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі". Першы пяцігадовы план развіцця СССР прынялі ў красавіку-маі 1929 г. на XVI канферэнцыі УКП(б) і V з'ездзе Саветаў СССР.

***Першы пяцігадовы план (1928-1932 гг.)*** развіцця народнай гаспадаркі і культуры БССР быў зацверджаны IX з'ездам Саветаў рэспублікі ў маі 1929 г. Яго характэрнай асаблівасцю з'яўлялася збалансаванасць і дакладная абгрунтаванасць мэт і задач пяцігодкі. Галоўная задача плана фармулявалася як фарсіраваны тэмп індустрыялізацыі Беларускай ССР, павышэнне ўдзельнай вагі прамысловасці ў народнай гаспадарцы і на гэтай аснове ліквідаванне эканамічнай і культурнай адсталасці рэспублікі, выцісканне капіталістычных элементаў у горадзе і вёсцы. Аднак першаму сакратару ЦК УКП(Б) І. Сталіну планавыя заданні здаліся недастатковымі, і ён абвясціў лозунг "Пяцігодку ў 4 гады!" Спрабавалі ажыццявіць "вялікі скачок" ў развіцці СССР, у ходзе рэалізацыі якога вядучымі сталі камандныя метады. Розныя рэгіёны краіны былі звязаны ўзаемнымі пастаўкамі сыравіны, камплектуючых дэталей, спажываннем гатовай прадукцыі.

У другой палове 1929 г. у план былі навязаны новыя, павышаныя заданні, таму ў 1931 г. планавыя паказчыкі БССР не былі дасягнуты. Гэта сталі звязваць са зрывам паставак сыравіны і матэрыялаў з іншых рэспублік (у 1937 г. удзельная вага прадпрыемстваў, што працавалі на сыравіне з іншых рэспублік СССР, складала 46 %)[64]. Паскарэнне вяло да звышнапружанасці і ломкі ўсёй сістэмы кіравання, пастаянных збояў у вытворчасці, а масавыя арышты спецыялістаў і прыток неабучаных рабочых – да росту аварый, якія ў большасці аб'яўляліся "вылазкамі класавага ворага".

У 1932 г. XVII партыйная канферэнцыя УКП(б) ***канчаткова адмовілася ад НЭПу,*** адзначыўшы яе несумяшчальнасць з палітыкай партыі. Такім чынам, на змену гаспадарчаму разліку ў эканоміцы прыйшлі камандна-адміністрацыйныя метады.

Паводле закона ЦВК СССР ад 5 студзеня 1932 г. "Аб рэарганізацыі саўнаргасаў", Беларускі саўнаргас быў пераўтвораны ў Наркамат лёгкай прамысловасці БССР, а прадпрыемствы цяжкай і лясной прамысловасці перададзены са-

---

[64] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі: у 6 тамах. – Мн., 2006. – Т. 5. – С. 275.

юзным наркаматам – у рамках СССР стваралася цэнтралізаваная сістэма кіравання прамысловасцю, трэсты спынілі існаванне.

Гандаль замяняўся размеркаваннем рэсурсаў “зверху” па фондах і разнарадцы. Забеспячэнне індустрыялізацыі грашовымі сродкамі было ўскладзена на Наркамат фінансаў, а матэрыяльнае і тэхнічнае забеспячэнне прадпрыемстваў – на Дзяржплан і галіновыя наркаматы.

Канцэнтрацыя на фабрыках і заводах значных працоўных рэсурсаў, развіццё вытворчай актыўнасці рабочых, мабілізацыя іх на самаадданую працу, пэўнае ўдасканаленне кіравання, стварэнне матэрыяльных фондаў для ажыццяўлення індустрыялізацыі дазволілі дасягнуць дастаткова ўнушальных тэмпаў і вынікаў. Ужо за гады першай пяцігодкі ў БССР было пабудавана 78 буйных і 480 сярэдніх і дробных прадпрыемстваў пераважна групы “Б” (швейная фабрыка “Сцяг індустрыялізацыі” і панчошна-трыкатажная фабрыка імя КІМ ў Віцебску, швейная фабрыка імя Камінтэрна ў Гомелі, “Гомсельмаш”, Магілёўская фабрыка штучнага валакна, буйнейшая ў рэспубліцы БелДРЭС паблізу Оршы і інш.). Павысілася ўдзельная вага металаапрацоўчай, тарфяной, швейнай, тэкстыльнай і абутковай галін прамысловасці, упершыню ўзніклі машынабудаванне, станкабудаванне, хімічная вытворчасць.

***Другая пяцігодка (1933-1937 гг.)*** ў БССР дала павелічэнне валавай прадукцыі амаль ў 2 разы, хаця будаўніцтва, асваенне новай тэхнікі давалася нялёгка. Каля 90 прадпрыемстваў было рэканструявана. Упершыню былі ўведзены ў строй Гомельскі шклозавод, Магілёўскія аўтарэмонтны і трубаліцейны заводы, Аршанскі ільнокамбінат, Бабруйскі гідролізны завод, другая чарга БелДРЭС і іншыя – усяго 1700 прадпрыемстваў. БССР у 1937 г. давала ўжо 2,2 % валавай прадукцыі СССР. Сярод цяжкасцей таго часу называліся слабасць гаспадарчага кіраўніцтва, недахоп жылля, паліва, хлеба, харчовых і прамысловых тавараў, спецыялістаў.

Падрыхтоўка кваліфікаваных кадраў ажыццяўлялася праз сетку прафесійных навучальных устаноў, вучэбна-практычных майстэрань, школ фабрычна-завадскога навучання. У 1930 г. у сістэме прафтэхадукацыі БССР было 96 навучальных устаноў.

У правядзенні палітыкі індустрыялізацыі, выкарыстанні рабочай сілы, павышэнні эфектыўнасці прамысловай вытворчасці мела значэнне ўдасканаленне кіравання фабрыкамі і заводамі. У пачатку 30-х гг. замест главкаў у Саўнаргасе БССР былі створаны 12 рэспубліканскіх аб’яднанняў: тарфяной, металаапрацоўчай, лясной, шкляной, хімічнай і іншых галін вытворчасці. Чатырохзвённая сістэма кіравання ўключала саўнаргас – аб’яднанне – трэст – прадпрыемства. Пры далейшай рэарганізацыі – трохзвённая: саўнаргас – аб’яднанне або трэст – прадпрыемства.

Каб паскорыць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў краіне ў цэлым і па Беларусі, ў гады другой пяцігодкі разгарнулася ***сацыялістычнае спаборніцтва*** і ўдарніцтва, якое пасля рэкорду данецкага шахцёра Аляксея Стаханава паступова набывае масавы характар. У першых радах удзельнікаў сацспаборніцтва ішлі камуністы і камсамольцы – інцыятары многіх працоўных пачынанняў. Так, на “Гомсельмашы” да канца 1933 г. усе камуністы-рабочыя сталі ўдарнікамі вытворчасці. Аднак у выніку масавы характар спаборніцтва, які насіў больш прапагандысцкі характар, чым эканамічны, адмоўна адбіўся на якасных і колькасных вытворчых паказчыках пяцігодкі.

Выкарыстанне надзвычайных метадаў кіравання эканомікай праявілася і ў прыняцці шэрага заканадаўчых актаў: аб ахове сацыялістычнай уласнасці (1932 г.) і ўмацаванні працоўнай дысцыпліны (1938 г.), аб забароне пераходу на іншае прадпрыемства ці звальнення, увядзенні крымінальнай адказнасці за неякасную прадукцыю (1940 г.). Матэрыяльнае стымуляванне працы адмаўлялася як перажытак капіталізму. І асноўнымі стымуламі прызнаваліся толькі маральныя. Але калі яны не дзейнічалі, у справу ўключаўся пазаэканамічны прымус. Супраць незадаволеных праводзіліся рэпрэсіі. Эканамічныя пралікі тлумачылі шкодніцтвам дыверсійна-тэрарыстычных цэнтраў, на заводах, фабрыках, электрастанцыях праходзілі судовыя працэсы над "шкоднікамі", "ворагамі народа", і тыя ў якасці бясплатнай працоўнай сілы выкарыстоўваліся пры будаўніцтве Беламорска-Балтыйскага канала, канала Масква-Волга, з 1933 г. Байкала-Амурскай магістралі (БАМ) і іншых аб'ектаў.

Такім чынам, ***у 20-30 гг. XX ст. БССРператварылася ў аграрна-індустрыяльную дзяржаву***, якая выпрабляла машыны і абсталяванне. Нягледзячы на пралікі і памылкі, нізкі ў цэлым узровень жыцця, савецкая індустрыялізацыя забяспечыла тэхніка-эканамічную незалежнасць СССР, стварыла матэрыяльную базу для абароны свайго суверэнітэту. "Характэрна, што савецкая індустрыялізацыя была заснавана фактычна толькі на дзяржаўнай форме ўласнасці і аўтарытарным партыйна-дзяржаўным кіраўніцтве, у той час як у кан. XIX ст. – пач. XX ст. прамысловае будаўніцтва, якое нярэдка перарастала ў індустрыяльнае, вялося на аснове шматукладнай эканомікі, фармаванні рыначных адносін пры адпаведным удзеле тагачаснай дзяржаўнай улады" [1, 167]. Імкненне да ўсталявання адміністрацыйна-камандных метадаў кіравання эканомікай у першую чаргу адбілася на прамысловасці і транспарце – яны лягчэй паддаваліся цэнтралізаванаму кіраванню. Цяжэй усталяваць такое кіраванне было ў сельскагаспадарчай вытворчасці, дзе пераважала аднаасобная, прыватная гаспадарка. І толькі праз масавую суцэльную калектывізацыю ўрад краіны імкнуўся распаўсюдзіць таталітарныя метады кіравання на сельскагаспадарчую сферу.

## Калектывізацыя сельскай гаспадаркі

У ходзе пабудовы сацыялізму, адным з самых драматычных напрамкаў пераўтварэнняў стала калектывізацыя сельскай гаспадаркі. У другой палове 20-х гг. тэмпы сельскагаспадарчай вытворчасці сталі замаруджвацца. Абапіраючыся на калектывісцкую традыцыю ўсходнеславянскай вёскі (сельская абшчына, талака і г. д.), зыходзячы з навуковых абгрунтаванняў неабходнасці кааперыравання сельскагаспадарчай вытворчасці і практычнага вопыту першых гадоў калектыўнага гаспадарання, Камуністычная партыя і Савецкая дзяржава распрацавалі палітыку калектывізацыі сельскай гаспадаркі. ***XV з'езд УКП(б) у снежні 1927 г.*** прыняў курс на правядзенне ў жыццё гэтай палітыкі. У тым жа годзе ў СССР разгарнуўся хлебанарыхтовачны крызіс – краіна ў выніку рыначных хістанняў недабрала 128 пудоў збожжа. План хлебанарыхтовак у БССР быў выкананы толькі на 71,5 %, што І. Сталін растлумачыў як "кулацкую стачку". У пераадоленні цяжкасцей галоўным сродкам для яго выступала бязлітаснае знішчэнне кулакоў. Тэарэтычным абгрунтаваннем рэпрэсій з'явіўся артыкул Сталіна "*Год*

***вялікага пералому***" (7 лістапада 1929 г.), дзе сцвярджалася, што ў калгасы пайшлі асноўныя серадняцкія масы сялянства, што ў сацыялістычным пераўтварэнні сельскай гаспадаркі ўжо атрымана "рашаючая перамога" (на самой справе ў калгасах тады знаходзілася толькі 6-7 % сялянскіх гаспадарак).

Пасля лістападаўскага Пленума ЦК УКП(б) 1929 г. пачалося нарошчванне тэмпаў калектывізацыі – у пачатку 1930 г. колькасць аб'яднаных у калгасы гаспадарак па Беларусі павялічылася да 20,9 %.

5 студзеня 1930 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову "Аб тэмпах калектывізацыі і мерах дапамогі дзяржавы калгаснаму будаўніцтву". Да восені таго ж года планавалася завяршыць аб'яднанне гаспадарак ў калектывы ў галоўных збожжавых раёнах краіны, да восені 1931 г. – у асноўных раёнах і ў цэлым па Саюзу – да канца пяцігодкі. Нягледзячы на тое, што Беларусь не адносілася да вытворцаў збожжа, студзеньскі 1930 г. Пленум ЦК КП(б)Б прыняў рашэнне да канца 1931 г. завяршыць калектывізацыю ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Для правядзення калектывізацыі ў вёску былі накіраваны сотні ўпаўнаважаных, якія не ведалі патрэб сялян, чынілі яшчэ большае самавольства, чым мясцовыя ўлады. На кіруючыя пасады ў калектыўныя гаспадаркі былі пастаўлены рабочыя-***дваццаціпяцітысячнікі***[65]. Раскулачваць сталі не толькі кулакоў, але і сераднякоў – тых хто не хацеў уступаць у калгасы. Узровень абагульнення ў вёсцы імкліва павышаўся – да сакавіка 1930 г. ў БССР калектыўныя гаспадаркі складалі 58 % ад іх агульнай колькасці.

Нарошчванне тэмпаў калектывізацыі суправаджалася актывізацыяй барацьбы з кулацтвам. 30 студзеня 1930 г. была прынята пастанова ЦК УКП(б) "Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі". З Беларусі прадугледжвалася выслаць у аддаленыя раёны краіны жыхароў 210 тыс. гаспадарак. Перагібы ў абагульненні жывёлы рэзка абвастрылі сітуацыю ў краіне. Галоўным вынікам насілля пры стварэнні калгасаў сталі масавыя пратэсты сялян, аж да антысавецкіх узброеных выступленняў – толькі ў Беларусі ў 1930 г. іх было больш як 500. Перад уступленнем у калгас сяляне рэзалі жывёлу – да мая 1930 г. пагалоўе буйной рагатай жывёлы скарацілася больш чым на чвэрць.

Шматлікія лісты ў партыйныя органы са скаргамі, апісаннямі бязладдзя прымусілі партыйнае кіраўніцтва ў другой палове лютага 1930 г. даць дырэктывы аб ліквідацыі спешкі пры арганізацыі калгасаў. 2 сакавіка 1930 г. "Правда" апублікавала перапрацаваны статут сельскагаспадарчай арцелі і артыкул І. Сталіна "***Галавакружэнне ад поспехаў***", у якім уся адказнасць за дапушчанныя памылкі перакладвалася на мясцовых работнікаў. Пасля прыняцця рэзалюцыі "Аб барацьбе з перагібамі ў калгасным руху" (17 красавіка 1930 г.) адбыўся адток сялян з калгасаў, незаконна раскулачаных пачалі вяртаць назад. Але ўвосень пачалася новая хваля калектывізацыі.

Важным накірункам калектывізацыі стала стварэнне ***машынна-трактарных станцый (МТС)***. Першая МТС ў нашай рэспубліцы ўзнікла ў канцы 1929 г. у Койданаўскім (цяпер Дзяржынскім) раёне. У канцы першай пяцігодкі ў Беларусі налічвалася 57 МТС, якія мелі 1469 трактароў. Яны абслугоўвалі 33,1 %

[65] **Дваццаціпяцітысячнікі** – каля 25 тысяч рабочых, якія былі накіраваны КП(б) у вёску для правядзення калектывізацыі. У БССР з іх агульнай колькасці налічвалася каля 600 чалавек.

усіх калектыўных гаспадарак і рабілі іх поўнасцю залежнымі ад дзяржавы[66]. Важнейшыя сродкі вытворчасці, а таксама кваліфікаваныя кадры былі сканцэнтраваны ў МТС, якія апрацоўвалі калгасныя палі за натуральную плату, прычым памеры яе вызначаліся зверху. З пачатку 1933 г. улада ў вёсцы фактычна перайшла да надзвычайных органаў – палітаддзелаў МТС, якія праіснавалі да канца 1934 г.

Дзяржаўнае кіраўніцтва падтрымлівала калгасы істотнымі падатковымі льготамі, выдзяляла грашовыя крэдыты. З сялян, якія ўступілі ў калгас, скасоўвалася запазычанасць па землеўпарадкаванню. Затое для аднаасобнікаў былі павялічаны стаўкі сельскагаспадарчага падатку, уведзены аднаразовыя падаткі. Павялічыўся таксама аб'ём дзяржаўных нарыхтовак, якія набылі абавязковы характар, з 1933 г. цэны на збожжа і большую частку іншых сельскагаспадарчых прадуктаў былі ў некалькі разоў ніжэйшыя за рыначныя.

Рабіліся захады па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, падрыхтоўцы кіруючых калгасных кадраў, па стварэнню ўнутранай структуры сельгасарцеляў, наладжванню дысцыпліны, уліку і аплаты працы. Быў усталяваны працадзень, які дазваляў перайсці на здзельную аплату, у сувязі з чым калгаснікі сталі самай малазабяспечанай катэгорыяй насельніцтва, у іх адсутнічалі пашпарты.

Прымяняліся розныя адміністрацыйныя меры: з 7 жніўня 1932 г. стаў дзейнічаць "Закон аб ахове сацыялістычнай уласнасці", па якому за крадзеж калгаснай і кааператыўнай маёмасці ўводзіўся растрэл з канфіскацыяй ўсёй маёмасці, а пры змякчаючых віну акалічнасцях – пазбаўленне волі на тэрмін не ніжэй чым 10 год з канфіскацыяй усёй маёмасці. У БССР на працягу 1933-1934 гг. па гэтаму закону было асуджана больш 10 тыс. чалавек[67].

У гады другой пяцігодкі калектывізацыя ў Беларусі фактычна завяршылася – было аб'яднана 87,5 % сялянскіх двароў і абагульнена 96 % пасяўных плошчаў. У лютым 1936 г. ІІ Усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў прыняў Статут сельскагаспадарчай арцелі, які гарантаваў існаванне асабістай гаспадаркі калгаснікаў.

Вынікам суцэльнай калектывізацыі ў БССР стала ліквідацыя шматукладнасці ў эканоміцы. Самастойнасць калгасаў з самага пачатку была абмежавана, што тармазіла іх ініцыятыву, гаспадарчы рост. Складвалася сістэма планавання і камандавання калгасамі з боку дзяржаўнага апарату, што таксама аддзяляла вытворцаў ад сродкаў вытворчасці і ад вынікаў працы. Пастаўкі для дзяржаўных патрэб збожжа, іншай сельскагаспадарчай прадукцыі рабіліся фактычна на бясплатнай аснове, што ставіла вёску ў асабліва залежнае становішча ад горада і дзяржавы ў цэлым. Акрамя паставак вяскоўцы выплачвалі грашовыя падаткі. Усё гэта дазваляла выкачваць з вёскі ў першую чаргу на патрэбы індустрыялізацыі значныя матэрыяльныя рэсурсы – толькі ў 1933 г. падаткі з насельніцтва ў Беларускай ССР склалі 22,4 % дзяржаўнага бюджэту[68]. Калгаснікі не мелі пашпартоў, што выключала магчымасць свабоднага перамяшчэння, юрыдычна прывязвала да калгаса, надавала працы прымусовы характар.

---

[66] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX-XX стагоддзі. – С. 387-388.

[67] Там жа. – С. 388.

[68] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі: у 6 тамах. – Мн., 2006. – Т. 5. – С. 269.

Сацыяльна-эканамічныя вынікі гаспадарчага будаўніцтва ў канцы 1920-1930-гг. был супярэчлівыя. З аднаго боку, у СССР быў створаны гаспадарчы комплекс, які выводзіў краіну на рубяжы сусветнага тэхнічнага прагрэсу. На закладзенай ў міжваенныя гады тэхнічнай базе сталі магчымымі перамога ў Вялікай Айчыннай вайне і пасляваеннае аднаўленне эканомікі. Індустрыяльнае будаўніцтва прывяло да павышэння культурна-тэхнічнага ўзроўню грамадства.

З другога боку, сацыялістычнае будаўніцтва суправаджалася велізарнымі матэрыяльнымі і людскімі стратамі, былі ліквідаваны розныя формы ўласнасці, дзяржава стала адзіным манапалістам ў сферы вытворчасці і размеркаванні, сфармаваўся затратны механізм гаспадарання, усталяваліся камандна-адміністрацыйныя метады кіравання эканомікай.

## Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў 1919-1939 гг.

Згодна з умовамі Рыжскага мірнага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. заходняя частка Беларусі знаходілася ў складзе II Рэчы Паспалітай (да верасня 1939 г.). Паводле адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу Польшчы гэтыя тэрыторыі, так званыя "*крэсы ўсходнія*", былі падзелены на 29 паветаў, што уваходзілі ў склад 4-х ваяводстваў: ***Беластоцкага, Віленскага, Навагрудскага і Палескага.***

Агульная плошча Заходняй Беларусі складала больш ***113*** тыс. км$^2$ (98 815 на 1921 г.[69]), насельніцтва ў 1931 г. – ***4,6 млн.*** чалавек. Найбуйнейшымі гарадамі былі: Вільня, Брэст, Пінск, Беласток, Слонім, Ліда, Навагрудак, Лунінец, Кобрын, Пружаны, Маладзечна, Ваўкавыск, Баранавічы, Вілейка. Галоўным горадам краю, яго культурным і навуковым цэнтрам з'яўлялася Вільня. У прамысловых адносінах найбольш развітым быў Беластоцкі раён.

Заходняя Беларусь была адносна адсталай аграрнай ускраінай Польшчы і выкарыстоўвалася апошняй у якасці крыніцы сыравіны і таннай рабочай сілы, як рынак збыту для яе прамысловасці. У эканоміцы Заходняй Беларусі назіраўся застой. Працоўныя пакутвалі ад эксплуатацыі і нацыянальнага ўціску.

***Фінансавая палітыка.*** У пачатку 1924 г. новы ўрад У. Грабскага пачаў актыўна ажыццяўляць палітыку фінансавай стабілізацыі. Былі павышаны ўскосныя падаткі на спажыванне спіртных напояў у 2 разы, цукру – у 10, запалак – у 20 разоў, некалькі скарочаны ваенныя расходы. У выніку ў лютым 1924 г. бюджэт краіны ўпершыню быў зведзены са станоўчым сальда. Значную ролю ў гэтых працэсах адыграла грашовая рэформа. Пасля вайны інфляцыя набыла катастрафічны характар. Калі ў канцы 1919 г. долар каштаваў 119 польскіх марак, то ў чэрвені 1923 г. – ужо 100 тысяч, а ў кастрычніку – прыкладна 1,7 млн. полькіх марак. У красавіку 1924 г. прыступіў да дзейнасці Польскі банк, які ўвёў у абарачэнне новую польскую нацыянальную валюту – ***злоты,*** які быў падлічаны ў золаце і прыраўнены да 1,8 млн. польскіх марак[70]. Дадзеныя меры дазволілі некалькі стабілізаваць фінансава-грашовую сістэму, ліквідавалі гіперінфляцыю. Аднак гэта было зроблена ў значнай ступені за кошт зніжэння жыц-

[69] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі. у 2 ч. – Мн., 2002. – Ч. 2: XIX-XX стагоддзі. – С. 396.

[70] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вуч. дапаможнік. – Выд. 2-е, дап. і перапрац. / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульн. рэд. В.І. Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 1995. – С. 285.

цёвага ўзроўню насельніцтва. Нармалізацыі эканамічнага жыцця перашкаджала мілітарысцкая палітыка кіруючых колаў – у 1923 г. толькі прамыя ваенныя патрэбы складалі 42 % дзяржаўных расходаў. Стабілізацыя эканомікі Польшчы не мела моцнай асновы, суправаджалася далейшай інфляцыяй, ростам знешняй запазычанасці, значным пранікненнем замежнага капіталу. Ускладненню эканамічнай сітуацыі садзейнічала мытная вайна Германіі супраць Польшчы, якая пачалася ў 1925 г. і прывяла да адказу ад імпарту польскага вуглю.

Адным з найбольш цяжкіх сродкаў каланіяльнага рабавання для працоўных Заходняй Беларусі былі падаткі – насельніцтва павінна было плаціць у 1920-я гг. значна большыя падаткі, чым пры царскай уладзе. Падатковая палітыка насіла выразна класавы характар – буйныя памешчыкі плацілі з 1 га зямлі менш, чым малазямельныя сяляне. Сума ўсіх падаткаў (зямельны, камунальны, дарожны, інвестыцыйны, крызісны, надзвычайны, шарваркавы, страховачны, гмінны і інш.) з 1 га зямлі дасягала 10 злотых. З гадамі раслі нядоімкі па падатках, пры спагнанні якіх улады ўсё часцей прыбягалі да прымусовымер – апісвалі маёмасць і забіралі яе з паліцыяй. Акрамя непасрэдных, жыхары гарадоў і вёсак неслі цяжар і ўскосных падаткаў, якімі абкладваліся дадаткова спажывецкія тавары – соль, запалкі, газа, тытунь, гарэлка. Манаполію на продаж гэтых тавараў мела Польская дзяржава. Варта адзначыць, што такая падатковая сістэма ніколькі не стымулявала пашырэнне вытворчасці.

З другой паловы 1926 г. у Польшчы пачаўся прамысловы ўздым. Ён супаў з прыходам да ўлады ў выніку перавароту Ю. Пілсудскага. Ажыўленню гаспадарчага жыцця садзейнічалі добры ўраджай, павышэнне цэн на вугаль, што прывяло да пашырэння знешняга гандлю. Да таго ж кіруючыя колы ЗША і Англіі далі ўраду Ю. Пілсудскага вялікія пазыкі. У мэтах стабілізацыі злотага восенню 1927 г. Польшча атрымала пазыку ў 62 млн. долараў і 2 млн. фунтаў стэрлінгаў.

Акрамя падатковага ўціску, на матэрыяльным становішчы людзей моцна адбівалася гандлёвая палітыка манаполій. Штучна завышаючы цэны на вырабы прамысловасці, яны стваралі "нажніцы цэн". Разбежка цэн стала яшчэ больш адчувальнай у гады эканамічнага крызісу 1929-1933 гг. Агульнае зніжэнне пакупной здольнасці насельніцтва прывяло да масавай ліквідацыі гандлёвых прадпрыемстваў.

***Прамысловасць.*** Разбураная войнамі прамысловасць аднаўлялася марудна, новыя прадпрыемствы амаль не будаваліся, прыродныя багацці краю, асабліва лясы, нячшадна рабаваліся, часта распрадаваліся замежным фірмам. За 1921-1936 гг. плошча лясоў у трох заходнебеларускіх ваяводствах зменшылася на 400 тыс. га. Вядучым напрамкам прамысловасці стала дрэваапрацоўка. На долю харчовай і дрэваапрацоўчай прамысловасці прыходзілася 2/3 прадпрыемстваў і рабочых. Сярод прадпрыемстваў, дзе працавалі больш за 100 чалавек у 1926 г. у Віленскаім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах было ўсяго 19. Сярод іх – шклозавод "Нёман", запалкавая фабрыка "Прагрэс-вулкан" у Пінску, тытунёвая фабрыка ў Гродне і інш.

У 1928 г. ў Заходняй Беларусі дзейнічала каля 2 тысяч прадпрыемстваў, але на 80 % з іх працавала ад 5 да 20 чалавек. Аднак сусветны эканамічны крызіс 1929-1933 гг. моцна паразіў Польшчу. Асабліва ў цяжкім стане апынулася

прамысловасць ў Заходняй Беларусі: тут часова спынілі работу каля 230 прадпрыемстваў. Хоць Заходняя Беларусь складала 24 % тэрыторыі і ў ёй пражывала 11 % насельніцтва Польшчы, удзельная вага прамысловасці краю ледзь перавышала 3 %. У прамысловасці, на транспарце і лесараспрацоўках было занята каля 100 тыс. чалавек (амаль 5 % ад усіх рабочых Польшчы), налічвалася амаль 50 тыс. рамеснікаў. Беспрацоўе ў Заходняй Беларусі было хранічнае (больш за 25 тыс. беспрацоўных у 1936 г.), рабочы дзень дасягаў 10-14 гадзін, зарплата была ніжэйшая, чым ў насельніцтва карэннай Польшчы. Платны адпачынак, дапамога па сацыяльнаму забеспячэнню ў 1933 г. фактычна былі ліквідаваны. У канцы 1933 г. эканоміка Польшчы пасля крызісу апынулася ў стане эканамічнай дэпрэсіі, якая працягвалася да 1937 г. і характарызавалася агульным застоем вытворчасці. Ажыўленне, звязанае з падрыхтоўкай да вайны, не ўнесла істотных змен у эканамічнае становішча.

***Сельская гаспадарка.*** Каля 80 % насельніцтва Заходняй Беларусі займалася сельскай гаспадаркай (па звестках, на 1931 г. 85 % насельніцтва краю жыло ў вёсцы і толькі 15 % – у горадзе; 79 % займаліся сельскай гаспадаркай)[71]. Сяляне пакутвалі ад малазямелля, перажыткаў прыгонніцтва (адработкаў і інш.), цяжкіх падаткаў, высокіх цэн на прамысловыя тавары шырокага ўжытку (запалкі, соль, газа, тытунь) і нізкіх цэн на сельгаспрадукты, запазычанасці банкам, самаўпраўства чыноўнікаў і паліцыі. Бедняі жылі заўсёды надгаладзь, з харчовых прадуктаў найчасцей ужывалі бульбу, капусту, хлеб, рыбу, зрэдку мяса. Пры малазямеллі большасці сялян, нізкай ураджайнасці і неўраджаях праз кожныя 1-2 гады паўгалоднае існаванне стала нярэдкай з'явай.

У 1920-я гг. памешчыкі, складаючы 1,7 % землеўладальнікаў, валодалі амаль паловай прыватнаўласніцкай зямлі. На памешчыцкі маёнтак у сярэднім прыпадала каля 500 га зямлі, на сялянскі двор – каля 7 га, амаль 55 тыс. гаспадарак мелі надзел меншы за 1 га. Каля 90 тыс. парабкаў былі зусім беззямельныя.

Уведзены ў ***1925 г. "Закон аб ажыццяўленні зямельнай рэформы"*** прадугледжваў правядзенне такіх мерапрыемстваў, як:

- ***асадніцтва*** – насаджэнне ў беларускіх землях польскіх вайсковых каланістаў – асаднікаў, якія атрымлівалі надзелы на льготных умовах або бясплатна і доўгатэрміновыя крэдыты па абзавядзенню гаспадаркай;
- ***камасацыя*** – звядзенне ў адзін участак палосак зямлі – ліквідацыя цераспалосіцы, хутарызацыя;
- ***секулярызацыя*** – адзяржаўлянне царкоўных земель;
- ***парцэляцыя*** – продаж дробнымі ўчасткамі праз зямельны банк часткі памешчыцкіх, абшарніцкіх і дзяржаўных земель;
- ***ліквідацыя сервітутаў*** – ліквідацыя абшчынных земель сумеснага карыстання – пашаў, сенажацяў, лясоў, выганаў узамен на кампенсацыю грашыма ці зямельнымі ўчасткамі памерам ад 1/4 да 1/3 агульнай плошчы сервітутаў.

Рэформы садзейнічалі ўмацаванню сельскай гаспадаркі, рассяленню на хутары (да 1939 г. на хутары было расселена каля 43 % сялянскіх гаспадарак). У выніку аграрных рэформаў зямельныя ўладанні памешчыкаў былі значна паменшаны, хоць і не зусім ліквідаваны. Паказчыкі прадукцыйнасці сельскай

---

[71] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі: у 6 тамах.– Мн., 2006. – Т. 5. – С. 353.

гаспадаркі значна выраслі: ураджайнасць збожжавых дасягнула ўзроўню Францыі (10-12 ц/га), а па многіх культурах дасягнула ўзроўню фермераў ЗША.

Адсутнаць радыкальных пераўтварэнняў у аграрнай сферы Заходняй Беларусі спрыяла захаванню ў сялянскіх сем'ях традыцыйнага ўкладу, працоўнай маралі, нацыянальнай культуры і беларускай мовы. У вёсцы захоўваліся шматлікія элементы натуральнай гаспадаркі. Гандаль нярэдка набываў характар абмену. У большасці мястэчак адзін раз у тыдзень прадавалі свае вырабы. У многім сяляне саматужным спосабам задавальнялі ўласныя патрэбы ў адзенні, абутку, хатніх і гаспадарчых прыладах. Фактычна ў кожнай хаце ткалі льняное палатно.

Сельскагаспадарчыя рабочыя адрозніваліся па сваім эканамічным становішчы: *наглядчыкі* – былі вярхушкай аграрных рабочых; *рамеснікі* (кавалі, сталяры і інш.) атрымлівалі лепшае ўзнагароджанне; *ардынарыі* былі малааплачваемай групай батракоў – каля 90 % іх зарплаты складала жыллё, паліва, зерне, зямля ў суме не больш 300 злотых у год; праца дзяцей *пасылкаў* часцей не аплочвалася; *каморнікі* працавалі за часовае карыстанне зямлёю; *сталоўнікі* – за самае сціплае ўзнагароджанне. З-за нізкага ўзроўню развіцця прамысловасці не было магчымасці выкарыстаць свабодную рабочую сілу перанаселенай вёскі, таму ў пошуках работы сяляне часта эмігравалі ў краіны Заходняй Еўропы і Амерыку.

Абеззямельванне не здымала з парадку дня неабходнасць далейшага землеўпарадкавання, што было адной з прычын рэвалюцыйнай актыўнасці сялян. За міжваенны перыяд найбольш вядомымі выступленнямі эканамічнага характару былі: 1927 г. – Косаўская дэманстрацыя сялян супраць роспуску БСРГ; 1932-1933 г. – забастоўка ў Белавежскай пушчы; 1935 г. – Нарачанскае паўстанне рыбакоў і Кобрынскае выступленне.

На захопленай палякамі тэрыторыі беларускі народ апынуўся пад сацыяльна-эканамчным і нацыянальным прыгнётам не толькі польскіх памешчыкаў і буржуазіі, але і замежнага капіталу. У эканоміку пранікаў капітал французскіх, італьянскіх, амерыканскіх і шведскіх манаполій. Адарванасць ад сістэмы ўсерасійскіх эканамічных, вытворчых, сацыяльна-культурных адносін, рынку і міжрэгіянальнага падзелу вытворчасці істотна адбілася на эканоміцы Заходняй Беларусі. Толькі рост цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю на сусветным рынку дазволіў Польшчы выйсці з крызісу. У 1934-1938 гг. назіралася ажыўленне і ў сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі. Аграрная рэформа спрыяла ліквідацыі прыгонніцкіх адносін, канцэнтрацыі сельскагаспадарчай вытворчасці, стварала ўмовы для далейшага развіцця капіталізму ў вёсцы. Умацавалася становішча дробнай і сярэдняй сельскай буржуазіі, ажывіўся ўнутраны рынак. Аднак адсутнасць ільготных крэдытаў, недахоп мінеральных угнаенняў, тэхнікі і інвентару стрымлівалі развіццё заходнебеларускай вёскі. Толькі ў 1929 г. у сельскай гаспадарцы быў дасягнуты ўзровень 1913 г. Шматлікія перажыткі, у тым ліку паўкаланіяльнага характару, затрымлівалі прагрэсіўнае развіццё сельскай гаспадаркі, перашкаджалі вырашэнню сацыяльных праблем.

І хаця ў параўнанні з БССР, асабліва ў першай палове 1930-х гг., жыццёвы ўзровень часткі грамадства Заходняй Беларусі быў вышэйшы, палепшыць становішча насельніцтва магла толькі справядлівая змена сацыяльна-эканамічных адносін.

## Эканоміка Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гг.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны найпершай задачай савецкага ўрада стала эвакуацыя людзей і матэрыяльных каштоўнасцяў ва ўсходнія рэгіёны краіны. Праводзіліся дэмантаж і эвакуацыя абсталявання прадпрыемстваў – усяго з БССР было вывезена звыш 120 прадпрыемстваў, а таксама 3200 металаапрацоўчых станкоў, 8933 тэкстыльныя, швейныя, скураабуткавыя і трыкатажныя машыны, 8664 маторы, 3366 вагонаў гатовай прадукцыі і сыравіны. З 5 усходніх абласцей было эвакуіравана 5 тыс трактароў, 223 камбайны, 136 малатарань, вывезена 93,3 тоны зерня і перагнана звыш 674 тыс галоў жывёлы[72].

Насельніцтва Беларусі прымала актыўны ўдзел у будаўніцтве абарончых аб'ектаў і рубяжоў, дзе было занята каля 2 млн. чалавек. З добраахвотнікаў было створана 78 знішчальных батальёнаў і больш 200 фарміраванняў народнага апалчэння, якія вялі барацьбу з дэсантам праціўніка, шпіёнамі, ахоўвалі прамысловыя аб'екты, дзяржаўныя ўстановы, лініі сувязі і г. д. Акрамя таго, яны прымалі ўдзел ў знішчэнні важных аб'ектаў, каб тыя не дасталіся ворагу. У выніку праведзеных мерапрыемстваў грамадскае і эканамічнае жыццё ва ўсходніх абласцях Беларусі было паралізавана, што цяжкім грузам лягло потым на плечы тых, хто не змог эвакуіравацца на ўсход.

***Эканамічная палітыка акупацыйнага ўраду.*** На працягу першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны, да верасня 1941 г., тэрыторыя БССР была акупавана войскам нямецка-фашысцкай Германіі. У галіне эканомікі акупацыйны рэжым прынёс жыхарам Беларусі жудасную галечу, звышэксплуатацыю, адкрытае рабаванне нацыянальных багаццяў. Эканамічная палітыка на захопленай тэрыторыі Савецкага Саюза насіла каланіяльны характар, яе ідэалагічнай асновай сталі чалавеканенавісніцкія тэорыі нацыстаў аб "расавай перавазе" нямецкай нацыі над іншымі народамі, неабходнасці пашырэння "жыццёвай прасторы на ўсход", права на сусветнае панаванне Трэцяга рэйха.

.Генеральны план "Ост" прадугледжваў рабаванне.і падрыў гаспадарчага патэнцыялу СССР, выкарыстанне яго эканамічнага патэнцыяла ў інтарэсах эканомікі Германіі. Галоўныя мэты і задачы германскай эканамічнай палітыкі ў СССР былі адлюстраваны ў спецыяльных "***Дырэктывах па кіраванню эканомікай у акупаваных усходніх абласцях***", якія утрымліваліся ў так званай "***Зялёнай папцы Герынга***". Канкрэтныя мерапрыемствы эканамічнай палітыкі распрацоўваў "Ольдэнбург" – эканамічны штаб па рэалізацыі плана "Ост".

Указам А. Гітлера ад 17 ліпеня 1941 г. было створана Міністэрства па справах акупаваных усходніх абласцей на чале з А. Розенбергам. Яму падначальваліся чатыры рэйсхкамісарыяты (імперскія камісарыяты): "Остланд", "Украіна", "Масква" і "Каўказ", замест раней запланаваных адміністрацыйных адзінак – Прыбалтыкі, Беларусі і Украіны. У склад "Остланда" увайшлі Эстонія, Латвія, Літва і Беларусь як генеральныя акругі.

Галоўны камісарыят генакругі "Беларусь" складаўся з чатырох галоўных аддзелаў: палітыкі, кіравання, гаспадаркі і тэхнікі. У 1944 г. быў створаны таксама галоўны аддзел працы. Галоўныя аддзелы у сваю чаргу складаліся з галіновых аддзелаў. Акрамя сеткі цывільнага, ваеннага і паліцэйскага кіраў-

---

[72] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі: у 6 тамах. - Мн., 2006. – Т. 5. – С. 482-540.

ніцтва, існавала яшчэ сетка інстанцый, якія непасрэдна падпарадкоўваліся рэйхсмаршалу Герынгу і займаліся пытаннямі эканамічнага і гаспадарчага характару. Для эканамічнага рабавання і эксплуатацыі прыродных багаццяў быў створаны разгалінаваны апарат розных гаспадарчых каманд, інспекцый, атрадаў, вялікі штат упаўнаважаных, інспектараў, шэфаў і г. д. Найбольш драпежніцкімі метадамі зарэкамендавала сябе на Беларусі Цэнтральная гандлёвая кампанія, якая займалася рабаваннем сельскагаспадарчых рэсурсаў і эксплуатацыяй прадпрыемстваў. Не адставалі ад яе кампаніі лясной і дрэваапрацоўчай прамысловасці, гандлёвая кампанія сыравіны, нарыхтоўчая кампанія скуры і пабочнай сыравіны, прыватных фірм "Борман", "Трэбец", "Шляхтгоф", "Троль" і інш.

Трэба адзначыць, што ***разам з каманднa-адміністрацыйнымі метадамі акупанты выкарыстоўвалі і эканамічныя метады кіравання гаспадаркай***. На 1 ліпеня 1942 г. на тэрыторыі генеральнай акругі "Беларусь" працавалі 33 банкі, а ў 1943 г. іх было ўжо каля 100. Акрамя збору грашовых лішкаў, банкі праводзілі крэдытаванне гаспадаркі, узаемаразлікі паміж прадпрыемствамі розных рэгіёнаў Беларусі, праводзілі аперацыі з каштоўнымі паперамі і г. д. На акупаванай тэрыторыі мелі хаджэнне нямецкія акупацыйныя маркі і ўкраінскія карбованцы, выпушчаныя Ровенскім эміссійным банкам, і іншыя.

Аднаўленне эканомікі павінна было праводзіцца толькі ў тых абласцях, дзе было магчыма здабыць значныя рэзервы сельскагаспадарчай прадукцыі і нафты. Працоўныя вёскі, як і жыхары гарадоў, плацілі падаткі. Усё насельніцтва ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў у абавязковым парадку прыцягвалася да прымусовых работ па будаўніцтву абарончых аб'ектаў, мастоў, дарог і г. д. Асабліва шмат працоўнай сілы патрабавала ваенна-будаўнічая арганізацыя "Тодта".

Разам з тым акупацыйныя ўлады і штаб "Ольденбург" у інтарэсах Вермахта арганізавалі работу часткі беларускіх прамысловых прадпрыемстваў, транспарту і гандлю. Усе прадпрыемствы і ўстановы Беларусі былі ўзяты на ўлік, была праведзена іх дэталёвая інвентарызацыя. Толькі ў Мінску на 1 снежня 1941 г. працавала 73 прадпрыемствы, у снежні 1942 г. – 117, а ў красавіку 1943 г. – 150[73]. Яны адкрылі цэнтральнае гандлёвае таварыства "Усход", металургічныя аб'яднанні "Герман Герынг" і "Усход", шэраг прыватных нямецкіх фірм і акцыянерных таварыстваў. У гады вайны на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі прадпрыемствы пераважна металаапацоўчай, лёгкай і харчовай прамысловасці.

На гэтых фабрыках і заводах рабочыя працавалі ў прымусовым парадку, праз сістэму абавязковай рэгістрацыі на біржах працы. Каб паставіць на службу рэйха эканоміку Беларусі, акупанты ўжо на працягу ліпеня 1941 г. правялі рэгістрацыю працаздольнага насельніцтва ў гарадах. Уводзілася ўсеагульная працоўная павіннасць з 18 да 45 гадоў (для яўрэяў – з 14 да 65). Працоўны дзень цягнуўся 10-12 гадзін. Адміністрацыя мела права павялічваць яго, наказваць рабочых за правіннасць, а за сабатаж – біць, садзіць у карцар, адпраўляць у канцэнтрацыйны лагер. Заработная плата складала мізерную суму: кваліфікаваны рабочы ў Мінску атрымліваў за месяц да 60 марак, некваліфікаваны – у 2 разы менш, у той час як кошт сціплага абеда ў прыватнай сталоўцы складаў 3-5 марак, адна пара туфляў – прыкладна 35 марак. Гарадскія жыхары ва ўмовах аку-

[73] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І.Зялінскі і інш. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі. – С. 465.

пацыі маглі пазбегнуць голаду толькі тады, калі ўладкоўваліся на працу – гэта давала права на мізернае, але хоць нейкае харчовае забеспячэнне па картках. Рацыён харчавання, уведзены генеральным камісарыятам "Беларусь" зімой 1941/1942 гг., на кожнага працоўнага уключаў 200 г. хлеба ў дзень і 10 г. солі, "аб выдачы мяса і тлушчу", – як падкрэслівалася ў адным з дакументаў, – не магло быць і размовы". Людзей прымушалі працаваць таксама пагрозамі, гвалтам, заганяючы ў спецыяльныя рабочыя каманды і лагеры. Нявыхад на працу без уважлівай прычыны на працягу трох дзён лічыўся сабатажам і караўся расстрэлам. Ад 70 да 90 % прадукцыі працуючых прадпрыемстваў ішло на задавальненне патрэб нямецкіх войскаў, акупацыйнага адміністрацыйнага апарату.

За любое непаслушэнства рабочага маглі накіраваць у канцлагер ці выслаць на працу ў рэйх. Пры выкананні тэрміновых, асабліва важных заказаў рабочых часта пераводзілі на казарменнае становішча. У 1942–1944 гг. на розных работах пачало ўзмоцненна выкарыстоўвацца жаночае насельніцтва. Нямецкія спецслужбы канстатавалі: "Жанчын гэтай краіны можна разглядаць як паўнавартасную рабочую сілу, таму што яны не толькі прывыклі да цяжкай мужчынскай працы, але і значна больш старанныя, чым мужчыны..." [1, 519].

Ужо ў першыя месяцы акупацыі гітлераўцы разгарнулі вярбоўку добраахвотнікаў для выезду на працу ў Германію. Аднак неабходнага прытоку працоўнай сілы ў рэйх прапагандысцкім шляхам дабіцца не ўдалося: "для Беларусі была ўстаноўлена квота ў 30 тыс. домработніц, а да канца лістапада 1942 г. змаглі мабілізаваць толькі дзесці каля 100..." [1, 520]. Менавіта з 1942 г. гітлераўцы зрабілі стаўку на прымусовы вываз работнікаў ў рэйх. Толькі гаспадарчыя інспекцыі групы-арміі "Цэнтр" і генеральнай акругі "Беларусь" кожны дзень накіроўвалі ў рэйх 500-1000 рабочых. Пры актыўным супраціўленні насельніцтва ***каля 400 тыс. жыхароў Беларусі былі ўсё ж вывезены ў Германію.*** Усяго з акупаваных раёнаў СССР было вывезена каля 5 млн. чалавек. Яны зведалі фашысцкую няволю, катаржную працу, зверскае абыходжанне.

***Аграрная палітыка*** акупантаў з мэтай атрымання максімальнай колькасці харчавання ў Беларусі ажыццяўлялася наступным чынам.

Спачатку *(чэрвень 1941 г. – люты 1942 г.)* акупанты захавалі калгасную сістэму з усімі яе атрыбутамі: не дапускалі раздзела зямлі, афіцыйна не распускалі праўленні і рэвізійныя камісіі калгасаў, аставілі на былых пасадах іх брыгадзіраў, старшынь. Уся маёмасць калгасаў была аб'яўлена ўласнасцю германскай дзяржавы.

Наступны перыяд *(люты 1942 г. – чэрвень 1943 г.)* пачынаецца з прыняцця 16 лютага 1942 г. закона аб новым парадку землекарыстання: гітлераўцы пераўтварылі калгасы ў так званыя "кааператывы" – "абшчынныя гаспадаркі", а саўгасы – у "дзяржаўныя маёнткі" (іх было звыш 1500). Было арганізавана адраджэнне гаспадарак мясцовых памешчыкаў, былых асаднікаў, заможных сялян. Дапускаліся і наёмная праца падзёншчыкаў, здача зямлі ў арэнду, індывідуальная форма гаспадарання, але прыватная маёмасць на зямлю абяцалася ў будучым. У вёсцы была ўстаноўлена жорсткая кругавая парука, калектыўная адказнасць сялян перад акупацыйнымі ўладамі за выкананне іх загадаў.

І, нарэшце, *(чэрвень 1943 г. – ліпень 1944 г.)* гітлераўцы дазволілі перадачу зямлі ў валоданне сялян за паслугі. Згодна з "Дэкларацыяй аб сялянскім праве

ўласнасці", падпісанай міністрам рэйха А. Розенбергам 3 чэрвеня 1943 г., было абвешчана права раздзела зямлі "для ўсяго сельскага насельніцтва". Але з фактычнай рэалізацыяй гэтага права акупанты не спяшаліся. А тым часам савецкая армія пачала вызваленне першых раёнаў у рамках даваеннай тэрыторыі БССР.

Беларуская вёска несла на сабе невыносны цяжар высокіх натуральных і грашовых падаткаў, абавязковых паставак сельгаспрадукцыі. Сродкі з сяла акупанты выцягвалі і праз грабежніцкую сістэму нарыхтовачных цэн, манаполію на вытворчасць прамысловых тавараў, продаж іх утрая даражэй. Захопнікі, як маглі, рабавалі багацці Беларусі – сыравіну, прадукты харчавання, гатовую прадукцыю, культурныя каштоўнасці, імкнуліся звесці фізічна і духоўна насельніцтва да становішча рабоў. За кошт гэтага акупанты спадзяваліся не толькі забяспечыць патрэбы арміі і павялічыць свой ваенна-эканамічны патэнцыял, але і прынесці прыбыткі буйным манаполіям. На ўсім працягу акупацыі гітлераўцы няшчадна рабавалі беларускіх сялян – 10 тыс. калгасаў, 92 саўгасаў, 316 МТС. У Германію было вывезена, па няпоўных дадзеных, больш 1,6 млн. тон збожжа, 426 тыс. тон мукі, 3 млн. тон бульбы і гародніны, 90 % станочнага і тэхнічнага абсталявання, каля 18,5 тыс. аўтамашын, больш за 9 тыс. трактароў і цягачоў, 2,8 млн. галоў буйной рагатай жывёлы, 5,7 млн. галоў дробнай жывёлы. За гады акупацыі было высечана 104 тыс. га лесу, пасяўныя плошчы ў БССР скараціліся на 43 %, пагалоўе буйной рагатай жывёлы – амаль на 69 %, коней – на 61 %, свіней – на 89 %, авечак і коз – на 78 % [1, 489-490]. Калі са справаздач буйных арганізацый і кампаній можна хоць прыкладна акрэсліць памеры нарабаванага, то салдацкія і афіцэрскія пасылкі не падлягаюць ніякаму ўліку. Масавая канфіскацыя прыватнай, грамадскай і дзяржаўнай маёмасці праводзілася як ваеннымі, так і цывільнымі ўладамі.

Такога масавага знішчэння людзей, варварскага разбурэння і татальнага рабавання народнай гаспадаркі, матэрыяльных, духоўных і культурных каштоўнасцяў, як у гады Другой сусветнай вайны, сусветная цывілізацыя яшчэ не ведала. Людскія рэсурсы, матэрыяльна-тэхнічная база прамысловасці і сельскай гаспадаркі, жыллёвы фонд Беларускай ССР патрабавалі неадкладнага аднаўлення.

***Народная гаспадарка Беларусі ў партызанскіх зонах.*** З цягам часу партызаны здолелі выцесніць акупантаў з вялікай тэрыторыі, дзе ўтвараліся партызанскія краі і зоны са шматлікім насельніцтвам. У канцы 1943 г. яны кантралявалі каля 60 % рэспублікі – дзейнічала каля 20 партызанскіх зон. У вызваленых раёнах жыццё насельніцтва шмат у чым было арыентавана на даваенны савецкі ўклад, падпарадкоўвалася патрэбам ваеннай рэчаіснасці. Так, у пастанове ЦК УКП(б) і СНК СССР ад ***21 жніўня 1943 г.*** "Аб неадкладных мерах па аднаўленню гаспадаркі ў раёнах, вызваленых ад нямецкай акупацыі" першачарговай задачай ставіліся наладжванне работы аб'ёктаў, прадукцыя якіх была неабходна фронту, а таксама аднаўленне металаапрацоўчай прамысловасці і машынабудавання. Вялізнае значэнне надавалася наладжванню сельскагаспадарчай вытворчасці. Ва ўмовах пастаяннай небяспекі ўварвання карнікаў, негатыўнай настроенасці сялянства ў асноўнай сваёй масе да калгаснага вопыту 30-х гг., а таксама пад уплывам пераходу да індывідуальных форм працы, калектыўныя гаспадаркі ў партызанскіх зонах, за рэдкім выключэннем, не аднаўляліся. Значную дапамогу ў сельскагаспадарчых работах, уборцы ўраджаю аказ-

валі насельніцтву партызаны. Мірнае насельніцтва несла на сябе падвойную нагрузку – неабходнасць забеспячэння харчаваннем, іншымі прадуктамі земляробства і жывёлагадоўлі, саматужнай вытворчасці як саміх сябе, так і партызан. Людзі, настроеныя патрыятычна, адрываючы ад сябе і сваіх дзяцей апошняе, забяспечвалі байцоў партызанскіх атрадаў і брыгад. У менш свядомых таксама не заставалася лішкаў – дзейнічала сістэма планавых нарыхтовак партызанамі прадуктаў, матэрыяльных сродкаў у прывязцы да канкрэтых мясцовасцей, населеных пунктаў. Для народных мсціўцаў мясцовыя жыхары рыхтавалі розную амуніцыю, выраблялiся скуры, шыліся адзенне і абутак, выпякаўся хлеб, пралася бялізна і г. д.

Элементам грамадска-гаспадарчага жыцця ў партызанскіх зонах патрэбна лічыць і асабістую вытворчую дзейнасць партызан – наладжванне дзейнасці працы розных кустарных майстэрань, дробных прамысловых прадпрыемстваў. Малая партызанская прамысловасць шырока выкарыстоўвала майстэрства кадравых рабочых, якія сталі партызанамі або перасяліліся ў партызанскія зоны, уменне і навыкі ваеннаслужачых, сялян-умельцаў. Насельніцтва дапамагала партызанам наладжваць работу збройных майстэрань, будаваць аэрадромы, умацоўваць абарончыя рубяжы. У час вызваленчай аперацыі "Баграціён" яно таксама аказвала падтрымку савецкім войскам. Аднаўленне разбуранай гаспадаркі, асабліва ўстаноў і прадпрыемстваў, якія забяспечвалі патрэбы фронту, было важнай задачай тых, хто не быў прызваны ў армію. За кароткі час грамадзяне Беларусі аднавілі больш як 10 тыс. км чыгуначнага палатна і 1735 чыгуначных мастоў, пабудавалі 2950 новых мастоў [1, 540].

Беларускі народ, фактычна галадаючы сам, тым не менш праяўляў высокую свядомасць пры мабілізацыі сродкаў у фонд абароны, зборы харчоў для арміі, падпіскі на трэцюю (1944 г.) і чацвёртую (1945 г.) дзяржаўныя пазыкі. У сваю чаргу савецкія воіны, уся краіна дапамагалі насельніцтву рэспублікі аднавіць разбураную вайной гаспадарку.

Такім чынам, у гады акупацыі народнагаспадарчы патэнцыял рэспублікі быў падвергнуты жорсткай эксплуатацыі і рабаванню, што ў канчатковым выніку прывяло эканоміку Беларусі да разбурэння і заняпаду. Па агульнаму ўзроўню развіцця эканоміка рэспублікі была адкінута да ўзроўню 1928 г., поўнасцю альбо часткова разбураны гарады і больш 9000 сельскіх населеных пунктаў. Было згублена звыш паловы нацыянальнага багацця БССР, у той час як па СССР у цэлым страты складалі 30 %. Аднаўленчыя работы ў 1943-1945 гг. праводзіліся толькі з мэтай павелічэння агульнай сумы ваеннай вытворчасці.

### Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: у 6 тамах / А. Вабішчэвіч і інш.; рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2006. – Т. 5: Беларусь ў 1917-1945 гг.

2. Ковкель, И.И. История Беларуси с древнейших времён до нашего времени / И.И. Ковкель, Э.С. Ярмусик. – Мн., 2000.

3. Михнюк, В.Н. Крестьянство на Беларуси на пути к социализму: Историографический очерк. – Мн., 1979.

4. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.

5. Фих, Б.М. Аграрная революция в Белоруссии (1917-1920 гг.). – Мн., 1966.

6. Шкляр, Е.Н. Борьба трудящихся Литовско-Белорусской ССР с иностранными интервентами и внутренней контрреволюцией (1919-1920 гг.). – Мн., 1962.

## Тэма: ДАСЯГНЕННІ І СУПЯРЭЧНАСЦІ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ СІСТЭМЫ БССР Ў ПАСЛЯВАЕННЫ ЧАС

Пасляваеннае развіццё эканомікі краін свету вызначалася спаборніцтвам і канфрантацыяй дзвух сацыяльна-палітычных сістэм – “халоднай вайной”: свет быў падзелены на ***два лагеры – капіталістычны і сацыялістычны***[74].

У шэраг краін так званага “***першага свету***” уваходзілі ЗША і вядучыя заходнееўрапейскія краіны.

У “***другі свет***” – сацыялістычны – да 1950 г. аб’ядналіся краіны, дзе кіравала Камуністычная партыя, сярод якіх галоўную ролю адыгрываў СССР: гэта краіны Усходняй Еўропы (Польшча, Балгарыя, Югаславія, Германская Дэмакратычная Рэспубліка, Румынія, Чэхаславакія, Албанія), Усходу (Кітай, Паўночная Карэя, Манголія, пазней – В’етнам, Лаос), Куба. У сусветным маштабе сацыялістычны лагер складаў 26,1 % тэрыторыі сушы і 32,5 % насельніцтва, выпускаў не меней 2/5 прамысловай прадукцыі і адну трэць нацыянальнага прыбытку.

Існаваў і “***трэці свет***” – туды ўваходзілі былыя калоніі еўрапейскіх дзяржаў, якія атрымалі незалежнасць на працягу 50-х гг., краіны, якія развіваліся.

### Асноўныя этапы эканамічнага развіцця капіталістычных краін у 1945-1985 гг.

У эканамічнай гісторыі краін капіталістычнага лагеру можна вылучыць наступныя этапы.

***Першы этап – пасляваеннае адраджэнне (1945 – пач. 1950-х гг.).*** Дзеля ажыццяўлення эканамічнага вяршынства Злучаныя Штаты рэалізавалі курс Pax Americana – ліберальнага ўладкавання свету. У 1944 г. на канферэнцыі ў Брэтан-Вудзе (штат Нью-Гэмпшыр) для гэтага былі ўтвораны ***Міжнародны валютны фонд (МВФ) і Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця***. ***Брэтан-Вудская сістэма*** ўсталявала ў Заходнім свеце золатадоларавы эталон і фіксаваны валютны курс (што азначала залатое ці доларавае забеспячэнне нацыянальных грашовых адзінак).

У 1947 г. было заключана Генеральнае пагадненне аб тарыфах і гандлю (ГАТТ). Летам 1947 г. дзяржсакратар ЗША Дж. Маршал аб’явіў аб плане эканамічнай дапамогі краінам Еўропы. ***План Маршала*** стаў асноваю эканамічнага саюзу капіталістычных краін, дзякуючы яго рэалізацыі ў 16 краінах-атрымальніках дапамогі адбываўся эканамічны рост, умацаваліся нацыянальныя валюты, значна павялічыўся аб’ём валавога нацыянальнага прадукта, стварыліся рэальныя магчымасці для пашырэння сацыяльнай функцыі дзяржавы.

***На другім этапе (1950-1970 гг.)*** адбываліся ***структурныя змены ва ўмовах ліберальнага рэфармізма ў эканамічнай палітыцы, фармаванне постіндустрыяльнай цывілізацыі.*** З дапамогай макраэканамічнай стратэгіі на грунце кейнсіянства, пры ўліку аб’ектыўных эканамічных законаў, дзяржаўныя структуры былі здольны пераадолець разрыў паміж беднасцю і багаццем, перавысіць прапановы над попытам на рынку працы, выключыць пагрозу спадаў ў развіцці народнай гаспадаркі. Гэта ў значнай ступені змяніла прыроду капіталізма, ён

[74] Гл. падрабязна: Кавалёва, Н.М. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый): выбраныя лекцыі / Н.М. Кавалёва, М.В.Стралец, Л.Ю.Малыхіна; пад рэд. Н.М. Кавалёвай. – Брэст, 2007. – С. 88-101.

пераўтвараўся ў постіндустрыяльнае грамадства, у якім першаступенную значнасць мела не павелічэнне аб'ёма вытворчасці, а развіццё навукі і тэхнікі.

Дагавор, які заснаваў ***Еўрапейскае Эканамічнае Супольніцтва*** (сакавік, ***1957*** г.), членамі якога з моманту заснавання з'яўляліся Бельгія, Італія, Люксембург, Нідэрланды, Францыя, выразна акрэсліў асноўную задачу ЕЭС – фармаванне агульнага рынка шляхам скасавання паміж дзяржавамі-членамі мытных пошлін і колькасных абмежаванняў для ўвоза і вываза тавараў, усталявання агульнага мытнага тарыфа і ўзгодненай гандлевай палітыкі ў адносінах трэціх краін; стварэння ўмоў для свабоднага перамяшчэння рабочай сілы, капіталаў, паслуг; правядзення адзінай палітыкі ў галіне сельскай гаспадаркі і транспарта; каардынацыі эканамічнай, сацыяльнай, валютнай і інвестыцыйнай палітыкі.

На пач. 50-60-х гг. XX ст. у заходніх краінах пачаўся першы этап навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Сучасная НТР істотна змяніла тэхналогію прамысловасці – развіваліся вытворчасць сінтэтычных матэрыялаў, грамадзянская авіяцыя, атамная энергетыка, нафтахімія, электроніка, асваенне космасу; узніклі кампьютэр, ядзерная зброя, лазарная тэхналогія, новыя віды аўтамабільнага транспарту. Усё гэта паскорыла станаўленне грамадства спажывання. Так, увасабленне дасягненняў НТР ў электрафікаваным абыходзе (пыласосы, халадзільнікі, тэлевізары, магнітафоны, пасудамыечныя машыны) садзейнічала ўтварэнню ў ЗША сектара хатняй гаспадаркі (хаусхолд), які забяспечваў перавытворчасць якасці чалавечых рэсурсаў.

***На трэцім этапе (1978-1985 гг.) адбывалася ўдасканаленне постіндустрыяльнай цывілізацыі на аснове манетарызма і эканомікі прапановы.*** Энергетычны, сыравінны, харчовы крызісы сярэдзіны 1970-х гг. сведчылі аб тым, што ўмяшальніцтва органаў цэнтральнага дзяржаўнага кіравання ў эканоміку шляхам рэгулявання перавышэння масай папяровых грошаў патрэбнасцяў грашовага абарота зайшло ў тупік. З мэтаю пераадолення ***"стагфляцыі"*** (інфляцыі выдаткаў; беспрэцэдэнтнага павелічэння колькасці асоб, якія рэгістраваліся на біржы працы; відавочнага зніжэння аб'ёмаў прадукцыі, якая выраблялася ў валаўтваральных галінах матэрыяльнай вытворчасці) кіруючыя колы зоны сталага капіталізма перайшлі да тактыкі манетарызма і эканомікі прапановы:

1) скарацілі выдаткі, звязаныя з выкананнем сацыяльнай функцыі дзяржавы. Пры гэтым дзяржава па-ранейшаму была здольна гарантаваць сваім грамадзянам узровень жыцця, які быў на некалькі парадкаў вышэй, чым у краінах сацыялістычнага лагеру;

2) істотна павялічылі колькасць недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання;

3) каб пазбегнуць абесцэньвання амерыканскага долара і англійскага фунта – вынік празмернай працы друкарскага варштата – сталі своечасова спыняць выпуск валюты;

4) стымулявалі функцыю падаткаабкладання ў адносінах да недзяржаўных суб'ектаў гаспадарання.

Галоўнай падзеяй трэцяга перыяда было стварэнне Еўрапейскай Валютнай Сістэмы, якая пачала дзейнічаць з 13 сакавіка 1979 г. Паскарэнне інтэграцыйных працэсаў у галіне фінансаў дазволіла супольніцтву пераадолець сусветную рэцэсію пачатку 80-х гг., стварыць у Еўропе шырокую зону манетарнай стабільнасці, у рамках якой станавіліся рэдкімі карэктыроўкі валютных курсаў.

Стратэгічнае планаванне неабходнае ва ўскладненых абставінах сучаснай гаспадаркі садзейнічала трансфармацыі капіталізма ў ***змяшаную эканоміку*** ці "***новае індустрыяльнае грамадства***", дзе вялікая роля надавалася "планавай" сістэме. Навука пераўтварылася ў непасрэдную вытворчую сілу, узрасла роля тэхнакратычнай эліты ў кіраўніцтве, ішло станаўленне сацыяльна-рынкавай гаспадаркі і масавай культуры.

### Як развівалася эканоміка краін сацыялістычнай садружнасці?

Вынікамі "халоднай вайны" сталі нарастанне міжнароднай напружанасці, узмацненне пагрозы ўзнікнення сусветнай вайны, рэзкае скарачэнне гандлёва-эканамічных, культурных і іншых сувязей паміж краінамі капіталістычнага і сацыялістычнага лагера. Пачынаючы з 1950-х гг., "гонка ўзбраенняў" стала галоўным прыярытэтам дзяржаўных бюджэтаў як ЗША, так і СССР.

У краінах сацыялістычнага лагеру для супрацьстаяння зоне сталага капіталізма ў 19480-1956 гг. ішло станаўленне камандна-размеркавальнай сістэмы[75]. ***25 студзеня 1949 г.*** быў утвараны ***Савет Эканамічнай Узаемадапамогі (СЭУ)*** сярод сацыялістычных краін, у які першапачаткова ўвайшлі СССР, Балгарыя, Венгрыя, Румынія, Польшча і Чэхаславакія. У 1950 г. у СЭУ ўступіла ГДР, у 1962 – МНР, а ў 1972 – Рэспубліка Куба, у 1978 – СРВ, у 1949-1960 гг. у СЭУ ўвайшла Албанія.

***На першым этапе (1949 – сярэдзіна 1950-х гг.)*** гісторыі міжнародных эканамічных адносін у рамках сацыялістычнай садружнасці акцэнт рабіўся на знешні гандаль.

***На другім (1956-1960 гг.)*** – краіны-члены СЭУ скаардынавалі народнагаспадарчыя планы, што з'явілася першай у гісторыі сацыялістычнай садружнасці спробай доўгатэрміновага ўзгаднення развіцця народных гаспадарак на велізарнай тэрыторыі і ўвязцы эканамічных патэнцыялаў, якія хутка раслі.

***На трэцім этапе (1960-я гг.)*** адбывалася ***спроба перабудовы сістэмы і метадаў супрацоўніцтва*** з рэфармаваннем нацыянальных эканомік. Гэта пытанне было прадметам абмеркавання на нарадах кіраўнікоў партый і кіраўнікоў урадаў краін-членаў СЭУ, адбыўшыхся ў чэрвені 1962 г. і ліпені 1963 г., якія вызначылі шляхі такой перабудовы. У якасці праграмнага дакумента былі прыняты "Асноўныя прынцыпы міжнароднага сацыялістычнага падзелу працы". З цягам часу практычна ўсе еўрапейскія сацыялістычныя краіны перайшлі да эканамічных рэформаў. Найбольш радыкальныя мерапрыемствы былі праведзены ў Югаславіі, Чэхаславакіі, Венгрыі – там была адменена сістэма дырэктыўных паказчыкаў, прадпрыемствы атрымалі шырокія паўнамоцтвы ў размеркаванні даходаў, была ўведзена гнуткая сістэма цэнаў. Прыстасаванне рынкавых механізмаў да склаўшайся эканамічнай сістэмы краін СЭУ не дало істотных зрухаў. Замыканне сістэмы сацыялістычнай эканомікі ў рамках садружнасці прывяло да перавагі экстэнсіўнага, рэсурсаёмкага прамысловага росту, які на пачатковай стадыі індустрыялізацыі прыносіў несумненныя поспехі. Аднак маруднае фармаванне механізмаў міжнароднага падзелу працы ў рамках СЭУ перашкаждала каардынацыі народнагаспадарчых планаў і ажыццяўленню сумесных праектаў.

---

[75] **Камандна-размеркавальная сістэма** характарызуецца панаваннем дзяржаўнай уласнасці, цэнтралізацыяй кіравання, камандна-адміністрацыйнымі метадамі кіраўніцтва, курсам на паскораную індустрыялізацыю, крыніцай назапашвання сродкаў для якой з'явілася сельская гаспадарка

***На чацвёртым этапе (1970-1980 гг.)*** інтэграцыі краін садружнасці была прынята ў 1971 г. комплексная праграма далейшага паглыблення і ўдасканалення супрацоўніцтва, якая была разлічана на 15-20 гадоў. Далейшая канкрэтызацыя і развіццё адпаведных палажэнняў знайшлі адлюстраванне ў пяці Доўгатэрміновых мэтавых праграмах супрацоўніцтва (ДМПС) у галіне энергіі, паліва і сыравіны, сельскай гаспадаркі і харчовай прамысловасці, машынабудавання, вытворчасці прамысловых тавараў народнага спажывання і транспарта за 1978-1979 гг. У 1985 г. была прынята комплексная праграма навукова-тэхнічнага прагрэса краін-членаў СЭУ да 2000 г. Яна арыентавала на паскоранае развіццё атамнай энергетыкі, стварэнне новых матэрыялаў і тэхналогій, электранізацыю народнай гаспадаркі, комплексную аўтаматызацыю. Аднак большасць пунктаў пералічаных праграм не было рэалізавана. У 1980-я гг. унутры СЭУ, які афіцыйна праіснаваў да 1 красавіка 1991 г., стала панаваць тэндэнцыя да дэзінтэграцыі.

Такім чынам, зместам пасляваеннага перыяда гісторыі стала спаборніцтва паміж капіталізмам і сацыялізмам, крах сусветных каланіяльных імперый і ўзнікненне "трэцяга свету", якасныя зрухі ў прыродзе капіталізма, навукова-тэхнічная рэвалюцыя. Асноўны вынік гэтага перыяду – пераўтварэнне заходняй цывілізацыі ў галоўную ўплывовую сілу сусветнага развіцця.

## Аднаўленне і развіццё эканомікі БССР у складзе адзінага гаспадарчага комплексу СССР у 1945-1953 гг.

У час вайны БССР згубіла больш паловы свайго нацыянальнага багацця, загінуў амаль кожны трэці жыхар рэспублікі. У першыя гады пасля вызвалення тэрыторыі эканоміка СССР працавала пераважна на армію. У пасляваенным плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі аптымістычна заяўлялася аб тым, што на аснове росту вытворчасці да 1950 г. даваенны ўзровень дабрабыту насельніцтва будзе не толькі дасягнуты, але і перавышаны. Ажыццявіць гэта было складаней. Развіццё народнай гаспадаркі БССР пасля сусветнай вайны характарызавалася рэзкім паваротам у бок сродкаў вытворчасці, што не магло не адбіцца на развіцці лёгкай прамысловасці і забеспячэнні насельніцтва таварамі спажывання. На дабрабыт жыхароў Беларусі адмоўна ўплывалі і цяжкасці ў развіцці сельскай гаспадаркі гэтага часу. Да таго ж паўднёвыя раёны СССР (у тым ліку і частка Гомельскай вобласці) у 1946 г. ахапіла засуха, таму першыя пасляваенныя гады былі асабліва цяжкімі. У 1946-1947 гг. захоўвалася нармаванае забеспячэнне. Хлебныя карткі ў ліпені 1947 г. атрымлівалі звыш 2,3 млн. чалавек. Паступова асноўнай крыніцай прыбытку жыхароў горада станавілася заработная плата. У 1946 г. яна была павялічана ў вядучых галінах прамысловасці (лясная, будаўнічая). У гэтым жа годзе былі павышаны платы нізкааплатным катэгорыям рабочых і служачых, стыпендыі і пенсіі. Гэтая т. зв. "хлебная" надбаўка была ўведзена адначасова з павышэннем пайкавых цэн на хлеб у сувязі з падрыхтоўкай да ***адмены карткавай сістэмы па забеспячэнню прадуктамі (снежань 1947 г.)*** і пераходу да адкрытага гандлю. Адмена картак спалучалася з ***грашовай рэформай***, калі адбыліся:

- замена старых грашовых знакаў новымі;
- ліквідацыя вынікаў інфляцыі часоў вайны;

• усталяванне адзіных дзяржаўных цэн (да 1948 г. існавалі два ўзроўні: камерцыйныя і пайкавыя).

*У выніку рэформы адбылося першае зніжэнне цэн на большасць тавараў. Але нават пасля трохразовага зніжэння цэн у 1947, 1949 і 1950 гг., яны былі вышэй даваенных. Па адзнаках вучоных, пакупная здольнасць зарплаты беларускіх гараджан да пачатку 1950-х гг. не падымалася вышэй мяжы, дасягнутай ў другой палове 20-х гг. Вясковае насельніцтва, якое перавышала 2/3 усяго насельніцтва БССР, не мела шмат карысці ад грашовай рэформы. Калгасам даводзілася аддаваць асноўную частку грашовых прыбыткаў на вытворчыя патрэбы, набыццё жывёлы і сельскагаспадарчых прылад, будаўніцтва. Кожнае новае дрэўца, жывёліна прыводзілі да істотнага росту падаткаў, цяжар якіх і так быў нясцерпным.*

***Сельская гаспадарка.*** Больш складаным і супярэчлівым было адраджэнне сельскагаспадарчай вытворчасці[76]. Для веснавога севу не хапала насення, мінеральных угнаенняў, інвентару і машын, а МТС не былі здольны поўнасцю выканаць вялікі аб'ём работ у калгасах. Буйной рагатай жывёлы было ў 3 разы менш, чым да вайны. З-за недахопу коней і трактароў у якасці цяглавай сілы на сяўбе выкарыстоўваліся каровы, у плуг запрагаліся нават людзі. Адной з найбольш істотных праблем, з якой сутыкнулася сельская вытворчасць, стаў недахоп людскіх рэсурсаў. Многія салдаты, што вярнуліся з вайны былі калекамі, няздольнымі выконваць цяжкую сялянскую работу. Калгас амаль нічога не даваў земляробам за іх самаадданую працу – большасць калгаснікаў не атрымлівала заработную плату. Аднак пасля вайны быў узяты курс на завяршэнне суцэльнай калектывізацыі ў рэспубліцы (да вайны на захадзе Беларусі ў калгасы было абагульнена толькі 7 % сельскіх гаспадарак).

Да аб'ектыўных прычын адставання сельскай гаспадаркі трэба яшчэ аднесці наступны факт: у 1946 г. памеры пасяўных плошчаў калгасаў рэспублікі ў параўнанні з даваенным перыядам складалі толькі 59 %, саўгасаў – 70 %. Да суб'ектыўных – тое, што партыйныя органы спрабавалі палепшыць справы адміністрацыйнымі метадамі. ***19 верасня 1946 г.*** Савет Мінстраў СССР і ЦК ВКП(б) прынялі пастанову ***"Аб мерах па ліквідацыі парушэнняў Статута сельскагаспадарчай арцелі ў калгасах"***, згодна з якой калгасам Беларусі было вернута звыш 100 тыс. га грамадскай зямлі, шмат жывёлы, якая знаходзілася ў карыстанні асобных людзей і ўстаноў. Сталінскі рэжым прыцягнуў да адказнасці 420 партыйных, савецкіх, гаспадарчых работнікаў, старшынь і радавых калгаснікаў.

Калгасам Беларусі быў даведзены павышаны план збожжавых паставак. Дзяржпастаўкі ў гады чацвёртай пяцігодкі былі вельмі высокімі, часта без уліку канкрэтных магчымасцяў той ці іншай гаспадаркі, што адмоўна ўплывала на эканоміку калгасаў і аплату працы. Сяляне не мелі эканамічных стымулаў да добрай працы – яе аплата насіла апасрэдаваную форму так званых "працадзён" (яны забяспечваліся прадуктамі), у якіх растваралася і колькасць, і якасць працы. Для тых, хто не жадаў працаваць за працадні Вярхоўны Савет СССР ***(у чэрвені 1948 г.)*** выдаў указ ***"Аб высяленні ў аддаленыя раёны асоб, якія злосна ўхіляюцца ад працоўнай дзейнасці ў сельскай гаспадарцы і вядуць антыгра-***

[76] Гл. падрабязна: Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі і інш. – Мн., 1995. – Ч. 2. – С. 331-336.

***мадскі паразітычны лад жыцця"***, што ненадоўга дазволіла павысіць дысцыпліну працы ў вёсцы. Да канца 1950 г. у заходніх абласцях было арганізавана 6053 калгасы, якія аб'ядналі 83,7 % пасяўной плошчы; а ў 1950 г. пачалося аб'яднанне дробных калгасаў ў буйныя. Нельга не адзначыць дапамогу саюзнага ўрада беларускай вёсцы ў тыя гады: у рэспубліку пастаўлялася тэхніка. Але па сутнасці сельскагаспадарчая палітыка, якая праводзілася на Беларусі ў першыя пасляваенныя гады, завершылася банкрутствам.

***Прамысловасць.*** Асноўнымі задачамі прамысловасці ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе былі ***аднаўленне жыллёвага фонду*** (на гэта ішло 53 % бюджэтных сродкаў!), ***ахова здароўя*** (было разбурана 80 % медустаноў, лютаваў тыф, малярыя і іншыя інфекцыйныя захворванні), ***адраджэнне энэргетычнай гаспадаркі*** (адноўлена першая чарга БелДРЭС, будавалася Смалявіцкая цеплавая электрастанцыя) ***і торфаздабываючай вытворчасці*** як асноўнай паліўнай базы Беларусі.

Галоўныя задачы далейшага станаўлення эканомікі намеціў "Закон аб пяцігадовым плане аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі БССР" на ***1946-1950 гг.*** (**IV пяцігадовы план**). У народную гаспадарку планавалася ўкласці 6,9 млрд. рублёў, што перавышала аб'ём капіталаўкладанняў за тры даваенныя пяцігодкі разам узятыя. Было намечана разгарнуць шырокую падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў, стварыць ў рэспубліцы новыя галіны прамысловаці – трактара- і аўтамабілебудаванне, выпуск лакамабіляў, гідратурбін, матацыклаў, веласіпедаў, швейных машын і інш.

*Напрыклад, у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў СССР ад 29 мая 1946 г. пачалося будаўніцтва Мінскага трактарнага завода. У 1950 г. завод пачаў серыйны выпуск трактароў "Кіравец Д-35" – гэта былі гусенічныя машыны для патрэб лясной гаспадаркі. Першыя колавыя трактары "Беларусь" выйшлі з варот завода ў 1953 г.*

Такім чынам, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе аддавалася перавага развіццю прадпрыемстваў ***цяжкай прамысловасці*** – вытворчасці сродкаў вытворчасці: машынабудаванню, металаапрацоўцы, электраэнергетыцы. Пачалі працаваць: мінскі аўтамабільны завод *(МАЗ)*; мінскі трактарны завод *(МТЗ)*, з 1950 г.; мінскі мотавелазавод з 1947 г.; жодзінскі БелАЗ.

Падрымку беларускаму народу ў складаны час разбурэнняў і нястач аказвалі рэспублікі Савецкага Саюза і міжнароднае супольніцтва. Так, на працягу 1945-1947 гг. Беларусь атрымала дапамогу па лініі ЮНРРА (Адміністрацыі Аб'яднаных Нацый па аказаніі дапамогі і адбудавання) памерам ***142 тыс. тонн на суму 61 млн. $.*** У гэтай дапамозе значнае месца займалі прадукты харчавання, адзенне, абутак, лекі. Пэўную частку складала і абсталяванне для некаторых галін прамысловасці і сельскагаспадарчай вытворчасці. Пасля вызвалення ўрад БССР запатрабаваў ад Германіі выплаты рэпарацый на суму 1 млрд. 500 млн. долараў ЗША, што складала 10 % панесеных рэспублікай страт[77]. БССР змагла атрымаць толькі нязначную частку запатрабаваных сродкаў.

Больш хуткімі тэмпамі, чым у цэлым па рэспубліцы ішло аднаўленне Брэсцкай і Гродзенскай абласцей. Яшчэ ў 1948 г. валавая прадукцыя прамысло-

---

[77] Гл. падрабязна: Гісторыя Беларусі:курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі і інш. – Мн., 2002. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі. – С. 502-513.

васці гэтых заходніх абласцей амаль у 1,5 разы перавысіла даваенны ўзровень. Адпаведна афіцыйнай статыстыцы таго часу, у першым квартале 1946 г. прамысловая вытворчасць дасягнула ўзроўню 1940 г. Пры гэтым неабходна падкрэсліць, што прамысловасць рэспублікі аднаўлялася на даволі высокім ўзроўні тэхнічнай і тэхналагічнай аснашчанасці, што ў далейшым вызначыла адносна хуткія тэмпы яе развіцця ў сістэме агульнасаюзнага падзелу працы. Аднак адставалі энергетыка, марудна развівалася вытворчасць тавараў народнага спажывання.

Такім чынам, камандна-адміністрацыйная сістэма ў цэлым вырашыла складаныя праблемы пасляваеннага адраджэння эканомікі. Але больш ці менш апраўданыя ў той час надзвычайныя прынцыпы кіравання эканомікай станавіліся тормазам у далейшым развіцці народнай гаспадаркі.

## Спробы рэфармавання савецкай эканамічнай мадэлі сацыялізму ў другой палове 50-х-60-я гг.

У 1950-я гг. перад эканомікай СССР паўсталі задачы:

1) павышэння матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця;

2) актыўнага ўключэння ў навукова-тэхнічную рэвалюцыю, якая ажыццяўлялася ў свеце;

3) перааснашчэння Савецкай Арміі новымі відамі ўзбраення[78].

Але дастатковых фінансавых і матэрыяльных рэсурсаў для адначасовага вырашэння гэтых задач у краіне не было. Таму, як і ў мінулыя гады, прыярытэт аддаваўся вытворчасці сродкаў вытворчасці і ваенна-прамысловаму комплексу, што знайшло адлюстраванне ў ***V пяцігадовым плане*** развіцця народнай гаспадаркі СССР на ***1951-1955*** г. Курс на ліквідацыю аўтарытарнага рэжыму, пасля смерці Сталіна ў сакавіку 1953 г., патрабаваў перагляду эканамічнай палітыкі, яе гуманізацыі. На жнівеньскай сессіі ВС СССР 1953 г. новы старшыня Савета Міністраў СССР Г.М. Малянкоў выступіў з абгрунтаваннем эканамічнай палітыкі па сацыяльнай пераарыентацыі народнай гаспадаркі. Гэта азначала развіццё прамысловасці тавараў народнага спажывання, павелічэнне капіталаўкладанняў ў лёгкую, харчовую прамысловасць, сельскую гаспадарку. У прынятым на сесіі Дзяржаўным бюджэце СССР на 1953 г. былі прадугледжаны вялікія датацыі на вытворчасць тавараў народнага спажывання, зніжаліся цэны. Хлеб у канцы 1953 г. быў у 3 разы танней, чым у 1948 г. Былі значна павышаны нарыхтовачныя цэны на сельгаспрадукцыю, спісаны нядоімкі з калгасаў, умацавана іх матэрыяльна-тэхнічная база. Нізкія ўраджаі збожжа ў 1953 г. вызвалі надзвычайную сітуацыю, выхад з якой бачылі ў асваенні цалінных зямель (Казахстан, Сібір, Паволжжа, Алтай) і ў павышэнні ўраджайнасці.

***Сельская гаспадарка*** з сярэдзіны 1950-х гг. ўпершыню стала рэнтабельнай. У 1956 г. калгаснікам сталі назначацца пенсіі па старасці і інваліднасці, выдаваліся пашпарты. ***У 1958 г.*** адбылася ***рэарганізацыя МТС***, яны былі пераўтвораны ў станцыі па рамонту сельгастэхнікі, а тэхніка была прададзена калгасам. У 1965 г. у сельскай гаспадарцы БССР працавала ў 5 разоў больш трактароў, у 8 разоў больш камбайнаў і аўтамабіляў, чым у 1950 г., а прадукцыя сельс-

[78] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вуч. дапам. – Выд. 2-е, дап. і перапрац. / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульн. рэд. В.І. Галубовіча. – Мн.: Экаперспектыва, 1995. – С. 342-356.

кай гаспадаркі павялічылася на 70 %. 1950-я гг., на думку многіх эканамістаў, сталі як бы "залатым векам" КАС кіравання, яна дала максімум таго, на што была здольна. Аднак дасягнуты ўзровень развіцця аказаўся ніжэй запланаванага. Адной з прычын была валюнтарысцкая, а гэта значыць, такая, што не ўлічвае законаў грамадскага развіцця, палітыка ў сферы сельскай гаспадаркі М.С. Хрушчова. Так, ім было вырашана, што коні, як рабочая цяглавая сіла, аджылі сваё, а на змену ім прыйшоў трактар. Таму коней перасталі разводзіць. Склаліся адмоўныя адносіны да падсобнай гаспадаркі. Пачалося прымусовае насаджэнне кукурузы ў якасці галоўнай сельска-гаспадарчай культуры амаль ва ўсіх рэгіёнах СССР, нягледзячы на кліматычныя умовы. Так званая "кукурузная эпапея" прывяла да скарачэння пасяўной плошчы традыцыйных для Беларусі культур.

***У прамысловасці Беларусі ў час сямігодкі (1956-1965 гг.)*** разгарнулася вялікае капітальнае будаўніцтва. Адной з асаблівасцяў эканамічнага развіцця БССР стала хуткае развіццё хімічнай прамысловасці, асабліва вытворчасці мінеральных угнаенняў, апераджальнае развіццё атрымалі прыборабудаванне радыёэлектроніка, электроніка. Пачалася газіфікацыя кватэр.

*У гэты перыяд быў пабудаваны завод аўтаматычных ліній і ўпершыню ў СССР – завод электронных вылічальных машын (ЭВМ) у Мінску.*

Былі адменены законы 1938-1940 гг., якія забаранялі рабочым і служачым звальняцца са сваіх прадпрыемстваў і ўстаноў. Ажыццяўлялася спроба стварыць іншую сістэму кіравання народнай гаспадаркай і перайсці ад галіновага (праз міністэрствы) да тэрытарыяльнага (праз саўнаргасы – саветы народных гаспадарак) кіравання. ***10 мая 1957 г.*** ВС СССР прыняў Закон аб ліквідацыі ўсіх агульнасаюзных прамысловых міністэрстваў, што перанесла цэнтр кіравання прамысловасцю на месцы, меркавалася, што паскорыцца ўкараненне дасягненняў НТП, знікнуць ведамственыя бар'еры. Быў утвораны ***Савет народнай гаспадаркі БССР.***

Нягледзячы на безумоўныя недахопы ў развіцці народнай гаспадаркі хрушчоўскага перыяду, тэмпы эканамічнага росту перавысілі ўсе мінулыя дасягненні, і, што асабліва важна, былі дасягнуты не толькі за кошт прыросту рэсурсаў, але і за кошт лепшага іх выкарыстання. Прадукцыйнаць працы за дзесяцігодде ўзрасла на 62 %, фондааддача – на 17, матэрыялаёмістасць знізілася на 5 %. Тэмпы прыросту нацыянальнага прыбытку склалі каля 10 % у год [4, 348]. Была забяспечана таварна-грашовая збалансаванасць, зніжаліся цэны, сельская гаспадарка вырвалася з крызісу.

***Рэформы сярэдзіны 1960-х гг.*** На кастрычніцкім Пленуме ЦК КПСС ***1964 г.*** першым сакратаром ЦК КПСС быў абраны ***Л.І. Брэжнеў*** (з 1966 г. Генеральны сакратар), а старшынёй Савета Міністраў СССР – ***А.М. Касыгін.*** Першая палова 60-х гг. стала перыядам пагаршэння эканамічнай сітуацыі ў СССР. Галоўнымі прычынамі запавольвання тэмпаў эканамічнага развіцця на пачатку 60-х гг. яны называлі вычарпанне магчымасцяў экстэнсіўнага развіцця, неадпаведнасць паміж значным павышэннем аб'ёму вытворчасці, узрослай складанасцю структуры гаспадаркі і тагачаснымі метадамі планавання. У вышэйшых эшалонах улады ўсё больш усведамлялася неабходнасць пераходу да эканамічна абгрунтаваных метадаў кіравання.

У вытворчасці ўкаранялася сучасная тэхніка, ручная праца замянялася машынамі і механізмамі. Аднак доля механізацыі ў прамысловасці працягвала

складаць толькі 25 %. Перавод прамысловасці на новы тэхнічны ўзровень на базе навейшых дасягненняў навукі і тэхнікі здзяйсняўся марудна. Гэта азначала, што ў эканоміцы і грамадстве дзейнічалі сілы тармажэння, звязаныя з захаваннем КАС.




Развіццё прамысловасці характарызавалася пераважна колькасным ростам – адбывалася ***экстэнсіўным шляхам***. Гэта азначала, што павелічэнне колькасці выпускаемай прадукцыі ішло за кошт павелічэння колькасці работнікаў, прадпрыемстваў, капіталаў, якія вылучаліся на развіццё прамысловасці. ***Інтэнсіўны шлях*** патрабаваў не колькаснага росту прадукцыі, а, перш за ўсё, паляпшэння якасці. Гэта магчыма было здзейсніць за кошт укаранення дасягненняў навукі і тэхнікі, павышэння прадукцыйнасці працы.

Аўтарам пачатых рэформаў стаў старшыня Савета Міністраў СССР Аляксей Мікалаевіч Касыгін. Рэформа прадугледжвала ***ўключэнне ў дзеянне таварна-грашовых механізмаў***, гэта значыць, элементаў рыначнай эканомікі (пры захаванні камандна-адміністратыўных метадаў кіравання эканомікай).

Пачатак гаспадарчай рэформы быў пакладзены ***Сакавіцкім пленумам ЦК КПСС (1965 г.)***, які прыняў пастанову ***“Аб неадкладных мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі СССР”:***

1) уводзіўся цвёрды і нязменны план сельскагаспадарчых нарыхтовак на 5 гадоў наперад;

2) нарыхтовачныя цэны на сельгаспрадукцыю павялічылі ў 1,5 – 2 разы;

3) для ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы на вёску пастаўлялі ў 1965-1969 гг. трактары і грузавыя аўтамабілі;

4) усе работы па меліярацыі, вапнаванні кіслых глебаў, паляпшэнні лугоў брала на сябе дзяржава.

Усе гэта садзейнічала павышэнню прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі. Будаваліся адкормачныя комплексы ў жывёлагадоўлі, птушкафабрыкі.

*Агульнасаюзную вядомасць набыў перадавы калгас “Расвет” (Кіраўскі раён Магілёўскай вобласці) пад кіраўніцтвам Кірылы Пракопавіча Арлоўскага – Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы.*

***Вераснёўскі пленум ЦК КПСС (1965 г.)*** прыняў пастанову ***“Аб паляпшэнні кіравання прамысловасцю, удасканаленні планавання і ўзмацненні эканамічнага стымулявання прамысловай вытворчасці”:***

1) замест больш чым 109 планавых паказчыкаў засталося 9. Калі раней асноўным паказчыкам быў аб’ём валавай прадукцыі, то зараз – аб’ём рэалізаванай прадукцыі;

2) уводзіўся гаспадарчы разлік (гасразлік);

3) былі ліквідаваны саўнаргасы і адноўлены міністэрствы па галінах прамысловасці (*замест аднаго Саўнаргаса БССР былі створаны 6 саюзна-рэспубліканскіх міністэрстваў і 3 рэспубліканскіх*).

Першыя крокі гаспадарчай рэформы ўсялялі надзеі. Агульны аб'ём капіталаўкладанняў у народную гаспадарку БССР у ***1966-1970 гг.*** (***VIII пяцігодка***) склаў ***10, 8*** млрд. рублёў, што было больш, чым за дзве папярэднія пяцігодкі. Значная ўвага ўдзялялася рэканструкцыі і мадэрнізацыі абсталявання фабрык і заводаў, аснашчэнню іх аўтаматычнымі і механізаванымі лініямі. Ва ўмовах НТР у БССР адбывалася развіццё наступных галін вытворчасці:

| | |
|---|---|
| металаапрацоўка | Магілёўскі металургічны камбінат |
| машынабудаванне | Завод электронных вылічальных машын у Мінску<br>Мінскі завод аўтаматычных ліній<br>МАЗ, МТЗ, БелАЗ<br>Мінскі завод халадзільнікаў |
| хімічная прамысловасць | Салігорскі калійны камбінат<br>Гродзенскі азотна-тукавы завод<br>Гомельскі суперфасфатны завод |
| энергетыка | Бярозаўская ГЭС (1961 г.) – завершана стварэнне адзінай Беларускай энергасістэмы |
| нафтаапрацоўчая прамысловасць | Полацкі нафтаапрацоўчы камбінат |

Але поспех эканамічнай рэформы быў непрацяглым. Рэформа была наборам супярэчлівых мер. На жаль, задача пераходу на інтэнсіўны шлях развіцця прамысловасці аказалася для рэформаў 1965 г. невырашанай – немагчыма было пашырыць самастойнасць прадпрыемстваў і калгасаў і адначасова ўзмацніць паўнамоцтвы міністэрстваў і ведамстваў.

З аднаго боку, рэформа ў 1,5 разы павялічыла тэмпы росту эканомікі, у 2 разы – тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі [4, 355]. Матэрыяльнае становішча насельніцтва палепшылася за кошт больш высокага мінімальнага ўзроўню заработнай платы і пенсій, будаўніцтва жылля (так зв. "хрушчовак"), лепшага забеспячэння таварамі народнага спажывання. З другога боку, у грамадстве, дзе эканоміка была цесна зрошчана з палітыкай і ідэялогіяй, ніякія карэнныя перабудовы асобна ў эканоміцы былі немагчымы.

## Асноўныя тэндэнцыі індустрыяльнага развіцця БССР ва ўмовах разгортвання НТР (1970-я – першая палова 1980-х гг.)

Першы этап сучаснай навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў свеце ахапіў 1950-60-я гг., асноўнымі вынікамі яго сталі – апераджальнае развіццё аўтамабільнага транспарту, грамадзянскай авіяцыі, атамнай энергетыкі, нафтахіміі, вытворчасці сінтэтычных матэрыялаў, электронна-вылічальнай тэхнікі. Значная ўвага надавалася навукова-тэхнічнаму прагрэсу і ў СССР. У савецкай краіне развіваліся прыкладныя навукі, былі атрыманы важкія вынікі ў галіне паўправаднікоў, ЭВМ. Сведкамі гэтага сталі першыя запускі штучных спадарожнікаў Зямлі, будаўніцтва першых у свеце АЭС, атамнага ледакола і г. д. Але НТП не развіваўся ўшыркі, сістэма кіравання эканомікай блакіравала яго інтэграцыю з вытворчасцю.

У 70-я – перш. пал. 80-х гг. планы IX, X, XI пяцігодак ставілі мэту ўзняць узровень жыцця за кошт пераводу эканомікі на ***інтэнсіўны шлях*** развіцця, больш рацыянальнага выкарыстання вытворчага патэнцыялу. Але захаванне старых прыярытэтаў і экстэнсіўнасці шляхоў (БАМ, засваенне Заходняй Сібіры), адміністратыўна-камандных метадаў і прывілегій партыйна-дзяржаўных чыноўнікаў прывялі да ***застою*** ў развіцці эканомікі СССР. Аднак застой у эканамічным жыцці ніколі не быў поўным і абсалютным: быў дасягнуты безумоўны рост дабрабыту і рэальных даходаў насельніцтва, капіталаўкладанні ў гаспадарку БССР за ***1970-1985 гг.*** дасягнулі звыш ***68 млрд. рублёў***, былі ўведзены ў строй звыш 170 прамысловых прадпрыемстваў, з іх:

- Магілёўскі камбінат шаўковых тканін (1973);
- Баранавіцкі завод аўтамабільных ліній (1974);
- Пінскі завод кузнечна-прэсавых аўтаматычных ліній;
- Лунінецкі завод электрарухавікоў (1975);
- Завод ліцейнага абсталявання ў Пінску.

*У 1971 г. упершыню ў СССР пачался серыйная вытворчасць самазвальнага аўтапоезда для падземных работ, аснашчанага нейтралізатарам выхлапных газаў.*

Расла вытворчасць прадукцыі тых галін прамысловасці, якія вызначаюць НТР – прыборабудавання, электроннай і радыётэхнічнай прамысловасці, вытворчасць сродкаў сувязі. Ажыццяўляліся агульнасаюзныя комплексныя праграмы па тэхнічным перааснашчэнні прамысловасці. На працягу 1971-1985 гг. у народнай гаспадарцы Беларусі было выкарыстана каля 2 млн. вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў [4, 363]. За гэты ж перыяд прадукцыя павялічылася больш чым у 3 разы, валавы грамадскі прадукт – амаль у 2,5 разы (паказчыкі былі адны з самых высокіх у СССР!). Далей развіваўся чыгуначны, аўтамабільны, рачны і паветраны транспарт, стаў развівацца самы эканамічны від транспарта – трубаправодны (газапровад Таржок – Івацэвічы, нафтапровад). Пашырылася сетка тэлефоннай і радыёсувязі, а таксама тэлебачання.

Эканамічны рост у 70-я гг. быў выкліканы за кошт рэзкага павелічэння, у 10 разоў і больш, сусветных цэнаў на нафту. Але накіраваныя "на праяданне" гэтыя 180 млрд. "нафтадолараў" не вырашылі праблем тэхнічнага пераўзбраення вытворчасці, ні радыкальнага паляпшэння ўмоў жыцця. У 1980-я гг. цяжкая прамысловаць рэспублікі ва ўмовах "халоднай вайны" пераўтваралася ў галіну вытворчасці па абслугоўванню ваенна-прамысловага комплексу ***(ВПК)***. Даволі стабільнай заставалася фінансавая сістэма – даходная частка бюджэту перавышала расходную. Адбыліся істотныя змены ў сацыяльнай сферы. Рэальныя даходы насельнцтва ў 1970-я ў параўнанні з 1960 г. павысілася на 63 % – былі ўстаноўлены новыя стаўкі і аклады, вырасла заработная плата рабочых і служачых. У сем'ях адбывалася ўваходжанне ў шырокі ўжытак бытавой тэхнікі (халадзільнікі, радыё, тэлевізары, відэатэхніка, пральныя машыны, пыласосы, электрапліты і інш.). Поспехі і дасягненні сапраўды былі. Але відавочна і тое, што эканоміка Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюза, страціла былы дынамізм.

### У чым прычыны паступовага запавольвання тэмпаў эканамічнага росту ў час "брэжнеўскага застою"?

Абвешчаны Л.І. Брэжневым курс на стабільнасць набываў прыкметы стагнацыі. У палітычны лексікон увайшло паняцце "развіты сацыялізм". Усё больш

мацнелі заклікі да працоўных мас мабілізаваць сродкі, адрадзіць стаханаўскі рух. Але адміністрацыйныя метады кіравання не спрыялі павышэнню прэстыжнасці сумленнай працы. Усё больш заяўляла аб сабе тэндэнцыя абязлічвання грамадскай уласнасці. Пашыраўся крадзеж народнага багацця, марнатраўства.

Нягледзячы на высокія паказчыкі росту прамысловай вытворчасці, з перш. пал. 70-х гг. узмацняліся негатыўныя з'явы – адставанне тэмпаў паскарэння НТП і ўкаранення ў вытворчасці дасягненняў навукі і тэхнікі. Павялічвалася спажыванне сыравіны і паліва. Зніжаўся рост прадукцыйнасці працы, узмацнялася незбалансаванасць у планаванні, знізіліся тэмпы эканамічнага росту.

***Прыкметамі наспявання эканамічнага застою ў БССР былі*:**

1) крызіс аграрнай сферы;
2) нізкі тэхнічны ўзровень абсталявання;
3) каманднa-адміністрацыйная сістэма;
4) пераважна экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі;
5) выкладанне вялікіх сродкаў на ВПК;
6) экалагічныя праблемы пры меліярацыі і хімізацыі;
7) рост дэфіцыту тавараў першай неабходнасці.

Асабліва адчувальным для насельніцтва СССР быў ***хранічны крызіс у аграрнай сферы***. Справа была не ў тым, што адтрымлівалі малую колькасць прадукцыі, а ў тым, што існавала цэнтралізаваная сістэма размеркавання, дзе галоўную ролю адыгрываў чыноўнік, а не гаспадар. Вялікія страты цярпеў рэспубліканскі бюджэт ад розніцы паміж вялікай нарыхтовачнай і нізкай прадажнай цаной на сельгаспрадукцыю.

У маштабах СССР развіццё сельскай гаспадаркі ў БССР выглядала нядрэнна. Напрыклад, доля паставак у агульнасаюзны фонд мяса складала 12 %, малака – 14 %. Беларусь у тыя гады называлі "*адкормачным цэхам Савецкага Саюзу*". Забеспячэнне насельніцтва прадуктамі харчавання да пачатку 1980-х гг. пагоршылася. Была прадпрынята спроба вырашыць гэтую задачу з дапамогай утварэння аграпрамысловага комплекса (АПК). Была распрацавана "***Харчовая праграма СССР" (1982 г.)***, але яе мерапрыемствы эфекту не мелі.

Практыка звышцэнтралізаванага кіравання, адсутнасць самастойнасці прадпрыемстваў, захаванне шматлікіх планавых паказчыкаў прывялі да незацікаўленасці вытворцаў у паскарэнні НТП, фармальнага выканання планаў.

Адной з прыкмет нарастання крызісу стала ***ігнараванне праблем экалогіі***. Адчуваліся вынікі празмернай *хімізацыі* – унясення ў глебу штучных угнаенняў. У 60-80-я гг. у БССР разгарнуліся шырокія меліярацыйныя работы. У 1985 г. плошча асушаных зямель (пераважна на Палесіі) была даведзена да 2,8 млн. га. Аднак праведзеная без глыбокай навуковай распрацоўкі, яна прывяла да асушэння рэк і вадаёмаў, забруджвання іх нітратамі і ядахімікатамі. БССР, займаючы 1 % усесаюзнай тэрыторыі, маючы 4 % ад насельніцтва СССР, у 1981 г. выпрабляла ў маштабах краіны 52 % калійных угнаенняў і 22 % хімічных валокнаў. Такім чынам, Беларусь была перанасычана прадпрыемствамі хімічнай прамысловасці, а гэта вяло да забруджвання прыроднага асяроддзя, асабліва такіх новых прамысловых цэнтраў як: Салігорск, Наваполацк, Светлагорск.

Упарадкаванне аплаты працы слаба звязвалася з яе вынікам і якасцю. Асартымент і якасць многіх тавараў і паслуг не задавальнялі спажыўцоў, да

таго ж прамысловасць недастаткова забяспечвала насельніцтва таварамі, многія з якіх станавіліся дэфіцытам.

Развіццё Беларусі, як састаўной часткі гаспадарчага арганізма СССР, вызначалася адзінымі народнагаспадарчымі планамі, выкарыстаннем тэрытарыяльнага падзелу працы. БССР пастаўляла ў саюзныя рэспублікі аўтасамазвалы, трактары, ЭВМ, тэлевізары, металарэжучыя станкі, мінеральныя ўгнаенні, хімічныя валокны, падшыпнікі, газавыя пліты. Адпаведна сыравіна і камплектуючыя дэталі паступалі ў БССР з усіх рэгіёнаў Савецкага Саюза. Пасля развалу саюзнай дзяржавы высокая ступень інтэграванасці эканомікі Беларусі ў эканоміку СССР адмоўна адбілася на яе становішчы.

Такім чынам, аднаўленне эканомікі БССР планавалася і было завершана на працягу IV пяцігодкі пры дапамозе савецкіх рэспублік, сродкаў ААН, ва ўмовах цэнтралізаванай планавай сістэмы эканомікі, як частка працэса мадэрнізацыі. У наступны перыяд у рэспубліцы вялося інтэнсіўнае капітальнае будаўніцтва, прамысловасць і сельская гаспадарка ў асноўным працавалі з нядрэннымі вынікамі – адбывалася механізацыя і аўтаматызацыя прадпрыемстваў. Адна з самых развітых рэспублік, Беларусь, тым не менш з'яўлялася часткаю адзінага народнагаспадарчага комплексу, залежала ад яго па крыніцах сыравіны, па рынках збыту. Структура беларускай эканомікі арыентавалася ў першую чаргу на вываз гатовай прадукцыі і была непрыстасавана да задаваленння асабістых патрэб. Рэспубліка выконвала ролю своеасаблівага "зборачнага цэха" краіны, дзе звыш 80 % аб'ёма прамысловай прадукцыі давалі прадпрыемствы саюзнага падпарадкавання. Да таго ж эканоміку Беларусі савецкага перыяду характарызаваў экстэнсіўны шлях развіцця, пры якім дастаткова высокія тэмпы росту вытворчасці апераджалі яшчэ больш высокія тэмпы рэсурсаспажывання. Краіну адрознівала неразвітая сацыяльная сфера і сфера паслуг, на долю якіх прыходзілася толькі 16 % нацыянальнага прыбытку. БССР не дабілася рашучага зруху ў інтэнсіфікацыі вытворчасці. Дабрабыт людзей адставаў ад узроўню развітых краін свету, адчувалася неабходнасць перамен. Было відавочна, што эканоміка страціла дынамізм. Калі развіццё вядучых краін вызначала НТР, у прамысловасці СССР да пачатку 80-х гг. былі аўтаматызаваны ці механізаваны толькі 10-15 % прадпрыемстваў. Незаўважанае абясцэньванне грашовых прыбыткаў стала рэальным на пачатку 90-х гг. Аднак эпоха 60-70-х і нават 80-х гг. засталася ў сацыяльнай памяці насельніцтва як эпоха стабільнасці і ўпэўненасці ў заўтрашнім дні.

### Літаратура

1. Гісторыя Беларусі: вучэб. дапам: у 2 ч. / Пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 1998. – Ч. 2: Люты 1917 г. – 1997 г.

2. Гісторыя Беларусі: курс лекцый: у 2 ч. / П.І. Брыгадзін, У.Ф. Ладысеў, П.І. Зялінскі [і інш.]. – Мн., 2002. – Ч. 2. XIX-XX стагоддзі.

3. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі і [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.

4. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульн. рэд. В.І. Галубовіча. – Выд. 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: Экаперспектыва, 1995.

# Раздзел V. СУЧНАСНАЯ БЕЛАРУСЬ НА ШЛЯХУ ТРАНСФАРМАЦЫІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН

## Што ўяўляе сабою эканоміка постіндустрыяльнага грамадства?

У 80-90-я гг. XX ст. у развітых краінах ішло далейшае ўсталяванне ***постіндустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства***: дзе на змену індустрыі прыйшла дыферэнцыяваная эканоміка, пры якой былі не патрэбнымі агромістыя валавыя аб'ёмы вытворчасці; узровень аўтаматызацыі дазваляў знізіць занятасць працаздольнага насельніцтва ў сферы матэрыяльнай вытворчасці; вялікае месца занялі сферы абслугоўвання, рэкламы, інтэлектуальная. Тэрмін "постіндустрыялізм" быў уведзены ў навуковы абарот у пачатку XX ст. вучоным А. Кумарасвамі, а шырокае прызнанне канцэпцыя атрымала пасля выхаду работ Д. Бэлла. Блізкай да постіндустрыяльнай тэорыі з'яўляецца канцэпцыя інфармацыйнага грамадства – грамадства масавага спажывання, якое нарадзіла сэрвісную эканоміку, а ў яе рамках стаў хуткімі тэмпамі развівацца інфармацыйны сектар гаспадаркі. Постіндустрыяльным называецца грамадства, у якім сфера паслуг атрымала прыярытэтнае развіццё і пераважае над аб'ёмам прамысловай вытворчасці і вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі [3, 271]. Часцей постіндустрыяльнымі краінамі называюць тыя, дзе на сферу паслуг прыходзіцца больш паловы ВВП[79], пад гэты крытэрый у пачатку XXI ст. падыходзяць ЗША, краіны Еўрасаюза, Аўстралія, Японія, Канада і Расія.

## Эканамічнае становішча Беларусі ў 1985-1990 гг.

Эканамічная спадчына перыяду застою была не такой цяжкай, як гэта ўяўлялі некаторыя эканамісты: дэфіцыт бюджэту і знешняя запазычанасць былі нязначнымі, спажывецкі рынак знаходзіўся ў стане адноснай раўнавагі, цэны раслі не так абвальна як сёння. Абмеркаванне ***XII пяцігадовага плана*** развіцця БССР на ***1986-1990 гг.*** на XX з'ездзе КПСС адбывалася ў сітуацыі наспявання крызісных з'яў у эканоміцы, аднак пошукі шляхоў перабудовы эканамічных адносін пачаліся не з радыкальных рыначных ідэй, а вельмі сціплых праектаў у рамках старой адміністрацыйна-каманднай сістэмы. Асноўныя надзеі ўскладаліся тады на адміністрацыйныя меры, на ўмацаванне адказнасці, працоўнай дысцыпліны, мабілізацыю скрытых рэсурсаў, сродкаў і іх пераразмеркаванне, барацьбу з непрацоўнымі прыбыткамі.

***Першым этапам эканамічнай рэформы стала выкананне праграмы "Інтэнсіфікацыя"***, галоўнымі яе задачамі сталі:

- забеспячэнне росту вытворчасці за кошт выкарыстання *інтэнсіўных* шляхоў;
- пераход ад КАС да гаспадарчага разліку (***гасразлік***) і ***самафінансавання*** на прадпрыемствах;
- увядзенне ***дзяржпрыёмкі*** – дзяржаўная прыёмка выпускаемай прадукцыі з мэтай кантролю за якасцю;
- пераарыентацыя эканомікі з вытворчасці сродкаў вытворчасці на выпуск тавараў народнага спажывання.

---

[79] **ВВП** – агульнапрынятае скарачэнне GDP, ад англ. Gross Domestic Product (валавы ўнутраны прадукт) – рынкавы кошт усіх канчатковых тавараў і паслуг, створаных за год ва ўсіх галінах эканомікі на тэрыторыі дзяржавы для непасрэднага ўжывання, экспарта і назапашвання.

Важным этапам у перабудове эканамічных адносін стаў пераход ***ад курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця да радыкальнай рыначнай рэформы***: у 1987 г. быў прынят шэраг дакументаў “Аб карэннай перабудове кіравання эканомікай”.

Увядзенне “свабодных” цэнаў (дагаварных і самастойна вызначаемых) у Савецкім Саюзе прывяло да гіперінфляцыі, вялікага дэфіцыту бюджэту, адбыўся разрыў гаспадарчых сувязей, падзенне вытворчасці і рэальных прыбыткаў працоўных. У другой палове 1980-х гг. стала дзейнічаць талонная сістэма забеспячэння тавармі першай неабходнасці.

Вялікі ўрон эканамічнаму і чалавечаму патэнцыялу Беларусі нанесла аварыя на Чарнобыльскай АЭС (26 красавіка 1986 г.) – па падліках вучоных, страты склалі 32 гадавых рэспубліканскіх бюджэта, была забруджана адна пятая частка тэрыторыі. Толькі ў 1989 г. была прынята доўгатэрміновая ***“Дзяржаўная праграма ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС”***, перaселена звыш 130 тыс. чалавек. Адначасова з гэтым рэзка, прыкладна ў 2-3 разы, знізіліся сусветныя цэны на нафту і газ, другую сыравіну, якія былі галоўнымі вытокамі паступлення валюты ў Савецкі Саюз.

Ужо ў 1988 г. ва ўмовах гаспадарчага разліку і самафінансавання ў БССР працавалі прамысловасць, аграпрамысловы комплекс, транспарт, гандаль, большасць будаўнічых прадпрыемстваў. Але прыбытак прадпрыемства залежаў не столькі ад працы калектыва, колькі ад вызначаных зверху цэн, планаў выпуску прадукцыі, зябеспячэння сыравінай і паліўна-энергетычнымі рэсурсамі. У гэты ж час былі прыняты меры па павышэнню якасці выпускаемай прадукцыі, каб яна была канкурэнтназдольная на сусветным рынку. Перавод прадпрыемстваў на поўны гасразлік і самафінансаванне, увядзенне дзяржпрыемкі з’явіліся першым этапам эканамічнай рэформы. Рэформай прадугледжвалася змяніць існуючую сітэму планавання і перайсці да дзяржзаказа, спачатку абавязковага, а потым добраахвотнага. У чэрвені 1988 г. кіраўнікі асобных саюзных рэспублік былога СССР прапанавалі перайсці на адносіны рэгіянальнага ці рэспубліканскага гаспадарчага разліку – адзіная эканамічная прастора СССР пачала хутка разбурацца.

Новыя напрамкі эканамічнага развіцця, скіраваныя на пераход ад каманднa-адміністрацыйнай сістэмы да рынку, былі канкрэтызаваны ў рамках 1-5 з’ездаў Народных дэпутатаў СССР, Вярхоўнага Савета СССР, якія адбыліся ў 1989-1991 гг. Былі прыняты законы СССР аб кааперацыі, індывідуальнай працоўнай дзейнасці, арэндзе і арэндных адносінах, падатках, аб уласнасці, прадпрыемствах, зямлі і іншыя[80].

Важнейшымі ўмовамі ўсталявання рыначных адносін былі раздзяржаўлянне і прыватызацыя значнай часткі ўласнасці, дэманапалізацыя вытворчасці, падтрымка свабоднага прадпрымальніцтва, развіццё канкурэнцыі.

Аднак чаканых вынікаў пераўтварэнні не прынеслі – механізм паскарэння ніяк не мог зламаць механізм тармажэння, эканоміка захоўвала затратны характар. *З 1989 г.* рэспублікі Савецкага Саюзу апынуліся ***ў становішчы эканамічнага крызісу***. Інфляцыя перавышала ўсе дапушчальныя межы, адбывалася падзенне вытворчасці ВВП, зніжэнне выпуску і рэалізацыі прадукцыі як пра-

[80] Гл. падрабязна: Эканамічная гісторыя Беларусі: вуч. дапам. / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульн. рэд. В.І. Галубовіча. – Выд. 2-е, дап. і перапрац.– Мн.: Экаперспектыва, 1995. – С. 381-390.

мысловасці, так і сельскай гаспадаркі, пагаршэнне сацыяльнага забеспячэння насельніцтва. Адзіным дасягненнем беларускай эканомікі 80-х гг. стала пераарыентацыя яе з вытворчасці сродкаў вытворчасці на выпуск тавараў народнага спажывання.

### Пераход да рынкавых адносін ва ўмовах суверэннай Рэспублікі Беларусь

Другі этап эканамічнай рэформы ішоў ва ўмовах пагаршэння стану эканомікі. Да восені 1990 г. у СССР вызначыліся тры варыянты пераходу да рынкавых[81] адносін:

1) "500 дзён" – радыкальная праграма групы эканамістаў пад кіраўніцтвам акадэміка С. Шаталіна і намесніка старшыні ўрада РСФСР Р. Яўлінскага;

2) кансерватыўная праграма ўрада СССР пад кіраўніцтвам М.І. Рыжкова;

3) ліберальная праграма пад кіраўніцтвам прэзідэнта М.С. Гарбачова[82].

На падставе апошняй у кастрычніку 1990 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў "Асноўныя напрамкі стабілізацыі народнай гаспадаркі і пераход да рыначнай эканомікі" – пераход да новых прынцыпаў гаспадарання расцягваўся, але захоўвалася адзіная эканамічная прастора СССР, што давала пазбегнуць катастрафічнай дэзінтэграцыі рэспублік. Але ВС БССР распрацаваў асабістую праграму, у аснове якой была пакладзена радыкальная праграма С. Шаталіна і Р. Яўлінскага. Яна прадугледжвала шэраг надзвычайных стабілізацыйных мер, стварэнне асноўных рынкавых інстытутаў, пыватызацыю, дэманапалізацыю, змену сістэмы дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Паэтапная лібералізацыя цэн павінна была сумяшчацца з выкарыстаннем "сацыяльных амартызатараў", якія б дазволілі не дапусціць рэзкага падзення жыццёвага ўзроўню асноўнай масы насельніцтва.

Аднак ужо ў першыя гады рэфармавання эканомікі былі дапушчаны памылкі. Нацыянальны банк быў выведзены з падначалення ўрада, пры стварэнні ўстаўных фондаў камерцыйных банкаў былі выкарыстаны дзяржаўныя сродкі, пасля чаго банкі сталі прыватызаванымі. Урад В. Кебіча пазбавіўся магутнага ўздзеяння на вытворчасць, дзе яшчэ заставалася ў той час больш чым 90 % дзяржаўнай уласнасці.

На пачатку 1990-х гг. Беларусь адчувала сур'ёзныя праблемы, якія былі выкліканы распадам Савецкага Саюза. Толькі ў 1991 г. у Беларусі ўпершыню адбылося абсалютнае падзенне вытворчасці прамысловай і сельскагаспадарчай прадукцыі [2, 398]. За першыя гады сваёй незалежнасці рэспубліка страціла амаль трэць свайго ВВП, парушыліся прапорцыі паміж прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, узраслі цэны на энергарэсурсы, камплектуючыя, сыравіну, транспартныя паслугі.

***У перш. палове 1990-х гг. у Рэспубліцы Беларусь пачаліся пошукі шляхоў пераходу да рыначных адносін***. Перыяд 1992-1994 гг. характарызаваўся жорсткай палітычнай барацьбой ў Вярхоўным Савеце рэспублікі па пытаннях

---

[81] **Рынак** – у вузкім сэнсе сфера непасрэднага таварнага абарачэння, абмена грошай на тавары і тавараў на грошы. У шырокім сэнсе – сістэма эканамічных адносін, якая забяспечвае эфектыўнае функцыянаванне народнай гаспадаркі на аснове зацікаўленасці таваравытворцаў у атрыманні прыбытку. Сутнасцю рынкавых адносін з'яўляецца рынак тавараў, які можа эфектыўна дзейнічаць толькі ва ўзаемасувязі з іншымі рынкамі – капіталаў, працоўнай сілы, сродкаў вытворчасці, жылля, інфармацыі, тэхнічных навінак і г. д.

[82] Гл. падрабязна: Там жа. – С. 390-398.

эканамічнага развіцця і дзяржаўнага будаўніцтва. Склаліся два асноўных варыянты правядзення рэформаў і перахода да рынку.

Першы шлях заключаўся ў фарсіраваным пераходзе да рыначных адносін, поўнамаштабным ажыццяўленні рынкавых пераўтварэнняў. Нерэгуляванаму рынку ўласціва стыхійнасць, якая вядзе да эканамічных страт, зніжэнню эфектыўнасці вытворчасці, нараджэнню істотнай дыферэнцыяцыі прыбыткаў. Следствам рынкавай канкурэнцыі нярэдка становяцца беспрацоўе, абавастрэнне становішча малазабяспечаных пластоў насельніцтва. Пры ўсёй пазітыўнай ролі рынак не ў стане забяспечыць эфектыўнае рашэнне шэрага стратэгічных задач развіцця эканомікі, знішчыць сацыяльныя праблемы і супярэчнасці.

Другі шлях прадугледжваў паступовы рух да рынкавых адносін пры актыўным умяшальніцтве дзяржавы ў эканамічныя працэсы (як усталяванне дзяржкантролю за цэнамі, змякчэнне сацыяльных выдаткаў, папаўненне бюджэтнай складаючай). Баючыся негатыўных наступстваў хуткага пераходу да рынку, кіраўніцтва падтрымала другі варыянт прасоўвання да рынку, на базе якога была распрацавана тэарэтычная мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Праграма паступовых, неабмежаваных рамкамі часу пераўтварэнняў прадугледжвала, што дзяржава стане выступаць у якасці рэгулятара рынку. Уводзіліся ***рыначныя цэны*** на большасць тавараў і паслуг, ішло станаўленне ***прадпрымальніцтва***, банкаўскіх і камерцыйных структур, праводзілася ***прыватызацыя*** – раздзяржаўлянне, перадача аб'ектаў гаспадарання з дзяржаўнай уласнасці ў прыватную. Аднак крызісныя працэсы ў эканоміцы прадоўжыліся, асабліва востра стаяла праблема ***інфляцыі*** – абясцэньвання грошай і зніжэння іх пакупной здольнасці. Лібералізацыя цэнаў абясцэніла накапленні дзяржавы, прадпрыемстваў і насельніцтва, выклікала востры фінансавы дэфіцыт, галапіруючую інфляцыю (да 40 % у месяц).

Вялікія страты панесла прамысловасць у сувязі з рэзкім скачком цэн у 1992-1993 гг. на паліўна-энергетычныя рэсурсы з Расіі – падняўся кошт прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў, узніклі цяжкасці са збытам. З-за сістэмных перабояў у пастаўках сыравіны, камплектуючых матэрыялаў сотні прадпрыемстваў скарацілі вытворчасць. Прадоўжыла пагаршацца становішча сельскай гаспадаркі – для забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання была ўведзена ***сістэма талонаў***. Станоўчае значэнне ў некаторым скарачэнні плацёжнага дэфіцыту меў увод у абарачэнне (1992 г.) разліковых білетаў Нацыянальнага банка РБ. У гэтых умовах больш настойліва сталі ўздымацца пытанні аб неабходнасці сумяшчэння каманднага кіравання калгасамі з іншымі спосабамі гаспадарання на зямлі.

У ***1991*** г. быў прыняты Закон "***Аб сялянскай (фермерскай) гаспадарцы***" (аднак фермерскіх гаспадарак ў Беларусі было ўтворана зусім мала), у ***1993*** г. – Закон "***Аб праве ўласнасці на зямлю***", які прадугледжваў існаванне прыватнай, калектыўнай і дзяржаўнай уласнасці.

Правядзенне рэформаў у 1992-1994 гг. дазволіла стварыць у Беларусі неабходны мінімум асноўных рыначных інстытутаў, нарматыўна-прававых дакументаў, пераўтварыць сістэму дзяржаўнага кіраўніцтва эканомікай у новую, якая абапіраецца на рыначныя рэгулятары. Дэфіцыт тавараў у РБ уступіў месца

дэфіцыту грошай у насельніцтва, "жалезная заслона" змянілася "фінансава-грашовай".

**Рэалізацыя сучаснай беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця**

З другой паловы 1990-х гг. пачалося фармаванне беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, якая б дазволіла ажыццявіць пераход ў постіндустрыяльнае інфармацыйнае грамадства.

29 верасня 1994 г. Кабінет Міністраў РБ прапанаваў Вярхоўнаму Савету праграму неадкладных мер па вывaду эканомікі з крызісу А. Лукашэнкі. Былі таксама распрацаваны "Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ на 1996-2000 гг". Такім чынам, ***ў другой палове 1990-х гг.*** у якасці нацыянальнай мадэлі развіцця РБ была вызначана ***сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка***, якая спалучае перавагі рыначнай канкурэнцыі і эфектыўнай сістэмы абароны сацыяльных інтарэсаў, ідэі рыначнага самарэгулявання і дзяржаўнага кіравання для дасягнення прыярытэтных мэт развіцця нашай краіны:

1) забеспячэння паступовага пераходу да постіндустрыяльнага, інфармацыйнага грамадства на аснове рэалізацыі навуковых новаўвядзенняў і новых тэхналогій, роста вытворчасці працы і валавага ўнутранага прадукту;

2) дасягненне на аснове павышення эфектыўнасці эканомікі і апераджальнага развіцця сацыяльнай сферы еўрапейскіх стандартаў матэрыяльнага забеспячэння грамадзян і павышэнне якасці іх жыцця;

3) фармаванне грамадзянскага грамадства і ўтварэнне эфектыўнай прававой сацыяльнай дзяржавы.

Калі гэтыя задачы аб'ядноўваюць у нейкай формуле, яна гучыць наступным чынам: ***утварэнне моцнай і квітнеючай Беларусі.*** На першым этапе станаўлення гэтай мадэлі пераважала дзяржаўнае кіраванне.

У 90-я гады была створана неабходная прававая база для эканамічнага супрацоўніцтва: падпісана Мытнае пагадненне, дагаворы аб узаемнай падтрымцы і абароне інвестыцый, аб недапушчальнасці двайнога падаткаабкладання. У выніку стаў расці тавараварот, Беларусь атрымала станоўчае сальда. Быў узяты курс на аднаўленне эканамічных сувязей паміж былымі савецкімі рэспублікамі ў рамках СНД. Так, у 1995 г. Дагавор паміж РБ і РФ "Аб мытным саюзе" адмяніў пошліны на ***імпарт*** (увоз) і ***экспарт*** (вываз) тавараў паміж імі.

***У пачатку XXI*** ст. адбыліся новыя змяненні ў прававой сферы, якія былі ***накіраваны на лібералізацыю эканомікі і павышэнне інвестыцыйнай прывабнасці Рэспублікі Беларусь***. Гэтыя крокі прадпрымаліся для дасягнення Кіраўніком дзяржавы такой мэты, як увахоДжанне ў колькасць першых 25 краін у рэйтынгу Сусветнага банка па ўмовах вядзення бізнесу.

Першая дакладная фармулёўка асноўных асаблівасцей беларускай эканамічнай мадэлі была дана Прэзідэнтам РБ ў сакавіку 2002 г. Гэта:

1) пабудова моцнай і эфектыўнай дзяржавы;

2) забеспячэнне раўнапраўя ўсіх форм гаспадарання;

3) ажыццяўленне індывідуальнай, прадуманай прыватызацыі;

4) разгортванне шырокіх інтэграцыйных працэсаў з краінамі СНД;

5) многавектарнасць знешнеэканамічных сувязей;

6) моцная сацыяльная палітыка дзяржавы.

*Прыватызацыя ў сучаснай Беларусі з'яўляецца сродкам знаходжання зацікаўленнага інвестара, утварэння эфектыўнага прыватніка. У краіне працуюць*

*каля 3,5 тыс кампаній, арганізаваных з удзелам інвестараў з 90 краін свету. Найбольшая колькасць прадпрыемстваў з замежным капіталам утворана з такімі краінамі, як Расія, ЗША, Германія, Польшча, Літва. Паспяхова працуюць такія замежныя прадпрыемствы, як «Уномедикал», «Бакко Бисов», «Маерск Медикал», «Мобильные ТелеСистемы», «Санта-Бремор», «Милавица», «Инко-фуд» і іншыя. Згодна справаздачы аб сусветных інвестыцыях за 2004 г., па індэксу патэнцыяла па прываблiванню прамых замежных інвестыцый Беларусь займала 56 месца ў свеце, узняўшыся ў параўнанні з 1996 г. на 22 прыступкі.*

Сёння Беларусь ажыццяўляе знешнегандлёвыя аперацыі з 163 краінамі свету, экспартуе амаль 70 % прадукцыі: 90-95 % зробленых трактароў і аўтамабіляў, да 70-75 % металарэжучых станкоў, 70-80 % халадзільнікаў і маразільнікаў, палову тэлевізараў, 80-90 % калійных угнаенняў, 60-80 % хімічных валокнаў. Аднак паглыбленню знешнеэканамічных сувязяў з Захадам перашкаджалі палітыка двайных стандартаў заходніх краін, антыдэмпінгавыя квоты на калійныя солі і тэкстыль, імкненне замежных прадпрымальнікаў імпартаваць з Беларусі сыравіну, неканкурэнтназдольнасць некаторых вырабаў беларускіх прадпрыемстваў. У такіх абставінах асаблівае значэнне набыла праблема эфектыўнага выкарыстання традыцыйных рынкаў збыту. ***10 кастрычніка 2000 г.*** на аснове Мытнага саюза РБ, РФ, Казахстана і Кыргыстана (1995) было створана ***Еўразійскае эканамічнае супольніцтва (ЕўрАзЭС)*** – міжнародная эканамічная арганізацыя, надзеленая функцыямі, звязанымі з фармаваннем агульных знешніх мытных граніц дзяржаў-членаў, а гэта – Расія, Беларусь, Казахстан, Кыргыстан, Таджыкістан, Узбекістан, выпрацоўкай адзінай знешнепалітычнай палітыкі, тарыфаў, цэн і іншымі элементамі агульнага рынка. У жніўні 2006 г. на нарадзе ЕўрАзЭС Беларусь, Расія, Казахстан стварылі Мытны саюз.

Сярод вынікаў пяцігодкі за 2000-2005 гг. значыліся павышэнне сярэднемесячнай заработнай платы з 70 да 261 $, пенсій больш чым у тры разы – да 107 $, пакупальніцкай здольнасці беларускіх грамадзян. Доля выдаткаў на прадукты харчавання ў агульным аб'ёме выдаткаў сям'і знізілася за 5 гадоў з 60 да 45 %. Імкліва расла колькасць абанентаў мабільнай сувязі.

Для забеспячэння роўнасці ўсіх форм уласнасці і гаспадарання ствараліся спрыяльныя ўмовы для развіцця малога і сярэдняга бізнесу, прываблівання замежных інвестыцый, што пакуль што мала адлюстравалася на сітуацыі – па ранейшаму галоўнае месца адводзіцца дзяржаўнаму сектару эканомікі (гл. дыяграму 1).

Дыяграма 1. ***Размеркаванне колькасці працуючага насельніцтва РБ па формам уласнасці***



Каб абараніць правы беларускіх і замежных інвестараў ад празмернага ўмяшальніцтва дзяржаўных органаў, у снежні 2007 г. быў спрошчаны парадак дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі суб'ектаў гаспадарання; у сакавіку 2008 г. – адменена асобнае права дзяржавы на ўдзел у кіраванні гаспадарчымі аб'яднаннямі, так званай "залатой акцыі".

У мэтах стымулявання эканамічнага развіцця сельскіх населеных пунктаў, вызвалення ад падаткаабкладання інвестыцый, неабходных для мадэрнізацыі вытворчасці ў снежні 2007 г. быў выдадзены Дэкрэт "Аб некаторых пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сельскіх населеных пунктаў", згодна з якім на працягу 2008-2012 гг. адбываецца вызваленне прадпрымальнікаў сяла ад выплаты падаткаў на прыбытак і нерухомасць, зніжаецца плата на атрыманне ліцэнзій, банкі даюць крэдыты ў памеры да 20 000 еўра. Аналагічны падыход быў прыменены і ў Дэкрэце ад 30 студзеня 2008 г., па якому прадастаўляліся льготы і асобыя ўмовы для работы ў малых (да 50 тысяч насельніцтва) гарадах.

У снежні 2007 г. Прэзідэнт падпісаў Указ "Аб вынятку і прадастаўленні зямельных участкаў", які значна спрасціў існуючую працэдуру: дэлегіраваў адпаведныя паўнамоцтвы мясцовым органам выканаўчай улады, значна знізіў інвестыцыйныя рызыкі.

З мэтай далейшай лібералізацыі знешняга гандлю прадоўжылася работа па ўніфікацыі ставак мытных пошлін з Расійскай Федэрацыяй: вызвалены ад абкладання пошлінамі тавары, якія ўвозяцца рэзідэнтамі Парка высокіх тэхналогій, пашырыліся і дзейнічаюць да сакавіка 2015 г. льготы рэзідэнтам свабодных эканамічных зон.

Галоўныя арыенціры развіцця сучаснай беларускай эканомікі ўвасоблены ў такіх праграмных дакументах, як: Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця РБ да 2020 г. (***НСУР-2020***), Канцэпцыя сацыяльна-эканамічнага развіцця РБ да 2015 г., Комплексны прагноз да 2020 г. і іншых.

Такім чынам, эканаміная палітыка Рэспублікі Беларусь стварае ўмовы для вываду насельніцтва на новы інтэлектуальна-інавацыйны шлях развіцця, звязаны з сацыялізацыяй эканомікі. Але ўраду патрабуецца вырашыць шэраг актуальных праблем: павялічыць прэстыж навукі і адукацыі, наладзіць сістэму стымулявання высокакваліфікаванай і якаснай працы, знізіць выдаткі і паменшыць падатковы прэс, умацаваць нацыянальную грашовую адзінку, наладзіць механізм эфектыўнага інвесціравання і цэнаўтварэння, завяршыць стварэнне неабходнай заканадаўча-прававой базы для рэфармавання эканомікі. Рэалізацыя гэтых праграмных задач патрабуе фінансавага аздараўлення эканомікі, яе структурнай перабудовы, развіцця навукаёмістай вытворчасці, рэсурсазберагаючых тэхналогій.

## Літаратура


1. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 ч. / М.П. Касцюк, І.М. Ігнаценка, У.І. Вышынскі [і інш.]. – Мн., 1995. – Ч. 2.

2. Эканамічная гісторыя Беларусі: вучэбны дапаможнік / В.І. Галубовіч, Р.І. Ермашкевіч, Г.П. Бушчык [і інш.]; пад агульн. рэд. В.І. Галубовіча. – Выд. 2-е, дап. і перапрац. – Мн.: Экаперспектыва, 1995.

3. Яскевич, Я.С. Основы идеологии Белорусского государства: вопросы и ответы / Я.С. Яскевич. – Мн.: ТетраСистемс, 2004.

**ЗМЕСТ**

Уступ ........ 5
**Раздзел I. ГАСПАДАРЧАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ПЕРЫЯД ПЕРШАБЫТНААБШЧЫННАГА ЛАДУ**
Што такое "першабытнаабшчынны лад"? ........ 3
Калі з'явіліся першыя людзі на тэрыторыі Беларусі? ........ 4
Храналагічныя рамкі існавання першабытнаабшчыннага ладу на Беларусі ........ 5
Якія змены адбываліся ў абшчынных, роднасных, эканамічных сувязях паміж людзьмі ў час існавання першабытнаабшчыннага ладу на Беларусі? ........ 12
**Раздзел II. ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У ПЕРЫЯД ФЕАДАЛІЗМУ**
Што такое "феадалізм"? ........ 14
На змену якому ладу прыходзіць феадалізм на тэрыторыі Беларусі? ........ 14
Якім шляхам фармуецца феадалізм на беларускіх землях? ........ 15
Якія храналагічныя рамкі перыяда існавання феадалізму на тэрыторыі Беларусі? ........ 17
Якімі рысамі характарызуецца феадальны лад? ........ 17
**Раздзел III. БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў ПЕРЫЯД КАПІТАЛІЗМУ: ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ**
Што такое "капіталізм"? ........ 25
Чаму станаўленне капіталістычных адносін на беларускіх землях пачынаецца пазней, чым у Заходняй Еўропе? ........ 25
Калі пачынаецца працэс станаўлення капіталістычных адносін на беларускіх землях? ........ 27
Якім чынам рэалізоўвалася рэформа 1861 г. на Беларусі? ........ 30
У чым заключаюцца асаблівасці развіцця капіталістычных адносін на беларускіх землях? ........ 32
Якім чынам развіваўся капіталізм у сельскай гаспадарцы Беларусі? ........ 33
Якім чынам развіваўся капіталізм у прамысловасці Беларусі? ........ 35
Якім чынам фармаваліся асноўныя класы капіталістычнага грамадства? ........ 38
Якія змены адбываліся ў гаспадарчым развіцці Беларусі ў перыяд манапалістычнага капіталізму? ........ 38
**Раздзел IV. ШЛЯХІ І МЕТАДЫ БУДАЎНІЦТВА ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ГРАМАДСТВА Ў САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ**
***Тэма: Эканоміка Беларусі ў 1918-1945 гг.***
Станаўленне сістэм рэгулюемай эканомікі ў свеце. Прыкметы камандна-адміністрацыйнай сістэмы ........ 41
Палітыка "ваеннага камунізма" і яе вынікі ........ 44
Асаблівасці ажыццяўлення НЭПа ў Беларусі. Стварэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы індустрыяльнага грамадства ........ 47
Індустрыялізацыя ў БССР ........ 52
Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ........ 55
Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў 1919-1939 гг. ........ 58
Эканоміка Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гг. ........ 62
***Тэма: Дасягненні і супярэчнасці савецкай сацыяльна-эканамічнай сістэмы БССР у пасляваенны час***
Асноўныя этапы эканамічнага развіцця капіталістычных краін у 1945-1985 гг. ........ 67
Як развівалася эканоміка краін сацыялістычнай садружнасці? ........ 69
Аднаўленне і развіццё эканомікі БССР у складзе адзінага гаспадарчага комплексу СССР у 1945-1953 гг. ........ 70
Спробы рэфармавання савецкай эканамічнай мадэлі сацыялізму ў другой палове 50-60-я гг. ........ 73
Асноўныя тэндэнцыі індустрыяльнага развіцця БССР ва ўмовах разгортвання НТР 76 (1970-я – перш. палова 1980-х гг.) ........ 76
У чым прычыны паступовага запавольвання тэмпаў эканамічнага росту ў час "брэжнеўскага застою"? ........ 71
**Раздзел V. СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСЬ НА ШЛЯХУ ТРАНСФАРМАЦЫІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН**
Што ўяўляе сабою эканоміка постіндустрыяльнага грамадства? ........ 80
Эканамічнае становішча Беларусі ў 1985-1990 гг. ........ 80
Пераход да рынкавых адносін ва ўмовах суверэннай Рэспублікі Беларусь ........ 82
Рэалізацыя сучаснай беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця. ........ 84

ВУЧЕБНА-МЕТАДЫЧНЫ ДАПАМОЖНІК

Кавалёва Наталля Мікалаеўна
Малыхіна Людміла Юр'еўна

**ВЫВУЧЭННЕ ПРАБЛЕМ ЭКАНАМІЧНАЙ ГІСТОРЫІ Ў КУРСЕ "ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ"**
**Рэкамендавана Саветам універсітэта ў якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка для студэнтаў усіх спецыяльнасцей**

Адказны за выпуск: Кавалёва Н. М.
Рэдактар: Строкач Т.У.
Кампуцерная вёрстка: Кармаш А.Л.
Карэктар: Нікітчык А.В.

ISBN 978-985-493-169-2

Подписано к печати 08.09.2010 г. Формат 60x84 $^1/_{16}$. Бумага «Снегурочка». Гарнитура Times New Roman. Усл. п. л. 5,1. Уч. изд. л. 5,5. Тираж 150 экз. Заказ № 865. Отпечатано на ризографе учреждения образования «Брестский государственный технический университет». 224017, ул. Московская, 267, г. Брест